СА «ЗВЯЗДОЙ» — ПА ЖЫЦЦІ!

ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПАДПІСКА НА III КВАРТАЛ І ІІ ПАЎГОДДЗЕ 2010 г.

Падпіска праз РУП «Белпошта» (кошт у рублях)

Індэкс	месяц	III квартал	паўгоддзе
63850 (індывідуальны)	12400	37200	74400
63145 (інд. для ветэранаў вайны, пенсіянераў)	11600	34800	69600
63858 (ведамасны)	19900	59700	119400
63239 (ведамасны, для ўстаноў міністэрстваў аховы здароўя, адукацыі і культуры)	18000	54000	108000

Заставайцеся з намі!

WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

19 ЧЭРВЕНЯ 2010 г. СУБОТА № 118 (26726)

Кошт 650 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

Работнікам аховы здароўя Рэспублікі Беларусь

Дарагія сябры!

Сёння, аддаючы даніну павагі вучоным-медыкам, урачам-практыкам, малодшаму і сярэдняму медыцынскаму персаналу, правізарам і фармацэўтам, краіна разам з вамі адзначае ваша прафесійнае свята — Дзень медыцынскіх работнікаў.

Здароўе грамадзян — найважнейшы прыярытэт дзяржаўнай палітыкі. У Беларусі распрацоўваюцца і рэалізуюцца дзяржаўныя праграмы па ўкараненні новых метадаў прафілактыкі, дыягностыкі і лячэння. Асвойваецца сучасная тэхніка і высокія медыцынскія тэхналогіі. Дасягненні беларускіх трансплантолагаў выводзяць нашу медыцыну на сусветны ўзровень у гэтай сферы.

Найважнейшыя прынцыпы айчыннай аховы здароўя: гуманізм, даступнасць урачэбнай дапамогі, павышэнне якасці медыцынскага абслугоўвання, прызнаныя далёка за межамі Рэспублікі Беларусь, будуць і надалей падтрымлівацца і развівацца дзяржавай.

Прыміце маю шчырую падзяку за ўменне суперажываць і адклікацца на чужы боль, за вашу працавітасць і самаадданасць. За тое, што дапамагаеце захоўваць самае дарагое для чалавека — здароўе, а нярэдка і само жыццё.

Зычу вам дабра, шчасця, дабрабыту. Поспехаў у вашай нялёгкай, але такой неабходнай службе на карысць беларускага народа.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.

БЕЛАРУСЬ ПРАПАНУЕ РАСІІ АДМЯНІЦЬ ПОШЛІНЫ НА НАФТАПРАДУКТЫ Ў 2010 ГОДЗЕ, А НА НАФТУ — З 1 СТУДЗЕНЯ 2011 ГОДА

Аб гэтым заявіў учора журналістам Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падчас рабочай паездкі ў Магілёўскую вобласць.

Гаворачы аб выніках нядаўніх перагавораў у Маскве, і ў прыватнасці аб пошлінах на нафту і нафтапрадукты для Беларусі (што з'яўляецца адным з асноўных спрэчных пытанняў у працэсе фарміравання Мытнага саюза. — *Заўвага БЕЛТА*), Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што «пытанне не ў нас». «Вы чулі мае пастаянныя патрабаванні і заявы аб тым, што калі мы ствараем саюз, у тым ліку мытны, мы абавязкова павінны стварыць аднолькавыя ўмовы для ўсіх яго ўдзельнікаў. Гэта асноўны прынцып. Калі няма гэтай роўнасці, то пра які саюз можна весці размову?» — адзначыў Прэзідэнт. Больш таго, дадаў ён, Мытны саюз складаецца з трох членаў, але адносіны Расіі па адным і тым жа пытанні да Беларусі і Казахстана часам адрозніваюцца. «Дапусцім, па пошлінах на нафту. Там — бяспошлінная нафта, а тут уводзіцца пошліна», — прывёў прыклад кіраўнік дзяржавы.

Паводле яго слоў, усе гэтыя пытанні былі абмеркаваны з кіраўніцтвам Расіі. У сваю чаргу прэзідэнт Расіі запытаў, якія Беларусь можа ўнесці прапановы. «Я ўнёс гэтыя прапановы і магу іх цяпер агучыць», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік беларускай дзяржавы перакананы, што для таго, каб падысці да Мытнага саюза, вядома, трэба адмяняць мытныя пошліны. «Але я сказаў, добра, давайце з 1 студзеня будучага года адменім усе пошліны, а цяпер як крок добрай волі здымаем мытныя бар'еры, мытныя пошліны на нафтапрадукты. На нафтапрадукты здымаем цяпер, а мы пацерпім ужо да пачатку будучага года наконт пошлінаў на нафту», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

«Але з 1 студзеня будучага года гэтыя пошліны павінны быць зняты», — падкрэсліў ён. У такім выпадку, дадаў Прэзідэнт, «мы, не чакаючы 1 студзеня, падпісваем усе дакументы, якія перш за ўсё ў інтарэсах Расіі».

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ўпэўнены ў нармальных адносінах з Польшчай пры перамозе любога з кандыдатаў у прэзідэнты на выбарах, якія пройдуць 20 чэрвеня.

«Нам усё роўна, хто там будзе прэзідэнтам. Лічу, усе кандыдаты — людзі даволі разумныя. І яны, як і я, разумеюць, што суседзі — ад Бога. І хто б там ні стаў прэзідэнтам, яны вымушаны будуць выбудоўваць з Беларуссю нармальныя адносіны», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Паводле слоў беларускага лідара, польскія палітыкі разумеюць, што Беларусь для іх — вельмі важны рэгіён і ў плане двухбаковых гандлёва-эканамічных адносінаў, і ў плане адносінаў з Расіяй. «Адсюль выбудоўваюцца эканамічныя сувязі з Усходам, польскі бізнэс гэта разумее», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

«Таму, хто б ні прыйшоў да ўлады ў Польшчы, яны будуць разумець, што з беларусамі не трэба змагацца. З беларусамі трэба сябраваць і ад гэтага атрымліваць адпаведныя выгады», — сказаў на заканчэнне Прэзідэнт.

Замежныя інвестары павінны забяспечваць максімальную глыбіню перапрацоўкі малака. Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, наведваючы СТАА «Юнімілк Шклоў».

Звяртаючыся да аперацыйнага дырэктара ААТ «Кампанія Юнімілк» (Расія) Міхаіла Галуева, Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што неабходна арыентавацца ў першую чаргу на глыбіню перапрацоўкі. «Хачу, каб вы выраблялі ўвесь спектр прадукцыі», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Паводле слоў кіраўніка дзяржавы, «вывозіць малако ў пачках — гэта добра, але гэта не тое, што нам патрэбна». «Калі будзеце працаваць, як у сябе дома, і дбаць аб краіне, то атрымаеце самую поўную падтрымку і будзеце працаваць у такіх аб'ёмах, як захочаце», — сказаў Прэзідэнт Беларусі Міхаілу Галуеву.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што кампанія «Юнімілк Шклоў» з'яўляецца своеасаблівым эксперыментальным праектам. «Масава мы не пойдзем па шляху прыцягнення замежных інвестараў у перапрацоўку па зразумелых прычынах: у нас і сваіх прадпрыемстваў хапае», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

СТАР. 2

20 чэрвеня — Дзень медыцынскага работніка

«ДА НАС ПРЫХОДЗЯЦЬ ЛЮДЗІ НА МЫЛІЦАХ, А СЫХОДЗЯЦЬ УЖО БЕЗ ІХ!»

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Сёстры-гаспадыні Святлана ЛІШЫК і Ала БАЯРЭВІЧ разам са старшай медсястрой Людмілай МЕЛЬНІКАВАЙ сёння не ў белых халатах. Для іх гэта трохі нязвыкла, бо з года ў год сваю штодзённую працу яны распачынаюць якраз з іх. Але сёння — выключэнне. Сёння тут двайное свята — Дзень медыцынскага работніка супаў з 35-годдзем Мінскай абласной клінічнай бальніцы. На свяце кіраўніцтва бальніцы ўручала прэмію «Медыцынскі Алімп-2010», намінантамі якой і сталі Людміла, Ала і Святлана.

— Бачым, як да нас прыходзяць людзі на мыліцах, а сыходзяць ужо без іх — здаровыя, з усмешкай, — прызнаецца **старшая медсястра аддзялення хірургіі сасудаў Людміла Мельнікава.**

— Радуе, што ў медыцыну ідуць людзі з добрай душой, адкрытыя. Яны заўсёды падтрымаюць у цяжкую хвіліну, абыякавых тут няма, — дадае **сястра-гаспадыня аддзялення нефралогіі Ала Баярэвіч.**

СТАР. 5

«ДЫ НУ ІХ, УСЕ ГЭТЫЯ ЕГІПТЫ І ТУРЦЫІ...»

ВЁСКА ёсць вёска. Усе тут навідавоку. І чуткі (хто жыў, той ведае) з аднаго двара ў другі разносяцца імгненна. Вось і сям'я Давыдзюк, якая на пачатку лета купіла дамок у Наўгародах, не засталася незаўважанай. Слаба сказана, выклікала павышаную цікавасць у мясцовых жыхароў. «Пяць ці шэсць дзетак, усе, як адзін, на веласіпедах, і з імі мужчына з доўгімі валасамі, кажуць, бацюшка?.. Быццам бы з Расіі прыехалі. А як надоўга, не ведаю?». Журналісцкая цікаўнасць не давала спакою, і я ў той жа вечар накіравалася да загадкавых навасёлаў.

«Забраў з Беларусі самае лепшае»

Калі я падышла да дома, гаспадар сямейства, ці капітан каманды, як Георгій жартам сябе называе, майстраваў апошнюю вуду, тры ўжо стаялі побач.

— Збіраемся на ставок схадзіць. Дзеці ні разу на рыбе не былі. А есці любяць. Хачу паказаць, як «лёгка» яна дастаецца.

Чатыры жэўжыкі ў гэты час круціліся вакол таты.

— Знаёмцеся, гэта мае байцы: Павел, Васіль і Мікалай — хакеісты, Ваню, як падрасце, таксама на вароты паставім *(усміхаецца)*.

«Не так даўно і наша знаёмая, чалавек дастаткова заможны, узяла пуцёўку ў лепельскі санаторый. Вярнулася дадому задаволеная. Кажа: «Ды ну іх, усе гэтыя Егіпты і Турцыі, толькі ў Беларусі буду адпачываць».

— А я з вамі знаёміцца прыйшла. Журналістка я, са «Звязды» — гэта...

— Ведаю «Звязду» *(усміхаецца)*. Час ад часу чытаю беларускія газеты, і мову беларускую спакойна разумею. А знаёміцца да нас ужо прыходзілі. Мясцовыя. Пыталіся, ці з духоўных я. Калі сказаў, што не, за цыгана прынялі *(смяецца)*.

— Знешнасць у вас не тыповая, вось і строяць людзі здагадкі. Прынамсі я, калі б дзе-небудзь вас убачыла, таксама за святара альбо за кінаакцёра прыняла б.

— Я ў свой час заканчваў Піцерскі тэатральны інстытут. Была магчымасць там працаваць застацца. Але я папрасіў, каб мяне размеркавалі ў Беларусь. Чатыры гады адпрацаваў у Гродзенскім тэатры. Менавіта там, у тэатры, і жонку сваю Іну сустрэў, яна беларуска, з Івана-ва родам. Праз чатыры гады вярнуўся ў Расію. Пры гэтым забраў з Беларусі самае лепшае (усміхаецца). Цяпер у Піцеры спяваю песні і займаюся арганізацыяй святаў. Будзеце замуж выходзіць, звяртайцеся. Спектаклі часам стаўлю, музыку да іх пішу.

«Тат, мы ўжо ў Беларусі?»

— Георгій, а што больш за ўсё ў Беларусі падабаецца?

— Людзі, безумоўна. Беларусы — самы добразычлівы, самы гасцінны народ. У гэтым я перакананы на 100 працэнтаў, і жонка мая таксама. Да таго, як набыць тут домік, мы летам адпачывалі на правах гасцей у сябра майго пляменніка. Ён жыве тут непадалёк, у Чэрасах. Дык што б вы думалі, зусім незнаёмыя людзі прыносілі дзецям сушаную рыбу, дапамагалі з дрывамі. На пытанне, як разлічыцца, толькі рукой махалі: «Ды якое там разлічыцца. Нічога не трэба». І тут, у Наўгародах, нас на пару тыдняў, пакуль домік, які мы набылі, не вызваліўся, мясцовая сям'я прытуліла ў сваёй хаце. Лазню палілі, і нас запрасілі памыцца.

СТАР. 2

Завочная «прамая лінія»

ХІРУРГІЯ ТВАРУ

На пытанні, звязаныя з пашкоджаннем мяккіх тканак і касцей твару, рэканструктыўна-пластычнай хірургіяй твару, паталогіямі сківічна-тварнай вобласці (прыдатачных пазух носа (гаймарыты), слінных залоз, нерваў, скроневага ніжнесківічнага сустава, дабраякасных пухлін і пухлінападобных захворванняў) гатовы адказаць **дэкан стаматалагічнага факультэта, прафесар кафедры сківічна-тварнай хірургіі Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта, доктар медыцынскіх навук Аляксандр Сяргеевіч ЛАСТАЎКА.**

Пакідайце, калі ласка, пытанні да 25 чэрвеня па рэдакцыйным нумары: 8 (017) 287 18 29. Адказы будуць надрукаваныя на старонках нашага выдання.

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

ВЫКЛАДЧЫКІ «АЦЭНЬВАЛІ» ЭКЗАМЕН У $60

У Мінску затрыманыя двое выкладчыкаў адной кафедры аднаго са сталічных універсітэтаў.

Як паведаміў карэспандэнту «Звязды» старшы памочнік пракурора Мінска Сяргей Балашаў, у дачыненні да гэтых падазроных заведзена дзве крымінальны справы па артыкуле 430 ч.1 КК — атрыманне хабару. Адзін з выкладчыкаў быў затрыманы з доказамі віны пры атрыманні хабару ў 2100 долараў ЗША. Гэтымі грашыма яго «ўзнагародзілі» студэнты за станоўчае вырашэнне пытання аб здачы экзамену. Другога выкладчыка той жа кафедры таксама затрымалі з доказамі віны — з «ганарарам» ад удзячных студэнтаў у 420 долараў. Паводле папярэдніх звестак, у падазроных была свая «такса» за здачу аднаго экзамену, якая складала 60 долараў ЗША.

Ігар ГРЫШЫН.

СХЕМА НЕ СПРАЦАВАЛА

Уступіў у законную сілу прыгавор па справе адказных асобаў ААТ «Гомельскі домабудаўнічы камбінат» і ССУ—118 РУП «Трэст № 26 Жэлезабетонмантаж».

Былы генеральны дырэктар Гомельскага домабудаўнічага камбіната Анатоль Маслаў разам з былым начальнікам ССУ—118 РУП «Трэст № 26 Жэлезабетонмантаж» Аляксандрам Драмавым і былым начальнікам вытворча-тэхнічнага аддзела гэтага ж прадпрыемства Станіславам Сандамірскім зрабілі спробу выкрасці грашовыя сродкі домабудаўнічага камбіната. Для гэтага была распрацавана пэўная схема.

Як паведамілі ў прэс-групе ўпраўлення КДБ па Гомельскай вобласці, у ходзе следства ўстаноўлена, што ДБК заключыў з будаўнічым упраўленнем дагавор на выкананне дэмантажных работ. А кіраўнік будаўнічага ўпраўлення з падначаленым заключылі дагавор субпадраду з камерцыйнай фірмай на выкананне часткі гэтых работ. На самой справе дагавор быў фіктыўным, бо фірма ніякіх работ не выконвала. Ад камерцыйнай структуры патрабавалася толькі атрымаць грошы на свой рахунак, перавесці ў наяўныя і перадаць іх аўтарам фінансавай махінацыі. У выніку адказныя асобы мелі намер атрымаць каля 60 мільёнаў рублёў. Аднак былі затрыманыя супрацоўнікамі УКДБ з доказамі на злачынства, кожны асобна пры атрыманні сваёй долі. Суд іх «долі» размеркаваў наступным чынам: Анатоль Маслаў атрымаў 4 з паловай гады з адтэрміноўкай на 3 гады і канфіскацыяй паловы маёмасці. Аляксандр Драмаў будзе сядзець 6 гадоў у выпраўленчай калоніі ўзмоцненага рэжыму. На год меншы тэрмін прызначаны для Станіслава Сандамірскага.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

Навіны Беларусі і замежжа ў рэжыме on-line на сайце «Звязды» — www.zviazda.by

Сталічнае жыллё

У ПРОДАЖЫ З'ЯВІЛІСЯ АДНАПАКАЁЎКІ ЗА 37—40 ТЫСЯЧ USD

ЯК АДЗНАЧАЮЦЬ эксперты другаснага рынку жыллёвай нерухомасці сталіцы, у маі і першай палове чэрвеня ў Мінску працягваецца невялікае зніжэнне цэнаў на «немаладыя» кватэры. За мінулы месяц сярэдні кошт такіх кватэр паменшыўся прыкладна на 2 працэнты. Разам з тым, паводле меркаванняў старшыні савета Беларускай асацыяцыі «Нерухомасць» Мікалая ПРАСТАЛУПАВА, у першы месяц лета другасны рынак сталічных кватэр пачаў крыху актывізавацца.

Ажыўленне рынку адбываецца пад уздзеяннем двух фактараў: менавіта летам ужо значная колькасць прадаўцоў (каля 10—15 працэнтаў) пачалі выстаўляць кватэры на продаж па цэнах, крыху ніжэйшых за сярэднярынкавыя. З іншага боку, патэнцыйныя пакупнікі разумеюць, што самыя танныя кватэры лягчэй набыць традыцыйна толькі летам, калі існуюць мінімальныя цэннікі.

Сёння на другасным рынку ажыццяўляюцца хуткія здзелкі па аднапакаёвых кватэрах, калі апошнія каштуюць да 40 тысяч долараў, а таксама па двухпакаёвых кватэрах коштам каля 50 тысяч долараў плюс-мінус 2—3 тысячы. Мікалай Прасталупаў адзначае, што аблюстраванне ў статыстыцы здзелак куплі-продажу менавіта танных кватэр стварае ілюзію агульнага патаннення сталічных кватэр. Аднак і сёння каля 80 працэнтаў прадаўцоў упарта трымаюць зімовы цэннік, а пры рэальных здзелках на істотныя зніжкі згаджаюцца вельмі неахвотна.

Згодна са статыстыкай інфармацыйнага каталога сталічнага партала жыллёвай нерухомасці, сярэдні кошт квадратнага метра агульнай плошчы аднапакаёвых кватэр складае сёння 1442 долары, двухпакаёвых кватэр — 1424, а трохпакаёвых — 1370 долараў. Тэмп патаннення квадратнага метра сталічных кватэр складае каля 5—10 долараў за тыдзень.

На другасным рынку сталіцы цяпер прапаноўваецца на продаж каля 40 аднапакаёвых кватэр коштам ад 37 да 40 тысяч долараў. Галоўным чынам гэта маленькія па плошчы «хрушчоўкі» ў старых пяціпавярховых дамах па вуліцах Брылеўская, Карпава, Лынькова, Крупскай, Матусевіча, а таксама ў Шабанах і ў Заводскім раёне. Мікалай Прасталупаў упэўнены, што менавіта такое жыллё гэтым летам будзе выкупляцца ў першую чаргу.

У апошнія два тыдні на другасным рынку з'явіліся невялікія па плошчы двухпакаёвыя кватэры коштам ад 45 да 50 тысяч долараў. Эксперты рынку нерухомасці сталіцы прагназуюць, што летам усё часцей будуць з'яўляцца ў продажы вельмі танныя кватэры, якія і стануць карыстацца ўпэўненым попытам. Да верасня такія кватэры будуць амаль цалкам павымываныя з другаснага рынку Мінска.

Увосень традыцыйна рынак актывізуецца за кошт тых пакупнікоў, хто хоча набыць адносна таннае, але ўжо больш-менш якаснае жыллё. Попыт і прапанова пачнуць зближацца, пасля чаго можа адбыцца стабілізацыя цэнаў на другасное жыллё ці нават часовае падаражанне кватэр.

Сяргей КУРКАЧ.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ВР ЗАПЛАЦІЦЬ 20 МІЛЬЯРДАЎ

Невядомая жанчына спыніла выступленне ў кангрэсе ЗША кіраўніка брытанскай кампаніі British Petroleum Тоні Хэйуорда.

Жанчына спыніла Хэйуорда выкрыкамі ў той момант, калі ён пачаў сваё выступленне, прысвечанае аварыі на нафтавай платформе ў Мексіканскім заліве. Пры гэтым на руках і шчоках невядомай былі плямы рэчыва, падобнага на нафту. Супрацоўнікі службы бяспекі кангрэса вывелі жанчыну з залы. Тоні Хэйуорд быў запрошаны на слуханні ў Камітэт Палаты прадстаўнікоў па энергетыцы і камерцыі для таго, каб даць тлумачэнні з нагоды акалічнасцяў выбуху на нафтаздабывальнай платформе, у выніку якога загінула 11 нафтавікоў і пачаўся беспрэцэдэнтны па маштабах разліў нафты па акваторыі Мексіканскага заліва. Як стала вядома камітэту, кіраўнікі ВР эканомілі на бяспецы вытворчых работ. Тым часам прэзідэнт ЗША Барак Абама пацвердзіў, што кампанія ВР выплаціць 20 мільярдаў долараў на кампенсацыі людзям і кампаніям, што пацярпелі ад уцечкі нафты ў Мексіканскім заліве.

У КАЛУМБІІ ЎЗАРВАЛАСЯ ШАХТА

На паўночным захадзе Калумбіі выбух метану на шахце загубіў не менш за 16 гарнякоў, пад зямлёй застаецца каля 70 чалавек.

Выратавальнікам атрымалася выняць з-пад зямлі 90 чалавек. Выбух метану быў настолькі магутным, што пашкодзіў металічныя канструкцыі на ўваходзе ў шахту і адміністрацыйны будынак. Губернатар дэпартамента Луіс Рамас лічыць, што «верагоднасць выратавання шахцёраў, заблакаваных у двухкіламетровым тунэлі, невялікая», і колькасць ахвяраў можа ўзрасці.

ЖУДАСНАЯ ЗНАХОДКА Ў АЭРАПОРЦЕ

У аэрапорце сталіцы Арканзаса Літл-Рок знайшлі кантэйнер, у якім знаходзілася каля 60 чалавечых галоў. Службоўцы аэрапорта звярнулі ўвагу на кантэйнер з-за адсутнасці на ім патрэбных налепак для перасылання.

Супрацоўнікі службы бяспекі аэрапорта і следчыя органы павінны будуць высветліць, ці з'яўляўся груз чалавечых галоў нелегальным, ці яго транспартаванне адбывалася ў рамках замовы матэрыялаў для медыцынскага даследавання. Па словах мясцовага каранера, у Арканзасе неаднаразова фіксаваліся выпадкі ценявога гандлю часткамі чалавечых целаў. У той жа час, па заяве прадстаўнікоў тэхаскай кампаніі Medtronic, якой прызначаўся груз, перасыланне падобных грузаў з'яўляецца звычайнай практыкай.

НАСЕЛЬНІЦТВА УКРАІНЫ СКАРАЦІЛАСЯ

Насельніцтва Украіны ў 2010 годзе скарацілася да 45 мільёнаў чалавек. Паводле гэтых звестак, толькі ў мінулым красавіку жыхароў Украіны стала менш на 17 тысяч чалавек.

31 мільён чалавек жыве ва Украіне ў гарадах, сельскае насельніцтва складае 14 мільёнаў чалавек. Па прагнозах ААН, калі дынаміка змяншэння насельніцтва захаваецца, то да 2030 года ўкраінцаў будзе 39 мільёнаў. Раней у дэмаграфічнай справаздачы ААН паведамляла, што ва Украіне самы нізкі ў свеце натуральны прырост насельніцтва. У 1992-м — першым годзе незалежнасці — колькасць насельніцтва Украіны складала больш за 53 мільёны чалавек.

Здаровяе

Хлопчык на поручнях балкона...

У Оршы выратавалі 5-гадовага хлопчыка, які стаяў на поручнях і мог упасці з трэцяга паверха.

Як паведаміла «Звяздзе» прэс-сакратар Віцебскага абласнога ўпраўлення па надзвычайных сітуацыях Марына Фандо, раніцай — а шостай гадзіне — па тэлефоне «101» паведамілі пра хлопчыка на поручнях. Выратавальнікі аператыўна выехалі на ўказаны адрас. Убачылі хлопчыка, які стаяў на поручнях і трымаўся рукамі за вяроўкі для сушкі бялізны. Пры дапамозе спецыяльнай лесвіцы выратавальнікі падняліся наверх і знялі хлопчыка з поручняў. Дзверы на балкон, дарэчы, былі адчыненымі. У кватэры нікога не было. Высветлілася, што бабуля хлопчыка знаходзілася ў сяброўкі ў суседнім доме, а ягоная мама паехала ў госці ў Кіеў да свайго знаёмага. Хлопчык прачнуўся і выйшаў на балкон, які, па словах бабулі, летам не зачыняецца.

РАСПАЛЬВАЎ ПЕЧКУ... БЕНЗІНАМ

Моцныя апёкі атрымаў жыхар Сненскага раёна з вёскі Янава, які распальваў печ у доме бензінам.

Як паведаміла «Звяздзе» прэс-сакратар Віцебскага абласнога ўпраўлення па надзвычайных сітуацыях Марына Фандо, 50-гадовы мужчына атрымаў апёкі другой і трэцяй ступені, яго шпіталізавалі. Ахвяра ўласнай бяспечнасці працуе вартаўніком.

А ў вёсцы Махірава Полацкага раёна ў дачным доме садаводчага таварыства на пажары загінуў 38-гадовы дачнік. Мяркуецца, што ён неасцярожна курыў.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ФУТБОЛ З СОНЦАМ

у самы доўгі дзень года

МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ

ИНФОРМИРУЕТ:

в извещении о проведении 29 июня 2010 года 100-го открытого аукциона по продаже права заключения договоров аренды (сроком на 5 лет) зданий, сооружений и помещений коммунальной собственности г. Минска, опубликованном в газете «Звязда» 18.06.2010, **строки**

Филиал «Автобусный парк № 6», тел. 341 71 55, 341 71 66			
30	Ул. Илимская, 6, площадь для размещения торгового аппарата по продаже горячих напитков.	2,0	420

ИСКЛЮЧИТЬ;

номера лотов с 31 по 67 считать номерами с 30 по 66 соответственно.

Вниманию акционеров ОАО «Белгорхимпром»!

Внеочередное общее собрание состоится 28 июня 2010 года в 11.00 по адресу: г. Минск, пр. Машерова, 17 в актовом зале.

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. О заключении крупной сделки Общества.
2. Об одобрении крупных сделок Общества.
3. О внесении изменений и дополнений в устав Общества.

Регистрация акционеров в день проведения собрания с 9.00 до 10.30 по адресу: г. Минск, пр. Машерова, 17 в актовом зале (3 этаж).

УНП 600024712.

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 19.06.2010 г. (для б/н разлікаў)

▼1 долар ЗША	3 017,00	1 чэшская крона	145,52
▲1 еўра	3 740,48	1 польскі злоты	919,09
1 латвійскі лат	5 282,79	▲1 расійскі рубель	97,69
1 літоўскі літ	1 083,32	1 украінская грыўня	381,42

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ

USD	30,8840
10 UAH	39,0442
1000 BYR	10,2231
EUR	38,2560

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Твае правы

У ІНТЭРНАТЫ БЕЗ ЖАДАННЯ НЕ «ЗДАЮЦЬ»

(Заканчэнне. Пачатак у нумары за 18 чэрвеня.)

Працаздольныя дзеці плацяць спаўна

Асобная тэма — памер аплаты. Так, заканадаўства вызначае: пры змяшчэнні ў інтэрнат псіханеўралагічнага профілю інвалід атрымлівае «на рукі» 10 працэнтаў сваёй пенсіі. Прычым, нягледзячы на наяўнасць ці адсутнасць працаздольных дзяцей, ніякіх «даплат» тут не будзе.

Крыху іншае правіла ў дамах-інтэрнатах агульнага тыпу. З улікам зноў жа поўнага дзяржаўнага забеспячэння тут пенсіянеры ці інваліды таксама атрымліваюць «на рукі» 10 працэнтаў пенсіі. Аднак у выпадку, калі жыхары дома-інтэрната маюць працаздольных дзяцей і іншых сваякоў, што абавязаныя ўтрымліваць іх па законе, гэтым справа не абмяжоўваецца.

— Працаздольныя дзеці павінны аплаціць сабекошт утрымання пенсіянераў ці інвалідаў у стацыянарных установах агульнага тыпу цалкам — на падставе спецыяльнага дагавору, — адзначае Наталля Козак. — Дарэчы, на сёння поўны сярэдні кошт пражывання ў інтэрнатах сталіцы ў залежнасці ад сезона вагаецца ў межах 600-620 тысяч рублёў.

Як патрапіць у Ждановічы?

Пры размяшчэнні ў стацыянарныя ўстановы дзейнічае так званы тэрытарыяльны прынцып. Напрыклад, жыхары сталіцы афармляюцца на пражыванне ў Мінску, а жыхары Гродзеншчыны — у сваёй вобласці. Між тым, не сакрэт: умовы ў стацыянарных установах могуць быць рознымі, і з гэтага пункту гледжання ў пенсіянераў і інвалідаў без псіхічных захворванняў традыцыйна карыстаецца папулярнасцю Рэспубліканскі інтэрнат ветэранаў вайны і працы ў Ждановічах. Хто туды можа патрапіць?

— Патрапіць у Рэспубліканскі інтэрнат ветэранаў вайны і працы пад Мінскам могуць пенсіянеры і інваліды, якія маюць асаблівыя заслугі, — адзначае Наталля Козак. — У прыватнасці, гаворка пра Герояў Савецкага Саюза і Герояў Беларусі, ветэранаў вайны, былых вязняў фашысцкіх канцлагераў, рэабілітаваных ахвяраў палітычных рэпрэсій у 1920—1980 гадах, лаўрэатаў дзяржаўных прэмій, асобаў, якія маюць пенсіі за асаблівыя заслугі, спартсменаў-пераможцаў і прызёраў Алімпійскіх гульняў, чэмпіёнаў свету і Еўропы і г.д.

Чарга пачне змяншацца

Ці не самы няпросты момант — дэфіцыт месцаў. Прычым перш-наперш гэта датычыцца сталіцы. У буйнейшым горадзе краіны не ўзнікае пытанняў з размяшчэннем ветэранаў і інвалідаў у дамы-інтэрнаты «агульнага» тыпу. А вось у інтэрнаты псіханеўралагічныя ёсць чарга.

— Нядаўна ў сталіцы ўжо адчынены новы, чацвёрты, інтэрнат псіханеўралагічнага профілю на 135 месцаў, плануецца пашырэнне падобных інтэрнатаў №1 і №3, — кажа Наталля Козак. — Словам, паступова чарга будзе змяншацца.

Шанцы на вяртанне ёсць

І, нарэшце, апошняе: ці можа чалавек, які пераехаў у дом-інтэрнат, праз пэўны час пакінуць гэтую стацыянарную ўстанову?

— Такая магчымасць ёсць, — адзначае Наталля Козак. — Скажам, над інвалідам з псіханеўралагічнымі захворваннямі могуць афарміць апеку сваякі — і забраць гэтага чалавека дадому. Што ж да пенсіянера ці інваліда ў інтэрнатах агульнага тыпу, то тут галоўнае — жаданне самога чалавека і наяўнасць у яго жылплошчы. Дарэчы, трэба падкрэсліць: за пенсіянерамі і інвалідамі, якія трапляюць у інтэрнат, прыватныя дамы і кватэры захоўваюцца пажыццёва.

Сяргей ГРЫБ.

БЕЛАРУСЬ ПРАПАНУЕ РАСІІ АДМЯНІЦЬ ПОШЛІНЫ НА НАФТАПРАДУКТЫ Ў 2010 ГОДЗЕ, А НА НАФТУ — З 1 СТУДЗЕНЯ 2011 ГОДА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Прэзідэнт Беларусі канстатаваў, што з перапрацоўкай праблем у Беларусі няма, тым больш што запатрабаванасць малочнай і сельскагаспадарчай прадукцыі ў цэлым на сусветным рынку толькі ўзрастае.

Сумесныя прадпрыемства «Юнімілк Шклоў» было створана 27 жніўня 2009 года. Долі ў статутным фондзе СТАА ў адпаведнасці з устаноўчымі дакументамі складаюць: ААТ «Кампанія Юнімілк» — 51 працэнт, ААТ «Шклоўскі масларобны завод» — 49 працэнтаў. Кампанія «Юнімілк» актыўна супрацоўнічае з беларускімі вытворцамі і закупляе значныя аб'ёмы сухога малака, масла, згушчанага малака. Акрамя таго, кампанія сумесна з Рагачоўскім і Глыбоцкім малочна-кансервавымі камбінатамі выпрабляе згушчанае малако для рынкаў Расіі, Украіны і Казахстана.

У адпаведнасці з канцэпцыяй развіцця ААТ «Шклоўскі масларобны завод» экспартная магутнасць прадпрыемства ў гэты час складае 150 тон за суткі, а да жніўня 2010 года яна павінна дасягнуць 200 тон за суткі, або больш як 70 тыс. тон за год. Плануемая экспартная выручка пасля рэалізацыі першага этапу перасягне $30 млн у год.

Цяпер ідзе распрацоўка другога этапу коштам больш як $15 млн. Плануецца, што ў выніку рэалізацыі другога этапу да кастрычніка 2011 года экспартны патэнцыял праекта кампаніі «Юнімілк» у Шклове вырасце да 450—500 тон за суткі, або 160—170 тыс. тон за год з экспартнай выручкай $70—80 млн.

Сярэдняя зарплата ў Беларусі павінна быць на ўзроўні $500 да часу правядзення Усебеларускага народнага сходу.

«Да з'езда мы павінны падысці з узроўнем сярэдняй зарплаты $500, — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. — Мы будзем да гэтага ўсяляк імкнуцца. Калі, вядома, нас зноў не накрые якой-небудзь няшчаснай «хваляй», што прыйдзе з Атлантыкі або Ціхага акіяна». Беларускі лідар дадаў, што «ўвогуле ўсе разлікі падрыхтаваны і мы, як кажуць, укладваемся ў графік». Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што нядаўна ўрад Беларусі пачаў павышаць заработную плату па краіне, пачынаючы з бюджэтнікаў. «Гэты добры пачатак павышэння зарплат не апошні. Мы адыходзім ад наступстваў сусветнага крызісу, які і нас зачапіў», — сказаў ён.

Разам з тым Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што магіляўчане могуць прадэманстраваць на сваім прыкладзе, як нават у сельскай гаспадарцы зарабіць $500. Гаворачы аб гаспадарцы ААТ «Александрыйскае», якую ён наведаў учора, Прэзідэнт сказаў: «Тут людзі атрымліваюць і $500, і больш. Таму не я павінен адказваць на пытанне, як зарабіць $500, а вы павінны расказваць усёй краіне, як гэта трэба рабіць». Пры гэтым кіраўнік дзяржавы канстатаваў, што «ў цэлым нам трэба яшчэ вельмі шмат працаваць, каб падысці да гэтага ўзроўню па краіне».

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка заклікае вярнуць сітуацыю ў Кыргызстане ў канстытуцыйнае рэчышча. «Трэба не каціць сённяшнюю бочку на Бакіева, а папрасіць яго, вернецца ён туды, з Масквы аддасць або з іншага горада каманды, але ён павінен сёння назначыць рэферэндум, каб той быў легітымным. Або парламент павінен прыняць адстаўку, калі Бакіеў гэтага захоча, і аб'явіць рэферэндум. Той парламент, які разагналі. Вядома, яны (часовы ўрад. — *Заўвага БЕЛТА*) баяцца, што гэты парламент можа не прыняць такое рашэнне. Але гэта іх праблемы. Яны ідуць сёння па абсалютна нелегітымнаму шляху. Гэтым шляхам ісці нельга», — расказаў Аляксандр Лукашэнка аб сваім бачанні магчымых шляхоў выхаду з сітуацыі, якая склалася ў Кыргызстане. Іншым законным шляхам, упэўнены кіраўнік беларускай дзяржавы, сітуацыю вырашыць ніяк не ўдасца. «Лічу, што трэба вяртаць сітуацыю ў канстытуцыйнае рэчышча, як бы цяжка ні было», — сказаў Прэзідэнт Беларусі.

Больш таго, ён выказаў апасенні, што з-за беспарадкаў і сутыкненняў на этнічнай глебе ў Кыргызстан, магчыма, пачынаюць ужо сыходзіцца з усяго свету тэрарысты. «І гэта насцярожвае суседнія краіны: Узбекістан, Казахстан, Таджыкістан, ды і Расіі ад гэтага несалодка», — адзначыў беларускі лідар. «Сітуацыя развіваецца вельмі непрыемна, вельмі небяспечна для гэтага рэгіёну. І вядома, сітуацыю трэба стабілізаваць. Але пачынаць трэба з навядзення законнасці і парадку ў гэтай краіне, каб будучыя ўлады былі легітымныя», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

БЕЛТА.

Абзац

◢ РУП «Белпошта» з 1 ліпеня зніжае тарыфы на перасылку паштовых адпраўленняў, грашовыя пераводы, размяшчэнне і перасылку рэкламных матэрыялаў. Скідкі на міжнародныя электронныя грашовыя пераводы будуць да 50 працэнтаў, на ўнутрырэспубліканскія — да 90 працэнтаў у залежнасці ад сумы, якая перасылаецца.

◢ **Унікальны выпадак з'яўлення на свет шпакоў-альбіносаў зафіксаваны ў Гродне. Пара шпакоў-альбіносаў вылупілася ў шпакоўні каля гродзенскага шматпавярховага дома. Першым у пары шпакоў з'явілася птушаня звычайнай афарбоўкі, якое памацнела ўжо і вылецела з гнязда. Пазней вылупіліся адразу два аднолькавыя беласнежныя шпакі.**

◢ Форвард беларускай зборнай Аляксей Калюжны прызнаны лепшым хакеістам Беларусі 2010 года. Такі вынік традыцыйнага апытання газеты «Прессбол». Другое месца заняў нападаючы нацыянальнай каманды Андрэй Касціцын, а трэцім стаў яшчэ адзін форвард зборнай краіны Аляксей Угараў.

◢ **17 чэрвеня каля 22.00 п'яны кіроўца на «Фальксвагене-Туран» рухаўся з боку вуліцы Янкоўскага па вуліцы Гарэцкага. На перакрыжаванні з вуліцай Рафіева праехаў на чырвонае святло і ўрэзаўся ў «Нісан-Мікра», а затым выехаў на сустрэчную паласу, дзе сутыкнуўся з «Рэно-Кліа». У выніку кіроўца «Нісана», а таксама два дарослыя пасажыры і дзіця атрымалі цяжкія цялесныя пашкоджанні: пераломы, страсенні галаўнога мозгу і г.д. Усе яны былі шпіталізаваныя.**

◢ Раніцай 17 чэрвеня ў інтэрнаце на вуліцы Зялёнай у Беразіно адбыўся пажар у пакоі на другім паверсе. Пажар быў ліквідаваны, але ў будынку было вылікае задымленне, і работнікі МНС эвакуявалі 60 чалавек. Пацярпелых няма. Мяркуемая прычына пажару — кароткае замыканне электраправодкі халадзільніка.

◢ **П'яны кіроўца 17 чэрвеня трапіў у ДТЗ у Заслаўі на легкавым БМВ. Ён урэзаўся ў ліхтар і загінуў на месцы.**

◢ У Шчучынскім раёне 15-гадовы падлетак, не маючы пасведчання, катаўся на матацыкле «Усход» ноччу ў вёсцы Бераставіца. Ён не справіўся з кіраваннем, выехаў за межы праезнай часткі, урэзаўся ў плот і загінуў.

Поўны абзац

◢ Спявак з Ілінойса Роджэр Меніс узяў самую нізкую ноту. Дасягненне спевака афіцыйна зарэгістравана і ўключана ў Кнігу рэкордаў Гінеса. Меніс узяў вельмі нізкае фа-дыез з частатой ваганняў 0,393 герца. Папярэдні рэкорд быў роўны 0,797 герца.

◢ **20-гадовы жыхар Аўстраліі Мірза Зуканавіч, фігурант справы аб нападзе, быў выкліканы на слуханне. У час пасяджэння суда малады чалавек жаваў гумку, а калі да яго звярнуўся суддзя, ён надзьмуў пузыр, які з характэрным гучным гукам лопнуў. У выніку Зуканавіча абвінавацілі ў непавазе да суда і прыгаварылі да месяца турмы.**

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Юрыя Саломіна з 75-годдзем

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў з 75-годдзем народнага артыста СССР Юрыя Саломіна.

«Сыграныя Вамі ролі вызначаюцца тонкім псіхалагізмам, дасканалым веданнем жыцця і чалавечых характараў, асаблівай шчырасцю і выразнасцю, якія ператвараюць кожную з іх у сапраўдны шэдэўр», — адзначаецца ў віншаванні. Кіраўнік дзяржавы пажадаў юбіляру натхнення, новых поспехаў, увасаблення ў жыццё ўсіх планаў і пачынанняў, добрага здароўя і дабрабыту.

Інстытут павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў мытных органаў будзе створаны ў Мінску

Установа адукацыі «Дзяржаўны інстытут павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў мытных органаў Рэспублікі Беларусь» Дзяржаўнага мытнага камітэта будзе створаны ў Мінску. Адпаведны Указ № 310 16 чэрвеня 2010 года падпісаў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Мінск прапануе кітайскаму боку ўдзельнічаць у рэалізацыі праектаў коштам $1 млрд

Аб гэтым заявіў учора прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей Сідорскі на сустрэчы з мэрам Пекіна Го Цзіньлунам, перадае карэспандэнт БЕЛТА.

«Мы ва ўрадзе Беларусі вітаем магчымасць удзелу пекінскіх кампаній у рэалізацыі праектаў у Мінску», — сказаў Сяргей Сідорскі.

Ён нагадаў, што ў час праведзенай у гэтым годзе сустрэчы з намеснікам старшыні КНР Сі Цзіньпінам была дасягнута дамоўленасць, што Беларуссю ў бліжэйшы час будзе прапанаваны кітайскаму боку пералік тэхналагічных праектаў, якія будуць перанесены з улікам вопыту развіцця кітайскай эканомікі ў Беларусь непасрэдна цэлымі прадпрыемствамі, якія маглі б паспяхова функцыянаваць у цэнтры Еўропы. «У ходзе сённяшняй сустрэчы я хацеў бы асобна абмеркаваць магчымасці пераносу шэрагу высокатэхналагічных прадпрыемстваў Кітая на тэрыторыю Беларусі», — падкрэсліў Сяргей Сідорскі.

У прыватнасці, размова ішла аб стварэнні ў Мінску комплексу «Чайна-таўн». «Я думаю, што з вашым удзелам мы маглі б пачаць рэалізацыю гэтага праекта, які ўпрыгожыў бы Мінск, — сказаў прэм'ер-міністр Беларусі.

БУТЭЛЬКА БЕЛАГА ВІНА І ЛЁД — МІНСКАЯ КАЗКА ЭЛТАНА ДЖОНА

ВОСЬ і прычакалі. Сусветна вядомы Элтан Джон едзе ў Мінск. Адзіны канцэрт на постсавецкай прасторы з праграмы «Elton John's Rocket Man Greatest Hits Tour» брытанскі спявак дасць менавіта ў беларускай сталіцы. Праўда, саму сталіцу сэр Элтан паглядзець не паспее — на канцэрт ён прыляціць на ўласным самалёце адразу з Лондана...

ДЖОН І ГРЫМЁРКА

— Перамовы вяліся некалькі месяцаў, — гаворыць **прадзюсар канцэрта Расціслаў КРЫМЕР.** — Менеджары Джона былі прыемна здзіўленыя добрынёй нашых людзей. Ад Мінска яны былі ў захапленні, хоць і чакалі іншага. Таму, безумоўна, пабачыўшы ўзровень, наша запрашэнне пацвердзілі.

— Спявак не патрабуе чагосьці звыш. Яго райдэр просты, — дадае прадзюсар мінскага канцэрта.

«Простымі» Расціслаў Крымер назваў «адмыслова драпіраваную грымёрку ў бэжавай колеравай гаме». Мэбля будзе канкрэтным памераў і без скуры, абавязковым у райдэры значыцца дывановае пакрыццё. З сабой спявак прывязе чорны раяль YAMAHA.

ДЖОН І АХОВА

У беларускую сталіцу Элтан Джон прывязе не толькі чорны раяль. Адмысловыя «хлопцы ў чорным» — ахоўнікі — будуць таксама. Бяспеку спевака будзе забяспечваць яго асабістая група аховы. Дадаткова будзе арганізавана ахова для сцэны і ад фанатаў. Усе пытанні, якія датычаць аховы ад назойлівых фанаў і бяспекі саміх гледачоў,

лягуць на плечы беларускага боку.

ДРАНІКІ ДЛЯ ЭЛТАНА

Забяспечваць харчаванне мацітай зоркі будзе буйная беларуская кампанія, назву якой арганізатары не называюць. У райдэры спевака прапісаныя халодныя закускі і канкрэтныя напіткі (адна бутэлька белага віна, піва для каманды). А яшчэ — шмат скрыняў з лёдам. Як запэўніў журналістаў прадзюсар канцэрта, беларускі кампанія бочкі на Бакіева, а папрасіць яго, вернецца ён туды, з Масквы аддасць або з іншага горада каманды, але ён павінен сёння назначыць рэферэндум, каб той быў легітымным. Або парламент павінен прыняць адстаўку, калі Бакіеў гэтага захоча, і аб'явіць рэферэндум. Той парламент, які разагналі. Вядома, яны (часовы ўрад. — *Заўвага БЕЛТА*) баяцца, што гэты парламент можа не прыняць такое рашэнне. Але гэта іх праблемы. Яны ідуць сёння па абсалютна нелегітымнаму шляху. Гэтым шляхам ісці нельга», — расказаў Аляксандр Лукашэнка аб сваім бачанні магчымых шляхоў выхаду з сітуацыі, якая склалася ў Кыргызстане. Іншым законным шляхам, упэўнены кіраўнік беларускай дзяржавы, сітуацыю вырашыць ніяк не ўдасца. «Лічу, што трэба вяртаць сітуацыю ў канстытуцыйнае рэчышча, як бы цяжка ні было», — сказаў Прэзідэнт Беларусі.

Больш таго, ён выказаў апасенні, што з-за беспарадкаў і сутыкненняў на этнічнай глебе ў Кыргызстан, магчыма, пачынаюць ужо сыходзіцца з усяго свету тэрарысты. «І гэта насцярожвае суседнія краіны: Узбекістан, Казахстан, Таджыкістан, ды і Расіі ад гэтага несалодка», — адзначыў беларускі лідар. «Сітуацыя развіваецца вельмі непрыемна, вельмі небяспечна для гэтага рэгіёну. І вядома, сітуацыю трэба стабілізаваць. Але пачынаць трэба з навядзення законнасці і парадку ў гэтай краіне, каб будучыя ўлады былі легітымныя», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

БЕЛТА.

Доктар адкажа

ЁСЦЬ ПЫТАННІ? ТЭЛЕФАНУЙЦЕ...

На наступным тыдні дзяжурыць на «гарачай» лініі Міністэрства аховы здароўя (222 70 80) плануюць:

21 чэрвеня — дырэктар РНПЦ «Маці і дзіця» Канстанцін Усцінавіч ВІЛЬЧУК.

22 чэрвеня — галоўны ўрач Мінскай абласной дзіцячай клінічнай бальніцы Дзмітрый Уладзіміравіч ЗАЙЦАЎ.

23 чэрвеня — намеснік дырэктара РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі.

24 чэрвеня — начальнік аддзела арганізацыі лекавага забеспячэння Міністэрства аховы здароўя Наталля Уладзіміраўна МАЛАШКА.

25 чэрвеня — галоўны спецыяліст аддзела кадравай палітыкі і ўстаноў адукацыі Міністэрства аховы здароўя Марына Анатольеўна ПЕЧАНКО.

«Гарачая» лінія ўпраўлення аховы здароўя Мінаблвыканкама (017) 220 20 25

21 чэрвеня — загадчык хірургічнага аддзялення Мінскай абласной дзіцячай клінічнай бальніцы Валерый Міхайлавіч ВЕРЫН.

22 чэрвеня — загадчык нефралагічнага аддзялення Мінскай абласной клінічнай бальніцы Сяргей Вітальевіч ПРЫЛУЦКІ.

23 чэрвеня — загадчык аддзялення рэанімацыі і інтэнсіўнай тэрапіі нованароджаных Мінскага абласнога радзільнага дома Сяргей Эдмундавіч КАЧАН.

24 чэрвеня — загадчык неўралагічнага аддзялення № 2 Мінскай абласной клінічнай бальніцы Ніна Сяргееўна КАПЫЦКАЯ.

25 чэрвеня — загадчык кансультацыйнай паліклінікі Мінскай абласной дзіцячай клінічнай бальніцы Любоў Іванаўна ТАРАСЮК.

У графіку магчымыя змяненні.

30 июня 2010 г. в 15.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Сантехэлектромонтаж».

Повестка дня:

1. О предоставлении безвозмездной (спонсорской) помощи.
2. О материальном вознаграждении членов Наблюдательного совета Общества.

Собрание будет проходить по адресу: г. Гомель, ул. Троллейбусная, 8-А.

Начало регистрации участников собрания: 14.30.

УНП 400052115

Фестывалі

КРЭПАСЦЬ БЕЛАРУСКАГА КІНО

Генеральны прадзюсар фільма «Брэсцкая крэпасць» Ігар Угольнікаў абяцаў прывезці ўсю здымачную групу на прэм'еру ў Брэст.

Яна адбудзецца ў рамках VII фестывалю беларускіх фільмаў, які пройдзе з 20 па 24 чэрвеня, паведаміў Аляксей Бязуглы, намеснік начальніка ўпраўлення кінавідэамастацтва Дэпартамента па кінематаграфіі Міністэрства культуры. Урачыстая прэм'ера сумеснага расійска-беларускага фільма адбудзецца ў самім мемарыяльным комплексе «Брэсцкая крэпасць», яшчэ 2 паказы фільма пройдуць у кінатэатры «Беларусь».

Брэсцкі фестываль першапачаткова задумваўся як фестываль, які ездзіць па розных гарадах. Брастаўчане былі першымі, да каго ён прыехаў, і аказалі такую гасціннасць, што то ён застаўся ў горадзе. І не ў малой ступені з-за таго, што фестываль стаў брэсцкім, ён сёлета ператварыўся ў чэрвеньскі са звычайнага восеньскага.

Цэнтральнай падзеяй фестывалю, які сёлета прысвечаны 65-годдзю Перамогі, стануць мерапрыемствы, звязаныя з памяццю пра пачатак Вялікай Айчыннай вайны. Пра яе пачатак у Брэсцкай крэпасці. Таму пад адкрытым небам адбудзецца прэм'ера фільма Аляксандра Кота «Брэсцкая крэпасць», адначасова яна адбудзецца на Маскоўскім кінафестывалі. Фільм доўгачаканы і шматпакутны. Ён быў задуманы ў 2007 годзе, вельмі нялёгка вырашаліся арганізацыйныя пытанні, таму што не было вопыту сумеснай працы. Але дзеля гэтага былі прынятыя ўсе неабходныя рашэнні на ўзроўні Саюзнай дзяржавы. Рыхтуецца трэцяя пастанова Саюзнай дзяржавы, дзе будуць прапісаныя ўсе ўмовы пракату.

Сёлета ў брэсцкім кінафестывалі маглі ўзяць удзел усе арганізацыі Беларусі, якія робяць кіно, нават студэнцкія фільмы будуць у адмысловай праграме. Вельмі шмат стужак розных жанраў. У конкурснай праграме драма «Ваўкі» Аляксандра Колбышава, дзеянне якой адбываецца ў 46-м годзе. «Дасціш фантасціш» Аляксандра Кананенкі — эксцэнтрычная камедыя. «Дняпроўскі рубеж» Дзяніса Скварцова па сутнасці ваенны баявік. Драма «Інсайт» атрымала шмат прызоў на іншых кінафестывалях. «Кадэт» Віталя Дудзіна, «На спіне ў чорнага ката» Івана Паўлава, «Навагоднія прыгоды ў ліпені» Алены Туравай і Івана Паўлава, моладзевая драма «Зграя» Дзмітрыя Зайцава. Не так мала фільмаў, аказваецца, з'явілася за апошні час.

Традыцыйна брэсцкі фестываль быў не толькі беларускім, ён выходзіў за межы краіны, быў фактычна міжнародным, дзе былі прадстаўнікі Расіі і Украіны. Сёлета павінны далучыцца ўдзельнікі з Польшчы і Літвы. Але такія сумесныя беларуска-расійскія фільмы, як «Брэсцкая крэпасць» і «Вока за вока» расійскага рэжысёра Генадзя Палокі пойдуць па-за конкурсам.

— Мы вядзём размовы і перамовы наконт сумеснай вытворчасці з многімі кінакампаніямі былога СНД і замежжа, — адзначыла Наталля Сцяжко, галоўны рэдактар «Беларусьфільма», адказваючы на пытанне аб праекце «Грунвальд», пра які вялася гаворка. — Так, на кінастудыю «Беларусьфільм» быў прапанаваны сцэнарый, ён быў напісаны вельмі прафесійна і вельмі добра, але аднабакова з пункту погляду гісторыі. Безумоўна, мы з гэтым не маглі пагадзіцца, бо наша краіна ўвогуле не была пазначана як удзельнік гэтай бітвы. Мы прапанавалі літоўскаму боку дапрацаваць, бо мы хочам, каб гісторыя разглядалася аб'ектыўна. Але больш прапаноў не было... Былі яшчэ прапановы па сумесных беларуска-польскіх, расійскіх праектах, аднак не заўсёды наш партнёр пры гэтым мае грошы, усе хочуць здымаць за нашы.

Аднак мяркуецца, што ў святкаванні Грунвальскай бітвы ў Польшчы возьмуць удзел беларускія гістарычныя клубы. Пра гэта паведаміў першы намеснік міністра культуры Беларусі Уладзімір Карачэўскі. Паводле яго слоў, вядуцца размовы наконт удзелу нашай дэлегацыі ў ў Грунвальдзе. «Вы ведаеце, што сваю ролю ў гэтай перамозе адыгралі беларусы. Таму Міністэрства культуры плануе 26 і 27 чэрвеня ў Навагрудку, першай сталіцы Вялікага Княства Літоўскага, свята сярэднявечнай культуры, каб адзначыць Грунвадскую перамогу, — падкрэсліў намеснік міністра. — Возьмуць удзел прадстаўнікі гістарычных клубаў Літвы, Латвіі, Украіны, Расіі. Плануюцца афіцыйныя прадстаўнікі замежных краін».

Ларыса ЦІМОШЫК.

Футбол. Чэмпіянат свету

АРГЕНЦІНА Ў 1/8, ФРАНЦЫЯ ПАКУЕ ЧАМАДАНЫ?

Зборная Грэцыі ў сваім другім матчы на чэмпіянаце свету па футболе ў ПАР перайграла каманду Нігерыі. Сустрэча завяршылася на карысць грэчаскіх футбалістаў. Першымі забілі нігерыйцы — на 14-й хвіліне вызначыўся Калу Учэ. У сярэдзіне першага тайма нігерыйцы засталіся ўдзесяцёх пасля таго, як чырвоную картку атрымаў Сані Кейта. Футбалісты зборнай Грэцыі здолелі ўвасобіць колькасную перавагу ў галы. На 44-й хвіліне Дзімітрыяс Салпінгідзіс аднавіў лік, а на 71-й хвіліне Васіліс Тарасідзіс прынёс сваёй зборнай перамогу.

Зборныя Аргенціны і Паўднёвай Карэі выходзілі на матч у рангу лідараў сваёй групы, абыграўшы на першым этапе каманды Нігерыі і Грэцыі. З першых хвілін аргенцінцы пайшлі наперад, не клапоцячыся пра абарону. І на 17-й хвіліне дасягнулі свайго: Месі зрабіў падачу са штрафнога, аднак мяч не даляцеў ні да аднаго з аргенцінскіх футбалістаў, паколькі яго ў свае вароты зрэзаў Парк Чу-Янг. Ужо на 33-й хвіліне лік, дзякуючы Ігуаіну, стаў 2:0 на карысць падапечных Марадоны. Пасля нападаючы адзначыўся яшчэ двума галамі, адзін з якіх быў забіты з яўнага офсайта, але залічаны арбітрам. Карэйцы скарацілі розніцу ў ліку, забіўшы мяч у першым тайме дзякуючы памылцы ў абароне суперніка.

А выступленне зборнай Францыі на чэмпіянаце свету балельшчыкі ўжо лічаць сур'ёзным правалам. Сустрэча гэтай каманды з мексіканцамі завяршылася пройгрышам 0:2. На 64-й хвіліне мексіканскі форвард Хав'ер Эрнандэс збег адзін на адзін з галкіперам зборнай Францыі Уга Льорысам і накіраваў мяч у сетку варот. Праз 14 хвілін 37-гадовы Куаўтэмок Бланка рэалізаваў пенальці і ўстанавіў канчатковы лік.

У ІРЛАНДСКІХ ПІЦЭРЫЯХ ПОМСЦЯЦЬ ФРАНЦУЗАМ

Тым часам у знакамітай сетцы ірландскіх піцэрый падчас чэмпіянату свету па футболе праводзіцца спецыяльная акцыя, накіраваная супраць зборнай Францыі. Наведвальнікам бясплатна раздаюць піцы ў гонар кожнага гола ў вароты французаў. Такім чынам ірландцы помсцяць зборнай Францыі за нетактоўнасць, якую дапусціла французская федэрацыя футбола, выключыўшы з зборнай Нікаляса Анэльку за канфлікт з трэнерам каманды Раймонам Дамэнекам. Нагадаем, што Анэльку выключылі з зборнай за тое, што ён назваў Дамэнека «ідыётам» у адказ на заўвагу трэнера, што Анэльку варта больш старацца на трэніроўках. Пасля гэтага Дамэнек назваў Анэльку «мярзотнікам». Пасля гэтага Анэльку выключылі з зборнай, а ўся каманда адмовілася трэніравацца, патрабуючы вярнуць Анэльку ў зборную. Аднак федэрацыя футбола Францыі не пайшла на саступкі.

Падрыхтавала Алена КРАВЕЦ.

ДВУМА РАДКАМІ

Учора ўдзень адбыліся вырашальныя для каманд груп D і C матчы (адпаведна): Германія — Сербія 0:1, Славенія — ЗША — 2:2.

«ДЫ НУ ІХ, УСЕ ГЭТЫЯ ЕГІПТЫ І ТУРЦЫІ...»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— А вы назаўсёды сюды пераехалі?

— Не, плануем летам тут жыць. Мне, праўда, давядзецца паездзіць туды-сюды, бо некаму ж і грошы трэба зарабляць. А калі б на дрэвах яны раслі, то не раздумваючы, застаўся б. Ведаеце, не хочацца сядзець у горадзе ў чатырох сценах. А тут прастор, можна і босым пахадзіць, і на веласіпедах паганяць. Дзеці заўсёды з нецярпеннем чакаюць гэтай паездкі. Не паспелі выехаць з горада, як Ваня праз кожныя дзесяць кіламетраў пытаецца: «Тат, мы ўжо ў Бералусі?» Калі атрымаецца, то і на Ражство прыедзем. А чаму і не? Дарогі добрыя, цэны прымальныя і, што самае галоўнае, людзі ўважлівыя, такіх яшчэ пашукаць трэба...

— Георгій, а чаму менавіта Беларусь, я думаю і ў Расіі хапае дамкоў, якія можна набыць у вёсцы?

— У нас неяк усё з Беларуссю звязана. Мой дзядуля тут, у Беларусі, у савецкія часы знайшоў сабе прыстанішча. Я, калі быў малы, у яго часта гасціў. Падабалася мне тут, таму, напэўна, і пасля інстытута цягнула ў сінявокую. Цяпер і дзеці нашы просяцца. Ездзілі ў Гомель на хакейны турнір усёй сям'ёй. Ведаеце, сярод піцерскіх хакеістаў вельмі каціруюцца беларускія базы адпачынку. На зімовых канікулах, напрыклад, каманда Васіля адпачывала пад Полацкам. Умовы добрыя (усё ёсць: і лёд, і гасцініца, і ежа), цэны даступныя, клімат прымальны. Не так даўно і наша знаёмая, чалавек дастаткова заможны, узяла пуцёўку ў лепельскі санаторый. Вярнулася дадому задаволеная. Кажа: «Ды ну іх — усе гэтыя Егіпты і Турцыі, толькі ў Беларусі буду адпачываць».

З дома выглянула гаспадыня і запрасіла нас адведаць сырнікаў з разынкамі, якія яна толькі што спякла.

— Мы нават у Санкт-Пецярбургу стараемся набываць толькі беларускае малако, масла, смятану, — кажа Іна. — Бо ведаем, раз беларускае — значыць якаснае. І не разумеем, чаму на прылаўках красуецца кроп з Ізраіля, а бульба з Галандыі. Няўжо нельга з Беларусі прывезці?

— Яшчэ нам падабаюцца беларускія дарогі. Не ў крыўду Расіі, але калі на Пскоўшчыне ля ўзбочынаў — бур'ян ды лопухі, то тут паўсюль парадак, аж вока радуецца. Любім беларускіх пісьменнікаў. Зусім нядаўна глядзелі ўсёй сям'ёй фільм па аповесці Быкава «Сотнікаў». Думаў, хлопцы не асіляць. А яны глядзелі ад пачатку да канца. А рэч жа сур'ёзная. Ведаеце, усюды ёсць цяжкасці. Але бачна, што Беларусь знаходзіцца на правільным шляху. Пра сябе думаю, дай Бог здароўя Прэзідэнту, што краіну трымае менавіта на гэтым шляху. Нават варатар Пашын любімы — амерыканскі галкіпер Роберт Эш — пераехаў у Беларусь і будзе гуляць за мінскае «Дынама».

«Жанчына-актрыса — сяржант, жанчына-маці — генерал»

Пакуль мы размаўлялі, дадому разам з новым знаёмым вярнуўся старэйшы сын Іны і Георгія — 18-гадовы Міхаіл. Як высветлілася, у іх яшчэ і дачка Вера ёсць, яна ўжо замужам і мае сваё дзіця.

— Іна, вы — актрыса, цалкам прысвяцілі сябе дзецям. Няўжо не марылі зрабіць кар'еру?

— Я сваё адыграла. Паверце, тое, што мне даюць дзеці, ніколі не дала б праца. Менавіта яны дапамаглі мне на многія рэчы паглядзець па-іншаму, дапамаглі знайсці сябе. А хто сам сябе пазнаў, таму ўжо нічога не страшна.

— Жанчына-актрыса — сяржант, жанчына-маці — генерал, — падтрымаў жонку Георгій. — Магчыма, вельмі мужчынскае параўнанне. Але гэта сапраўды так.

— А я катэгарычна не стала б сцвярджаць, што дзеці і кар'ера несумяшчальныя рэчы. Хутчэй, наадварот, дзеці дапамагаюць раскрыцца жанчыне. Мая сяброўка, дзіцячая пісьменніца, доўга вагалася, нараджаць трэцяе дзіця ці не. Нарадзіла і такая шчаслівая!.. У яе быццам другое дыханне адкрылася. Піша і больш, і лепш, чым раней. Я пераканана, што пра яе хутка яшчэ пачуюць.

— Мы хоць і не пісьменнікі, але таксама запісваем пасажы, якія дзеці выдаюць час ад часу, — працягнуў дзіцячую тэму Георгій. — Напрыклад, на Вялікдзень Васіль акуратненька ножыкам выразаў з велікоднай булкі крыжык і з'еў. На пытанне «навошта ты гэта зрабіў», сур'ёзна так адказаў: «Хачу, каб у мяне жывот таксама быў праваслаўны». Ці яшчэ: Паша, яму тады было гадоў шэсць, без перапынку паглядзеў дзве серыі «Беспасажніцы» з Міхалковым і сядзіць задумлівы. Дай-ка спытаю, думаю, што ён зразумеў? А ён сур'ёзна так: «Што я зразумеў? Калі ты сапраўдны мужчына, то ты не павінен кідаць сваю жанчыну» *(смяю

«ВІЦЯЗЬ» — ДА ДНЯ МЕДЫКА

Менавіта такі прыз ад нашай газеты быў уручаны нашай даўняй падпісчыцы з Ляхавіцкага раёна Ірыне Гатоўчыц, які яна выйграла ў звяздоўскай латарэі. Прыемна, што каштоўная рэч прыйшла як нельга своечасова. Сутнасць у тым, што Ірына Вячаславаўна працуе старшай медсястрой у Крывошынскай псіхіятрычнай бальніцы і вельмі ўсцешылася тэлевізару, які мы прывезлі якраз напярэдадні Дня медыцынскага работніка. Наваспечаная ўладальніца каштоўнага прыза расказала журналісту «Звязды», што і яе калегі па працы вельмі абрадаваліся такой ўдачы. Пэўна, што хто-ніхто з іх у самы блізкі час стане таксама падпісчыкам найстарэйшай беларускамоўнай газеты. У пашырэнні чытацкай аўдыторыі на «Звязду» выказаў пажаданне і начальнік аддзела ідэалагічнай работы Ляхавіцкага райвыканкама Міхаіл Дыдышка, які з задавальненнем павіншаваў зямлячку і ўручыў каштоўны прыз.

На Ляхавіцкім раённым вузле паштовай сувязі вельмі ўзрадаваліся, што суперпрыз — каляровы тэлевізар «Віцязь» — дастаўся іх зямлячцы Ірыне Гатоўчыц. Віншаванне ад кіраўніка ідэалагічнай работы райвыканкама Міхаіла Дыдышкі — яшчэ адно таму пацвярджэнне.

Зрэшты, уручэнне тэлевізара «Віцязь» быў практычна нашым амаль заключным акордам у паездцы — пасля Ляхавічаў заставаліся яшчэ Баранавічы. А пачынаўся чарговы звяздоўскі ваяж з Міншчыны. Напачатку традыцыйны візіт ветлівасці ў Дзяржынск, потым планавы ва Узду. Тут ужо зачакалася была свой каштоўны прыз Ніна Апраніч. Яна прызналася, што шмат гадоў выпісвае газету, «Звязда» ёй вельмі падабаецца. А пасля таго, як кухонны камбайн стане пастаянным памочнікам на яе кухні, узрадавалася Ніна Уладзіміраўна, попыт на найстарэйшае беларускамоўнае выданне сярод суседзяў і знаёмых значна ўзрасце. Кампанію ў «фотасесіі» ёй склаў муж Васіль.

Добры настрой і шэраг рэкламна-інфармацыйнай прадукцыі мы пакінулі ў Нясвіжы, дзе газета «Звязда» займае традыцыйна моцныя пазіцыі. І на гэты раз, запэўнілі паштавікі, пастараемся не падкачаць ў падпісцы.

Настаўніцы беларускай мовы і літаратуры з Ганцавічаў Ліліі Віннік (злева) пажадала ўдачы начальнік аддзела ідэалогіі мясцовага райвыканкама Лідзія Занька.

Апошнім пунктам маршруту па Мінскай вобласці значыўся Клецк. Тут таксама адбылася цёплая размова з кіраўніцтвам мясцовай пошты і райвыканкама. Брэстчына пачыналася з Ганцавічаў. Кіраўнік «мясцовай вертыкалі» Уладзімір Міхайлавіч Столяр вельмі добра выказаўся пра нашу газету, зазначыўшы, што «Звязда» — часты госць раёна, хоць быў не супраць, каб яе журналісты і яшчэ часцей бывалі тут у службовых камандзіроўках. Ён пажадаў удачы ў звяздоўскай латарэі падпісчыкам раёна. Тым больш што нагода была: на галоўным паштовым аддзяленні мы дамовіліся напярэдадні аб уручэнні каштоўнага прыза — электрачайніка — жыхарцы горада Ліліі Віннік. Яна, нягледзячы на паважаны ўзрост, яшчэ выкладае ў Ганцавіцкай сярэдняй школе № 3 мову і літаратуру. Таму сустрэча са звяздоўцамі прайшла вельмі цёпла. У гэтым паспрыяла начальнік аддзела ідэалагічнай работы мясцовага райвыканкама Лідзія Занька.

Падпісчыца з Узды Ніна Апраніч разам з мужам Васілём у кампаніі супрацоўніц галоўнай пошты раёна.

Заканчэнне чарговага выезду па падпісцы адбылося ў Баранавічах. Тут таксама паабяцалі, што пра нашу газету не забудуць ні ў якім разе.

Уладзімір ЗДАНОВІЧ.
Мінск—Дзяржынск—Узда—Нясвіж—Клецк—Ганцавічы—Ляхавічы—Баранавічы—Мінск.

«ЗВЯЗДА» ТАКАЯ МАЛЯЎНІЧАЯ!

Дзень падпісчыка ў Гомелі праходзіў на базе аддзялення сувязі № 50, якое знаходзіцца ў самым цэнтры Гомеля. Пастаянныя чытачы перыядычных выданняў ведаюць пра гэты дзень і многія скарысталіся магчымасцю, каб менавіта тут і зараз падпісацца на сваю газету, і атрымаць сувенірную прадукцыю з рук аўтараў друкаваных СМІ. Тры гады як Ганна Рыгораўна Чарнова стала падпісчыцай «Звязды». У дзень падпісчыка яна адразу ўпэўнена накіравалася да століка з нашым выданнем. Зразумела, зацікавіла, што ёй у нашым выданні падабаецца.

— Газета падабаецца тым, што ў ёй я знаходжу вельмі шмат адказаў на тыя пытанні, якія мяне хвалююць. І потым, яна такая маляўнічая і прыгожая! Мяне гэта толькі радуе.

Ганна Рыгораўна дадала, што і яе 14-гадовы ўнук любіць чытаць газету, якую выпісвае бабуля. Яму і дастанецца бейсболка з нашым лагатыпам, якую з задавальненнем прымерала перад фотакамерай наша пастаянная чытачка.

Ірына АСТАШКЕВІЧ. Фота аўтара.

ВОЖЫК І ПЧОЛКА ПРАЦУЮЦЬ НА ПАДПІСЦЫ

У Віцебску нестандартна праводзяць традыцыйны Дзень падпісчыка. На плошчы Перамогі вялікія ляльки — вожык «Паштальён» і пчолка «Разумніца» — заклікаюць мінакоў падпісацца.

— Сёлета мы ўпершыню праводзім Дзень падпісчыка на працягу двух дзён — (17 і 18 чэрвеня), — расказвае «Звяздзе» **начальнік аддзела распаўсюджвання друку Віцебскага філіяла РУП «Белпошта» Таццяна РУТКІС**. — Графік работы паштальёнаў на цэнтральнай плошчы вобласці з 13.00 да 19.00. Людзям прыемна раптам убачыць нашых казачных памочнікаў — лялек. Зразумела, у першую чаргу задаволены дзеці.

Усім падпісчыкам уручаем памятныя сувеніры ад «Белпошты»: прыгожа аформленыя канверты з арыгінальнымі ўкладкамі для лістоў, календары.

Раней па традыцыі Дзень падпісчыка праходзіў у галоўным паштовым аддзяленні Віцебска № 15, якое знаходзіцца побач з плошчай. Цяпер нашы супрацоўнікі, як кажуць, самі выйшлі ў народ.

Між іншым, Віцебская вобласць — лідар па колькасці выпісаных экзэмпляраў газет і часопісаў. Ажно 608 асобнікаў на 1000 чалавек прыходзіцца. Пры насельніцтве вобласці больш за 1 мільён 228 тысяч чалавек выпісваюцца больш за 747 тысяч экзэмпляраў. Прыемна, што вельмі папулярная сярод жыхароў Прыдзвінскага края і наша «Звязда». І колькасць прыхільнікаў найстарэйшай беларускай газеты не змяншаецца.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Калі вы падпісаліся на газету **«Звязда» на III квартал або 2-е паўгоддзе 2010 года** — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце яе **да 2 ліпеня** ў рэдакцыю на адрас: **220013, Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А**.

Падпісчык можа выйграць электрапрас, кухонны камбайн, тэлевізар або печ ЗВЧ. Розыгрыш прызоў адбудзецца **6 ліпеня 2010 г.**, вынікі публікуюцца ў газеце «Звязда» **па 16 ліпеня 2010 г.**

Дастаўку тэлевізараў і печы ЗВЧ ажыццяўляе рэдакцыя. Астатнія прызы можна атрымаць у рэдакцыі **па 30 верасня 2010 г.** пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на III квартал або 2-е паўгоддзе 2010 года і пашпарта. **Пасля 30 верасня** выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца.

Правілы гульні чытайце ў газеце «Звязда» за 22.05.10 г.

Тэрмін правядзення гульні — з 22.05.10 па 30.09.10.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 1694 ад 13.05.10, выдадзена Міністэрствам гандлю РБ.

8 Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на III квартал або 2-е паўгоддзе 2010 года

Прозвішча, імя, імя па бацьку _____

_____

Падпіска аформлена і аплачана ў _____
(аддзяленне сувязі)

_____ **на III кв. або 2-е паўг. 2010 года**

Хатні адрас і тэлефон _____ _____
(індэкс)

_____

_____

Удачы ў розыгрышы!

Простая мова

Век жыві, век... глядзі! Дарога, прынамсі — да драбніц знаёмая... Поле ўзбоч — толькі што ўзаранае і...

Буслы на ім — штук 50 ці, можа, 100! Відовішча — вачэй не адвесці!..

А потым — з думак не выкінуць: ну добра — нейкія з птушак убачылі тую «арбу» з недалёкіх буслянак, нейкія — з вышыні палётаў, нейкія — прыляцелі на рокат трактара, бо яго ж і насамрэч далёка чуваць. А астатнія? Хто ім наказаў-паведаміў? Як? Аб'явіў па буслiным радыё, «пазваніў» па мабільным? Даў тэлеграму?

...Век жыві, век вучыся, а ўсё роўна дурнем памрэш.

Можна толькі адчуць...

Што лепш?

Інстытут яны скончылі разам, разам прыйшлі на завод і праз год пажаніліся...

Далей (з дазволу?) дарогі іх... разышліся, бо яна тройчы «пасядзела» ў дэкрэтным. Ён у гэты ж час, як кажуць, пайшоў уверх: на тым жа прадпрыемстве ў начальства выбіўся — з усімі адсюль наступствамі ў выглядзе заробку, асобнага кабінета з сакратаркай, машыны з кіроўцам...

Што цікава, на ёй цяпер кожную раніцу яго вязуць на працу, увечары — дамоў.

Жонка (туды ж і ў той самы час!) з перасадкамі, праз увесь горад едзе на трамваях-тралейбусах.

Бо (як тлумачыць мужык), калі пасадзіць яе побач, разам з сабой, у машыну, гэта, з яго боку, будзе выглядаць, як злоўжыванне.

...А калі не (пасадзіць) — як звычайная дурата? Ці неяк інакш?

На скрыжаванні

Евангельскае правіла: «Не рабі іншым таго, чаго не хочаш сабе». Але зараз не пра яго: кажуць, вадзіцелі маршрутак мясцовы страйк рыхтуюць. Асноўнае патрабаванне — адмена правілаў дарожнага руху.

Наконт усіх — яны, зразумела ж, загнулі, але асобныя...

Раніцой (гадзін з 7 да 8) на скрыжаванні, што пад вокнамі, заторы былі. Увечары — з 5 да 7 — таксама.

Для таго, каб ад іх пазбавіцца, знак павесілі: «Паварот налева забаронены». Прычым — увесь дзень! Наразай, значыць, кругі, капці горад, палі свае нервы і час — нават тады, калі дарога, лічы, пустая...

Асобныя з вадзіцеляў мірыцца з гэтым не хочуць і парушаюць правілы — едуць налева, туды, дзе, як правіла, ужо стаяць... службоўцы з ДАІ.

Яны — без сумневу (работа ў іх такая) — правілы дарожнага руху ведаюць на зубок.

...Тое, з Евангелле, мусіць, наўрад ці?

Не лічы кветкі ўвесну...

Добрая вестка — заключаць кантракты па-ранейшаму будуць, але ўжо не з усімі...

Думала абмеркаваць яе са сваёй знаёмай, вопытнай кадравічкай, — нічога не выйшла.

— А мы і раней не заключалі, — спакойна сказала жанчына. — Ні з кім...

— ?!

— ...Як толькі пагалоска пра іх пайшла, я да шэфа: будзем, маўляў, людзей перавозіць, ці не? Ён мне пытанне рубам: «А што гэта дасць?». Пасядзелі, так і гэтак прыкінулі. Рашылі, што не варта калектыў бударажыць, людзей нерваваць — хай лепш пра справу думаюць, чым пра кантракты.

...Прыказка: не лічы кветачкі ўвесну, лічы яблычкі ўвосень: калі фірма іх «на плыву», значыць рашэнне (і ці толькі адно?) спрацавала?

Дарагі татачка

Магія лічбаў: *восьмага* мая ў цесным коле з *васьмі* чалавек Ільіч спраўляў *васьмі*дзесяцігоддзе.

Стол накрываў па вышэйшым разрадзе, на лецішчы, на дварэ — яшчэ і для таго, відаць, каб чутно было (у тым ліку суседзям), што канкрэтна яму скажуць сямейнікі.

За імі, як і варта было чакаць, «не заржавела». Са словамі падзякі — за бясхмарнае дзяцінства, за пастаянны клопат, за добрую адукацыю і заўсёдную падтрымку — з-за стала падняўся большы сын. Потым — хораша выступаў меншы. Даводзіў, прынамсі, як гэта важна з самага пачатку жыцця (калі ты, можна сказаць, яшчэ бездапаможны і ні ў чым не ўпэўнены) ведаць, што побач ёсць дужы, разумны, родны чалавек — бацька, які заўсёды выслухае цябе, разважыць, а калі трэба, то пашкадуе, заступіцца і дапаможа. І тады, і цяпер... Не капейкай, дык хоць парадай.

Па чарзе ўставалі, гаварылі нявесткі. Дзякавалі імяніннiку за добрых мужоў, за грошы, якія ён, пакуль працаваў, перыядычна «падкідваў» — на кватэры, на мэблю, машыны ды і проста так, за свае, з лецішча, круглы год нязводныя клубніцы, агуркі, памідоры і яблыкі, за дапамогу ў выхаванні ўнукаў...

Не маўчалі і тыя (ужо дарослыя, рослыя): гэтаксама дзякавалі бабулі і дзеду, гэтаксама жадалі здароўя і сілаў — на доўгія, доўгія гады.

Само сабой — разам, усёй сям'ёй чаркавалі, само сабой — частаваліся і нахвальвалі гаспадыню за розныя прысмакі, само сабой — нешта ўспаміналі і гучна, шчыра смяяліся, само сабой здымалі свята на камеру.

Імяніннік, карацей, быў шчаслівы. І потым, калі госці паехалі, яшчэ доўга хадзіў «па маршруце» стол на вуліцы — кухня, зносіў туды посуд. Жонка паціху мыла.

Назаўтра — 9 мая (гэта святое!) яны адпачывалі. А 10-га Ільіч пайшоў «па суседзях»: некага прасіць, каб дапамаглі яму... пасадзіць сотку бульбы.

Прыйдзе коза да воза...

Вечар, трамвай, напярадзе на адзіночных крэслах два хлопцы — сядзяць, штось разглядаюць, гамоняць. Раптам адзін падхопліваецца — саступае месца досыць маладой, сімпатычнай кабеце.

— Ты чаго гэта?! — не зразумеўшы ўчынку, ціха пытае другі.

— А раптам цешча?..

Дзеля ўсіх

Аповеду — адзін абзац (з кнігі Фёдара Янкоўскага «З нялёгкіх дарог»), а жаху...

Улетку 43-га некалькі партызанскіх сем'яў (усяго душ за 30) апынулася ў акружэнні: зусім блізка ад яе (настолькі, чуваць было) хадзілі эсэсаўцы. А ў ёй, той групе, плакала дзіця. Плач выдасць і ўсіх нас накрыюць — сказаў нехта. І ўсе спахмурнелі. Не палягчэла людзям і тады, калі пачулі: «Зрабіце, як трэба дзеля ўсіх...». Сказаў гэта... бацька той двухгадовай хворай і галоднай дзяўчынкі. Але перш чым аддаць яе, ён узяў малую на рукі, прытуліў да грудзей. І дачушка... сціхла.

А калі б не?!.

Мусіць, жыў бы неяк бацька яе? І маці? Мусіць, жыў бы неяк той, хто зрабіў, «як трэба дзеля ўсіх...», жылі б сведкі...

Зрэшты, краіна ў нас вялікая і шматпакутная. Людзей, апаленых вайной, яшчэ шмат: цалкам магчыма, што нехта і жыве. З гэткім...

Як жыў той бацька (прозвішча і месца пераведамляюцца) — нікому нічога не кажучы.

Рабі, што хочаш!

Палка на два канцы: каб пазбягаць памылак, трэба набірацца вопыту, каб набірацца вопыту, трэба рабіць памылкі.

Некалі, у дзень нараджэння Сяргея, упершыню злавіла сябе на думцы, як добра было б павітаць не толькі (ці не столькі?) яго...

З тым, што сын, вось такі — разумны, прыгожы, добры — на свет нарадзіўся, вырас, жыве, хацелася павіншаваць бацькоў.

І зрабіць гэта вельмі проста было: зняў тэлефонную трубку, набраў нумар, сказаў, падзякаваў. Але ж... Няёмка неяк: я ніколі не бачыла іх, а яны мяне... Ды і завядзёнкі такой не было — нават упаміне...

Цяпер (хочаш, каб была, — завядзі!) — яна ўжо ёсць. Прынамсі, у нашым коле...

Няма Сяргеевых бацькоў!

Шчасце

Гэта хатка пуставала гады са тры — ранейшыя гаспадары памерлі, новыя, крэўныя, з'явіліся толькі сёлета, напрадвесні. Ды такія ж прыгожыя — унук, яго жонка і вельмі пацешны малы!

— Шкада, што бабуля не бачыць, от жа рада была б! — дружна прызнала вёска.

...Маленькаму — праўнучку (потым разгледзела...) — цалкам магчыма. Дарослым — наўрад, бо за два месяцы, што яны тут жывуць, на падворку нічога не змянілася: тая ж падушка замест шыбкі ў акне, той жа зарослы быльнягом кветнік, той жа пахілены плот...

І ўжо не шкада, ужо шчасце, што бабуля гэта не бачыць.

Лепш не бывае?

Касцюм чалавеку прыдбалі (парадокс: гадоў дзесяць таму — гэта, як быццам, нядаўна, у канцы мінулага веку — даўно). Абнова, як ёй і належала, павісела спачатку ў шафе (гэта значыць, апраналася гады ў рады, на вялікія святы), потым стала насіцца штодзень, на працу, нарэшце пераехала на лецішча — у якасці робы, паслужыла яшчэ і там... Грэх скардзіцца — удалая рэч была.

І... ёсць, бо акурат такі ж (цюцелька ў цюцельку — тканіна, фасон, нават гузікі) убачыла нядаўна ў краме.

Як прыкмету стабільнасці?

Па адзенні пан, па розуме баран

Горад. Раніца. У двары (туды зверху глядзіш, як у студню) сігналіць машына. Чаго — бачна адразу: падперлі. Гэта значыць, пад носам у яе паставілі яшчэ адну (досыць крутую) і цяпер не выехаць. А трэба, відаць... Таму вадзіцель, нервова цісне на клаксан, з надзеяй пазірае на шматлікія вокны...

Лічы, у кожным з іх мільгаюць твары — старэчыя, жаночыя, дзіцячыя... Няма, хіба, патрэбнага. І выйсця, як быццам? Мужык падзывае яшчэ двух — яны спіхваюць з месца тую машыну.

У ёй адразу ж спрацоўвае сігналізацыя, і енк яе такі чуе гаспадар — высоўваецца з акна, усіх, хто... прычапіўся да ягонай машыны, абкладвае мацюкамі і... хаваецца.

— Во хам! Во казёл! Во дурыла!... — абураецца люд. І, падобна, з жахам думае, што «перасекчыся» з ім у двары яшчэ палова бяды. Бяда, калі дзесь у дарозе...

На чамадане

Сумная вестка: не стала дзеда Сямёна. Ён (адна з дачок расказвала) усё жыццё працаваў шафёрам, прыгожым... быў і вельмі гумарным. Відаць, таму яго вельмі любілі жанчыны. Але ён быў жанаты і дзетны, таму адбіваўся, як мог, але не заўжды, і дома з-за гэтага здараліся сваркі — падчас якіх (даходзіла!) маці кідала ў чамадан ягоныя рэчы, ставіла пад парог: усё, маўляў, з яе хопіць...

Што тады бацька?

Буру гэту ён зносіў цярпліва і моўчкі. Але ж да пэўных слоў. Як толькі яны прамаўляліся, ён тут жа гукаў:

— Дзеці, га дзеці...

Малыя (а потым і падрослыя) беглі ў калідор.

— Ці чулі, — пытаўся ён, — што цяпер маці ваша сказала?

І сам жа за іх адказваў:

— Сказала, што я магу ісці ад вас, што я вам не патрэбны...

Дочкі, пачуўшы гэтыя словы, кідаліся да бацькі, абдымалі яго за рукі-ногі, вешаліся на шыю, плакалі і казалі, што ён — патрэбны!..

Пасля гэтага (хоць не адразу...) чамадан той усё ж «распакоўваўся». І (ужо пусты) займаў сваё месца пад ложкам альбо ў антрэсолях — аж да новых бацькавых прыгод.

Паміж імі — тымі, што сарафаннае радыё даносіла неяк да маці — былі гады, гады звычайнага жыцця, можна сказаць, звычайнай сям'і, дзе падрасталі дзеці, купляліся рэчы, адзначаліся святы, паступленні, вяселлі, пасады і хрэсьбіны ўнукаў, дзе некалькі гадоў таму пасля цяжкай хваробы не стала маці. А вось цяпер і яго...

Не стала.

А здаецца (нават мне), што ёсць, што сядзіць... На сваім чамадане, што зараз спытае ў дачок, ці патрэбны?

І застанецца!

Можна толькі адчуць...

Паштовачка на стале — «раскладушкай». Звонку, так бы мовіць, на вокладцы — сціплы малюнак і як на першы погляд, дык простыя словы пра тое, што самае важнае ў жыцці нельга ўбачыць, нельга памацаць рукамі. Самае важнае ў жыцці можна толькі адчуць — сэрцам.

На развароце кароткае пажаданне — любові, дабра і разумення... Самага важнага. Таго, што і насамрэч не ўбачыш. Не памацаеш...

І, калі няма, не купіш — ні за якія грошы. Можна толькі адчуць...

Валянціна ДОЎНАР.

Паритетбанк

УВАЖАЕМЫЕ АКЦИОНЕРЫ ОАО «ПАРИТЕТБАНК»!

30 июня 2010 года проводится внеочередное Общее собрание акционеров банка в заочной форме методом опроса с повесткой дня:

1. О процедурных вопросах.
2. О внесении изменений в Устав ОАО «Паритетбанк».
3. Об утверждении изменений и дополнений № 2 в Положение о Наблюдательном Совете ОАО «Паритетбанк» от 26.08.2004 № 01-04-05/1980, утвержденное протоколом Общего собрания акционеров от 18.08.2004 № 4 (в редакции протокола Общего собрания акционеров 27.04.2007 № 4).
4. О предоставлении безвозмездной (спонсорской) помощи.

Собрание проводится по адресу: г. Минск, ул. Гамарника, 9/4, комн. 306.

Бюллетени для заочного голосования и другие материалы к собранию участники собрания могут получить по указанному адресу с 23 по 24 июня 2010 года с 9.00 до 13.00.

Заполненные бюллетени для заочного голосования должны быть возвращены не позднее 25 июня 2010 года по месту их выдачи, дата подсчета голосов – 29 июня 2010 года.

Телефон для справок: 288 49 43.

Лицензия на осуществление банковской деятельности Национального банка Республики Беларусь от 27.10.2006 г. № 5. УНП 100233809.

Рэверс з сецівa

«Любіш катацца? Любі за саначкі плаціць!» (20 мая 2010 г.)

«Іншы раз ад кантралёраў так уцякаюць — не тое што бульбу, дзяцей забываюць!»

Больш за 100 тысяч мінчан было аштрафавана летась за безбілетны праезд у грамадскім транспарце. Сума штрафу склала ні много ні мала, усе 700 мільярдаў беларускіх рублёў. Куды пайшлі гэтыя грошы і чаму пасажыры так не паважаюць кантралёраў?

Ілья ЛАПАТО.

@

Я адкрыю спадару Ілье жорсткую праўду: не любяць не толькі кантралёраў, але і ўсіх іншых з кантрольных кантор. На ўласным вопыце ўзгадваю, як даводзілася, ад іх бегаючы, псаваць нервы... Тут я яўна супраць кантралёраў! І чаму б не зрабіць бясплатным транспарт?? І грошай бы на гэтых дармаедах зэканомілі б...

Пан.

@

«Іншы раз так уцякаюць — не тое што бульбу, дзяцей забываюць» — гэтая фраза павесяліла больш за ўсё. Такое і я бачыла. Калі была студэнткай, магла часам праехацца зайцам, а вось апошнія гады сумленне не дазваляе. Заўсёды купляю праязны на ўсе віды транспарту, бо ездзіць даводзіцца шмат, і трэсціся кожны раз з непрабітым талонам у руках зусім не хочацца. У жыцці і так зашмат іншых стрэсаў. Не хапала яшчэ і гэтага.

Святлана.

@

Пан, а можа, Вам яшчэ і даплачваць за тое, што вы транспартам карыстаецеся?! І малако за шкоднасць у краме бясплатна даваць? Алё, Пан, камунізм скончыўся гадоў *ццаць таму! І ў цывілізаваным грамадстве за ўсялякія атрыманыя паслугі людзі плацяць. Толькі ў нас пры гэтым бурчаць, каго, хто і за што «не любіць» ды абзываюць іншых дармаедамі — менталітэт такі, ці што? Схадзіце папрацуйце месяц кантралёрам — можаце і бясплатна, як самі прапануеце, з задавальненнем пачытаем потым вашы водгукі пра «зайцоў» :)

Ну-ну.

@

Супраць кантралёраў і кандуктараў! Мне здаецца, што яны ўсе заканчваюць курсы «хто самы прыкры і злы».

Вераніка.

@

Гэта сапраўды ў многіх такі менталітэт: ні за што не плаціць, заўсёды на халяву. Толькі менталітэт не беларускі, а савецкі. Дзякаваць богу, што ён паступова знікае. Пакуль жыў у Заходняй Еўропе, заўважыў, што там усе людзі спраўна плацяць за праезд і ў іх ніколі не ўзнікае пытання, чаму кантралёры правяраюць білеты. Сустракаліся і такія, якія не плацілі, але гэта ў большасці выхадцы з краінаў былога СССР, так што можна рабіць высновы.

Назіральнік.

@

А вось, вы мне адкажыце: на што ідуць нашы падаткі? Мы і так сёння ўжо амаль за ўсё плацім з уласнай кішэні: бальніцы — і тыя ўжо амаль цалкам платныя. Дык у чым цяжкасць зрабіць праезд бясплатным? І нервы гарэць ні ў каго не будуць, і грошы зэканомім на кантралёрах і кандуктарах... А то хочам жыць пры сацыялізме (калі ты дзяржаве павінен), а жывём пры капіталізме (калі табе дзяржава мала што павінна...) У СССР хоць бы кватэры выдавалі...

Пан.

@

Пан, кажыце толькі за сябе, калі ласка. Я вось не хачу жыць пры сацыялізме, калі палова народу трасе сваімі льготнымі «корачкамі», узгадвае, як тое было за савецкім часам, патрабуе халявы і расказвае, што другая палова ёй усё наўкол павінна. Я хачу жыць у цывілізаваным грамадстве: карыстаешся паслугай — плаці, добра працуеш — атрымлівай годныя грошы і не лічы чужыя. А грошы на кандуктарах і кантралёрах вы не зэканоміце (я, васпане, няблага валодаю пытаннем, таму паведамляю, што ў сярэднім кандуктар «акупляе» сваё ўтрыманне за адзін працоўны тыдзень, увесь астатні час ён/яна працуе на аўтапарк). Што да падаткаў — пачытайце вы хоць бы мінімальна курс эканомікі, га? З падаткаў — не толькі вашых, але і маіх, і ў тым ліку кантралёраў і ўсіх іншых, каго вы так не любіце — выплачваюцца грошы тым, хто сам іх не зарабляе: пенсіі і стыпендыі, усялякія дапамогі маламаёмасным і дэкрэтніцам, ільготныя лекі, утрымліваюцца дзіцячыя садкі, камунальныя службы і г.д. Як гэтыя грошы размяркоўваюцца — ужо іншае пытанне, але да тэмы дыскусіі яно дачынення не мае.

Ну-ну.

@

Ну-ну, курс эканомікі і не толькі мінімальны я прачытаў ужо не раз, бо сам па адукацыі эканаміст. Дык, у якасці эканаміста задаю вам пытанне: як кандуктар можа «акупіць» сваё утрыманне, калі яны ёсць выпадкамі, прычым не фіксаванымі (г.з. можна было б і без іх абысціся)? Хто вам прапаноўвае жыць, калі нехта будзе нечым трэсці? Я прапаноўваю зрабіць грамадскі транспарт бясплатным увогуле!

Пан.

@

Улічваючы тую колькасць падаткаў, што мы цяпер плацім, можна было б грамадскі транспарт і бясплатным зрабіць. Але, па-першае, тады давядзецца гэта рабіць за бюджэтныя сродкі (нашы падаткі), якія ўжо разлічаны на штосьці іншае, г.зн. іх давядзецца забрацьу кагосьці іншага, хто жыве за кошт бюджэту. Ну не друкаваць жа новыя грошы. І забяруць гэтыя грошы здагадайцеся ў каго? Правільна! У нас жа іх і забяруць! Увядуць які-небудзь дадатковы падатак, зробяць праезд бясплатным і будзем мы жыць, як у казцы))) І па-другое. Бясплатны праезд зноў народзіць у нашых мазгах сіндром бескантрольнасці, ад якога мы яшчэ не адышлі з савецкіх часоў, калі ні за што не трэба было плаціць, усім на ўсё было начхаць. Не сваё — не шкада. Вынікі такой псіхалогіі адрыгаюцца нам да гэтых часоў (з'ездзіце ў любы калгас, каб у гэтым пераканацца).

Я настойваю на тым, што нам зараз востра не хапае капіталізму: падаткі для ўсіх знізіць, але калі хочаш чым-небудзь скарыстацца — плаці. За ўсё плаці: за транспарт, за лячэнне, за навучанне. Згодзен, што гэта жорстка, але па-іншаму навучыць нашых людзей адказна ставіцца да ўсяго навакольнага немагчыма.

Назіральнік.

Сайт «Звязды»: www.zviazda.by

ВЫРАТАВАЎ ДВАІХ

Уначы жыхар Ляхавічаў ішоў па вуліцы райцэнтра і ў акне адной кватэры ўбачыў полымя. Мужчына кінуўся ратаваць людзей і першым выцягнуў 55-гадовага сына гаспадыні, які прыехаў з Расіі ў госці, а затым выратаваў і 78-гадовую гаспадыню дома. Неўзабаве прыехалі пажарныя і пры тушэнні агню на падлозе ў спальні знайшлі другога сына пенсіянеркі, які задыхнуўся.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

ЗБІРАЛІ ЧАРНІЦЫ І АПЫНУЛІСЯ ЗА МЯЖОЙ

Пінскія памежнікі затрымалі пяцярых грамадзян Украіны, якія збіралі чарніцы на нашым баку. Затрыманыя растлумачылі, што яны заблукалі і не заўважылі, як апынуліся ў Беларусі. Парушальнікаў адпусцілі, а вось ці канфіскавалі 25 кг чарніц, невядома. Летам, калі ў лесе з'яўляюцца ягады і грыбы, такія парушэнні з украінскага боку — звычайная справа.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

«Едзем у вагоне, смяёмся... Раптам настрой упаў. Пачулі непрыемную вестку: кажуць, Германія абвясціла вайну Савецкаму Саюзу»...

У Самахвалавіцкай сярэдняй школе знаходзіцца незвычайная рэч — дзённік 1940—1942 гадоў аднаго з выпускнікоў школы. Дзённік захаваўся даволі добра, ніводнай старонкі ў ім не згублена, толькі частка запісаў за 1941 год сапсаваныя вільгаццю. Аўтар вёў занатоўкі даволі рэгулярна, часам штодня. Калі я спытала вядомага архівіста Віталя Скалабана, наколькі рэдкая рэч знаходзіцца ў Самахвалавіцкай школе, ён сказаў, што падобныя дзённікі ёсць. Іх няшмат. На фронце, дарэчы, весці іх забаранялася, а вось на акупаванай тэрыторыі і ў тыле дзённікі вяліся. І нярэдка тое, што ў іх запісана, не адпавядае звыклым для нас уяўленням пра гэты час.

Незвычайнасць дзённіка, які «Звязда» для публікацыі прадаставіла загадчыца Самахвалавіцкага школьнага музея настаўніца гісторыі Алена ГУСЕЛЬНІКАВА, у тым, што гэта, па сутнасці, погляд, думкі і ўражанні зусім маладога чалавека, юнака, за плячыма якога толькі дзяцінства. А наперадзе — вайна... Пісьменнік Барыс Васільеў у аповесці «Заўтра была вайна» піша, што гэта — самае нешматлікае пакаленне. Пакаленне выпускнікоў школы 1941 года. Тым больш каштоўнае яго жывое сведчанне.

Дзённік ніколі не публікаваўся. Мы прапануем выбраныя старонкі. Мова і стыль арыгінала захаваныя.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.



«ЯШЧЭ НЕ ЗВЕДАЎ Я ВЯЛІКАГА ГОРА...»

1940 год. Дневник № 1 Шпаковского Бронислава.

Впервые в жизни берусь писать, т.е. вести дневник, который мне позже послужит памятником, так как мои юношеские годы есть наисветлейшие в жизни. В такие годы каждый уже понимает, что плохо и что хорошо. Еще не знал я великого горя, еще не был я сильно чем-либо разочарован. А для этого нужно все это сохранить для памяти как вещь ценную и дорогую. И тогда в поздней жизни, может быть мрачной и тяжелой, воспоминания эти будут одним из светлых пунктов, к которому обращены будут мои глаза и сердце...

1 января 1940 года.

После дальней поездки в Борисов возвращаюсь с моим другом Антоном Шарейко домой. Ясное морозное утро. Мороз доходит до 35 градусов. Дышать становится тяжело. Поезд подходит к Минску и кажется, на сердце делается легче: во-первых, чувствую себя почти дома, а во-вторых, нас с Антоном не выгнал кондуктор, так как мы ехали без билета, что называется «зайцем».

Слазим с поезда, идем по городе. Везде еще спят. Часы показывают семь утра. Потом голосуем на машину, садимся, едем и еле живые приезжаем в Самохваловичи. Все покоченело: и ноги, и руки, и лицо. Попали домой как раз на блины. Войдя в комнату, я еле произнес:

— Здрасте...

Мать отвернулась от печки, с недоумением посмотрела на меня, а потом сквозь слёзы произнесла:

— Ах, боже мой, откуда же это ты взялся?...

Я, стуча зубами от холода, быстрее шагнул к печке, чтобы немного обогреться. Отец и Роза быстро схватились с постели и выбежали на кухню по мне. Здесь они рассказали всю историю, как их Борис обманул и они были уверенны, что я уехал в Западную Украину (во Львов), и больше меня не увидят. Это меня рассмешило, и я рассказал, почему мы с Антиком удрали с Борисова и не поступили в училище...

...2 марта.

За ученицей нашего класса Валей Ж. я уже давно наблюдал. Она мне понравилась, когда я ее увидел впервые (в восьмом классе). Но тогда она еще была малолетней, и я ее мало замечал. И училась она в 8Б классе, а я в 8А. Так что, я ее мало видел.

Но теперь, занимаясь вместе в 9 классе, я постепенно начал ею увлекаться, но поговорить с нею ни разу не отчаивался, ибо она ведет себя крайне осторожно. Часто мои взоры встречались с ее взорами, и она опускала вниз глаза, как бы стесняясь меня. У меня же разгорался все больший и больший огонь любви к ней. Она это однажды заметила и, покраснев, вышла с класса (было дело на перемене)...

...15 марта.

...С вечера просидел до 2 часов ночи. Читал книгу проф. Оленьева «Половая жизнь молодых людей». Вещь довольно интересная.

...18 апреля.

Приходя домой со школы, все время отдаю исключительно для слушанья радио. По целым часам не отхожу от приемника. Забываю иногда, что надо учить уроки. Теперь началась декада белорусского искусства в Москве. Выступления довольно интересны. Передавали уже пьесу белорусского писателя Крапивы «Хто смяецца апошнім» и пьесу Колоса «Дзед Тарас» (Напэўна, размова ідзе пра Дзеда Талаша ва «У Пушчах Палесся». — «Зв.»). Артисты играют свои роли замечательно. Приходят слушать ко мне радио иногда и Костя с Лёником.

...31 декабря.

... Последний день 1940 года! Последний день года, который принес много чего полезного человечеству, года, который непременно должен войти в историю.

Правда, в моей юной жизни этот год прошел не очень весело, но и не совсем скучно. ...надеюсь, что дневник 1941 года будет более интересен.

А теперь прощай старый 1940 год! И здравствуй новый 1941-й, год, полон событий, радости и счастья!

«І ЎЗГАДАЮ Я ТАДЫ ЎСЁ, ШТО ЁСЦЬ У МЯНЕ ЦЯПЕР...»

Дневник № 2 на 1941 год Б. Шпаковского.

...15 февраля

Школьная тихая жизнь была встревожена одним интересным событием. Проверяя работу детского дома им. Калинина, В. Михаил установил там такой факт: ученица 10 кл. Анна Г. не подчиняется воспитателям, обзывает их разными словами, идет самовольно на вечера, ...по нескольку дней не ходит в школу. Долго не думая, Миша доложил директору школы Альхимовичу, который этим делом заинтересовался, и сейчас же было собрано заседание комсомольского комитета. Здесь директор начал критиковать Г. И дошел до того, что дал предложение выключить ее из комсомола. Комитет решил это предложение разбирать на комсомольском собрании.

После заседания комитета Г. почувствовала свое преступление, и весь день плакала, старалась подойти к Мише с доброто. Но секретарь комсомольской организации оказался с железным сердцем и (не чыт.) своих решений и решений комитета о выключении ее из комсомола. Он надеется, что она теперь должна стать его «добычей», т. е. он теперь сможет с ней гулять, ухаживать...

...23 февраля.

Сегодня большой праздник трудящихся Советского Союза — День Красной Армии и Военно-Морского флота. Исполнилось 23 года существования нашей доблестной, непобедимой Красной Армии. Армии освободительницы, армии, которая не знала поражений, а всегда побеждала.

23 годовщину Красной Армии я еще провожу в этом году дома. Праздновали плохо. Не получилось погулять. В Самохваловичах ничего в клубе не было, потому что клуб холодный. Вообще, день этот прошел плохо. Надеюсь, что 24 годовщину я буду отмечать в рядах Красной Армии. Где, что и как я буду, это еще трудно предположить. Не в военном училище, так в полковой школе да придется этот день отметить хорошо. И вспомню я тогда все, что есть у меня теперь. Но все это еще впереди у меня, а теперь я должен воспользовать все то, что есть...

... 4 июня.

Подготавливаюсь к сдаче зачета по белорусской литературе. Учить особенно много нет чего, так как прошли всего в 10 классе четырёх белорусских писателей и поэтов. Охота спать. Вчера поздно лег — было 3 часа ночи. Была прекрасная лунная ночь. Долго с парнями и девчатами шлялся по местечку.

...17 июня.

12 часов дня. Иду в школу на собрание учеников 10 класса, посвященное окончанию учебного года. Сколько радости, сколько восторгов и волнений у юношей и девушек...

Прошел вечер замечательно. Надолго останется это в моей памяти. Потом пошли в клуб на танцы. Танцевали до утра. Как радостно, счастливо, прелестно прошел этот день и вечер. Долго, долго я этого не забуду.

18 июня.

Пришла повестка, в которой писалось явиться мне, Антону Шарейко и Мишу В. в военкомат для отправки в военное училище в Л-град. Поехали вместе. Никого в военкомате не нашлось. Пришлось ночевать. Вечером ходили в цирк.

21 июня.

В 7 часов подъем. Умываемся, одеемся и идём завтракать. Сдаем испытания, а затем проходим медкомиссию. Мы с Антоном прошли комиссию, а Миша провалился...

22 июня.

Уезжаем с Антоном домой. Сколько радости. Складываем план нашей гульни дома. Едем в вагоне, смеемся. Жалко, что нет Миши. Вдруг настроение пало. Услыхали неприятную весть на станции Пушкино: говорят, что Германия объявила войну Советскому Союзу. Сразу не верилось, но позже убедились, что это так.

Ожидаем, что нас вернут обратно, но все продолжаем ехать домой. Ночь эту не спалось — потрясающая весть не давала уснуть, сильно волновала.

23 июня.

До самого Минска не пришлось доехать. Наш поезд начал обстреливать неприятельский самолет. Пришлось сойти в лес, а потом идти пешком домой. К вечеру добрались. Сильно измучился. Все рады дома. Никто уже не ожидал нас. А Миша-то теперь, пожалуй, не приедет.

26 июня.

Война разгорелась. Минск подвергается ожесточенной бомбежке каждый день. Кругом пожары. Сидим дома всей семьей и дрожим. Вся местная власть удрала. Творятся кругом беспорядки. Жуткое настало время.

28 июня.

Ровно в три часа дня через наше местечко начали проходить немецкие мех. части для занятия гор. Минска. Только теперь я убедился, что Германия действительно сильная страна, что здесь действительно все механизировано. Нет ни одного германского солдата, чтобы шел пешком — все едут. И не случайно, что Красная Армия оказалась неспособной дать бой немцам. Пришел конец Советской власти, которая существовала немногим более 20 лет.

...2 июля.

Остатки Красной Армии все еще сопротивляются. Сегодня группа красноармейцев решила дать бой немцам в нашем м-ке. Но германские войска оказались много сильнейшими и разнесли в пух и прах красноармейскую часть. М-ко оказалось также пострадавшим — все сгорело. Остались считанные домы. Есть жертвы. Пришлось много перетерпеть страха.

...23 июля.

Не знаю, куда деваться от скуки. Хожу по квартире, чего-то ищу и сам не знаю — чего. Кое-что читаю. Прочитал «Дон Кихота» Сервантеса и «Вечера на хуторе близ Диканьки» Гоголя. Сегодня начал читать Короленко.

Что делается на фронте — ничего никто не знает. Все говорят по-разному, трудно чему-то верить. Хотел кое-как смастерить радио и послушать последние известия, так вышел указ, согласно которого лица, слушающие радио, будут подвергаться расстрелу. Газет никаких нет.

...31 июля.

Никогда не покорить немцам советский белорусский народ. Несмотря на то, что они употребляют разные меры наказания, как битье резиной, расстрел, повешенье и пр., наш советский народ уверен в победе большевиков, уверен в том, что немцам здесь не бывать никогда, никогда не управлять нашим народом. Белорусский народ не будет никогда рабом фашистских псов.

...1 октября.

Был впервые в Минске за время войны. Сильно поразили меня развалины такого красивого когда-то города. Не верится что это именно Минск стал такой грудой кирпича и пожариш. Но что поделаешь — война — это дело не шутейное.

Ездил в Минск, в районный отдел образования. Хотел устроиться учителем в нашу местную школу, но не удалось, так как теперь слишком много учителей безработных с высшим образованием. Не знаю, где найти мне какую службу. Надо было бы чем-либо заняться.

Казіміра Іосіфаўна і Фама Ігнатавіч ШПАКОЎСКІЯ з дзецьмі: Косцем (справа), Зіновіем, Браніславам (босы) і Разаліяй. Пачатак 30-х гадоў.

...16 октября.

Какая радость! — сегодня была у нас Валя, и я имел с ней небольшую беседу. Каков я счастлив и жизнерадостен, когда ее вижу, с ней разговариваю!

Но, к большому сожалению, долго не пришлось с ней поговорить, так как в местечке вдруг поднялась тревога, милиция с винтовками на поготове стала разгонять всех па домам. И Валя ушла домой...

Открылась в местечке стрельба, крики. Сразу не мог понять, что делается. Потом увидел, что ловят местечковых евреев, которые не хотят выезжать в Минск, а удирают из м-ка. Одного убили, а остальных всех собрали и угнали пешком в Минск. Все их имущество и дома конфискованы... Выставлен сильный караул. Время довольно тревожное... Каждую минуту можно подвергнуться опасности. Сегодня жив, а завтра можешь быть мёртв.

...2 ноября.

Воскресенье. Хотя время теперь довольно тревожное, но наша местечковая молодежь не дает себя в обиду и каждый выходной гуляет. Так вот и сегодня собрались парни и девушки, организовали танцы и хорошо погуляли.

Я не знаю, как кому, но мне что-то гуляется не особенно весело. Что-то тяжелое лежит на сердце с самого начала войны. Что-то чувствуется нехорошее. Гулять вовсе нет охоты, нет никакой веселости у меня. Но парни каждый раз вытянут меня и приходится с ними идти. Что еще впереди — не известно.

«І ЗНОЎ ПАЧАЎСЯ ДЗЕНЬ, ДЗЕНЬ СЛЁЗ І СТОГНУ...»

Дневник № 3 на 1942 год. Б. Шпаковского.

...17 января.

Каждый день неприятные новости. Везде творятся ужасные картины: убийства, смерть, болезнь, пожары... Встанешь утром и ждешь именно услышать что-либо новое, но плохое. Хорошего почти ничего. Наслушаешься таких новостей, и делается как-то плохо, плохо на сердце...

А то, что вижу сам — надолго остается в моей памяти и никак не выходит из головы.

А ночью — ужасные сны. Иногда вскрикиваю во сне от ужаса... И так вот идут дни за днями, пасмурные и серые. Не живешь, а гниешь. ..

...27 февраля.

Проснулся рано — вчерашняя новость дает себя знать (о мобилизации молодежи для работ в Германии. — «Зв.»). Лежал в кровати и мечтал о настоящем и будущем. Но нет. Сколько не старался я представить будущее, этого мне сделать не удавалось. Чтобы забыть все это, встал, оделся и вышел на двор. Сразу поглотил меня свежий, приятный воздух, воздух надходящей весны. Наклонился на забор и начал прислуховаться к этому утреннему спокойствию. Мысли поплыли одна за другой. Я поглощал свежий воздух и сердце мое билось спокойно... Мало-помалу улица начала оживать. Однообразная, скучная ежедневная жизнь начала входить в свою колею. И опять начался день, день слез и вздохов...

...11 марта.

Пришла в голову мне мысль: вести мой дневник с сегодняшнего дня на белорусском языке (на некоторое только время, чтобы не забыть своего родного белорусского языка).

І так, парашыў успомніць крыху беларускую мову, каб не забыць яе зусім. Праўда, пісаць буду такой мовай і такім правапісам, якія я вывучаў у школе. Да такога правапісу і такой беларускай мовы, якая пачала існаваць толькі цяпер, за прыходам немцаў, я яшчэ не прывык і рабіў бы даволі многа памылак.

...22 красавіка.

Хаця і жывём адарваныя ад усяго свету, але што-небудзь разумеем. І зусім добра разумеем тое, што немцы так стараная брэшуць аб сваіх перамогах, аб канчатковым разгроме Чырвонай Арміі. Брашыце, фашысты, але ваша пагібель немінуча.

...26 красавіка.

Зноў ня ведаў, што сёння дзень будзе для мяне шчаслівы. З раніцы было як і кожны выхадны дзень. Днём пайшоў у суседнюю вёску на вечарынку, дзе ўжо была ўся наша местачковая моладзь. Прыходжу і бачу дарагі для мяне вобраз Валі з сястрой сваёй Шурай. Сядзяць і гавораць з Розай. Замяшаўся крыху, але ўсё ж узяў сябе ў рамкі. Падышоў і пачаў здароваца. Сэрца, здаецца, білася з такою быстратою, што вось-вось выскачыць. ... І тут я быў шчаслівы без канца. Танцаваў з ёю як ніколі. Сядзеў з ёю і гаварыў, гаварыў...

(Працяг у наступным нумары.)

Грошы

СОРАС «ХАВАЕ» ЕЎРА?..

Скандальна вядомы інвестар заяўляе пра тое, што налета ў Еўропе непазбежная рэцэсія

Чалавек, які за адзін дзень зарабіў больш як мільярд долараў ЗША на рэзкім падзенні англійскага фунта ў 1992 годзе, і які ўжо неаднаразова рабіў гучныя заявы наконт лёсу валют, прадракае новы крызіс Еўропе. У прыватнасці, на семінары, які арганізаваў Цэнтр еўрапейскіх рэформаў, ён заявіў, што цяперашнія захады еўрапейскіх урадаў не толькі не выратуюць зону еўра, а, наадварот, ствараюць заганнае кола. Паводле слоў Сораса, Германія навязвае ўсім астатнім краінам свае стандарты і патрабуе бюджэтнай дысцыпліны падчас слабасці банкаўскай сістэмы, пры тым памылкай аб'яднанай Еўропы можа стаць адсутнасць механізму выхаду слабых дзяржаў з зоны: усё гэта, лічыць ён, можа сапраўды разбурыць Еўрасаюз.

Наколькі меркаваны сцэнарый скандальнага аналітыка мае шанцы збыцца, і ці сапраўды усё так кепска для еўра? — пра гэта мы запыталіся ў нашых экспертаў.

— Гэта пужалкі, — каментуе заяву Сораса **вядомы эксперт, загадчык кафедры Інстытута бізнэсу і менеджменту тэхналогій БДУ Георгій ГРЫЦ**. — Мы з вамі ўжо вялі гутарку пра тое, што такога не можа быць, таму што не можа быць. Еўропа з'яўляецца адным з глабальных рынкаў, які вызначае светагаспадарчы парадак, ён не можа абанкруціцца, прытым усе еўрапейскія краіны. Так, сапраўды, сёння ўзровень дзяржаўнага доўгу ў многіх еўрапейскіх краінах перавысіў парог у 40 працэнтаў валавога ўнутранага прадукту. Але гэта не значыць, што ў наступным годзе яны абанкруцяцца.

— Магчыма, робячы вышэйзгаданы прагноз, Сорас дзейнічае як спекулянт і разлічвае на атацы на еўра зарабіць?

— Ён не можа абваліць еўра, таму што апошняя заява нічым не абгрунтаваная. Проста хоча быць у цэнтры ўвагі на старасці гадоў. Ніякіх падстаў да такой заявы няма. Можна казаць аб праблемах асобных краін, у прыватнасці, Іспаніі, Партугаліі, Грэцыі, а не Еўрасаюза ў цэлым.

— На мой погляд, мэта ў Джорджа Сораса адна, каб курс еўра пайшоў уніз, і ён на гэтым зарабіць грошай, — мяркуе **эксперт нашай газеты, дэкан эканамічнага факультэта БДУ, прафесар Міхаіл КАВАЛЁЎ**. — Гэта як было калісьці з англійскім фунтам. Ён спрабуе сваімі заявамі паўплываць на рынкі. Я не бачу, каб сітуацыя ў Еўропе была настолькі безнадзейнай. Насамрэч еўрапейскія краіны вінаватыя грошы адзін аднаму, а не знешняму свету. І таму паміж сабой яны могуць проста зрабіць узаемазалік, і надзвычай вялікіх праблем няма. Так, ёсць Іспанія, ёсць Італія, у якіх знешні доўг вельмі вялікі. Але Іспанія ў даўгу ў Італіі, Італія — у Францыі і гэтак далей. Таму яшчэ раз падкрэслю, што Сорас неаднаразова рабіў радыкальныя заявы, але, як правіла, усе яны мелі адну мэту — паўплываць на тэндэнцыі рынкаў, каб зарабіць на гэтым грошы.

Ігар ШЧУЧЭНКА.

Афіцэры УКДБ — дзецям

ШКОЛЬНІКАМ ПАКАЗАЛІ РАБОТУ «ШЧАСЛІВЫХ»

Залу Гісторыі, Доблесці і Славы ўпраўлення КДБ па г. Мінску і Мінскай вобласці наведалі навучэнцы падшэфнай Ганцавіцкай сярэдняй школы імя Героя Савецкага Саюза П.Р. Лапаціна. Старшакласнікі агледзелі экспазіцыю музея, прысвечаную службоваму і баявому шляху сталічнай спецслужбы, азнаёміліся з узорамі зброі і абмундзіравання, спецсродкамі, узнагародамі, дакументамі і асабістымі рэчамі сталічных чэкістаў. Наведвальнікаў асабліва зацікавіла абноўленая экспазіцыя 1941-45 гадоў — узбраенне, фотаздымкі і бытавыя прадметы байцоў дыверсійна-разведвальных спецгруп НКУС-НКДБ БССР, многія з якіх — спецгрупы «Актыўныя», «Баявыя», «Паляўнічыя», «Першыя», «Рашучыя», «Сокалы», «Шчаслівыя», «Чацвёртыя» і інш. — дзейнічалі на Барысаўшчыне. Над школай, названай у гонар героя-чэкіста, камандзіра легендарнай партызанскай брыгады «Дзядзькі Міколы» Пятра Рыгоравіча Лапаціна, афіцэры сталічнага УКДБ узялі шэфства ў 2009 годзе. Цяперашні візіт адбыўся ў межах акцыі ўпраўлення «Афіцэры УКДБ — дзецям».

Святлана БАРЫСЕНКА.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ 29 ИЮНЯ 2010 ГОДА ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Минский городской центр недвижимости

по продаже права заключения договоров аренды (сроком на 5 лет) специфических сооружений, предоставляемых в аренду для размещения объектов сезонной мелкорозничной торговли плодоовощной продукцией и квасом в г. Минске

№ лота	Адрес специфического сооружения для размещения объекта сезонной мелкорозничной торговли плодоовощной продукцией	Арендуемая площадь, кв. м.	Начальная цена, тыс. руб.
	Ленинский район г. Минска, т. 223-81-41, 223-89-21		
1А.	ул. Белорусская, 17, место № 2	5	1000
2А.	ул. Плеханова, 53, место № 2	5	1000
3А.	ул. Сырокомли, 38, место № 2	5	1000
	Октябрьский район г. Минска, т. 224-49-95, 224-59-12		
4А.	ул. Березогорская, 8 (микрорайон «Сокол»)	5	1000
5А.	ул. Жуковского, 4 (остановка общественного транспорта), место № 1	5	1000
6А.	ул. Жуковского, 4 (остановка общественного транспорта), место № 2	5	1000
7А.	ул. Кижеватова, 72, место № 11	5	1000
8А.	ул. Ландера, 38	5	1000
	Первомайский район г. Минска, т. 280-54-65, 287-30-42		
9А.	ул. Волгоградская, 9, место № 2	5	1000
10А.	ул. Городецкая, 44	5	1000
11А.	ул. Карбышева, 46-48, место № 2	5	1000
12А.	ул. Платонова, 34-36, место № 2	5	1000
13А.	ул. Платонова, 34-36, место № 4	5	1000
14А.	ул. Седых, 66-68, место № 1	5	1000
15А.	ул. Филимонова, 45, место № 1	5	1000
16А.	ул. Я. Коласа, 48, место № 1	5	1000
17А.	ул. Я. Коласа, 48, место № 2	5	1000
18А.	ул. Я. Коласа, 48, место № 3	5	1000
	Советский район г. Минска, т. 292-81-80, 292-13-93		
19А.	бул. Мулявина, 6	5	1000
20А.	ул. Богдановича, 118	5	1000
21А.	ул. Богдановича, 62 (возле магазина «Матрешка»)	5	1000
22А.	ул. В. Хоружей, 20-22	5	1000
23А.	ул. Золотая Горка, 3	5	1000
24А.	ул. Кропоткина, 70	5	1000
25А.	ул. Л. Беды, 19, место № 2	5	1000
26А.	ул. Л. Беды, 29	5	1000
27А.	ул. Л. Беды, 8	5	1000
28А.	ул. Некрасова, 3	5	1000
29А.	ул. Некрасова, 4	5	1000
30А.	ул. Пугачевская, 1	5	1000
31А.	ул. Пугачевская, 2	5	1000
32А.	ул. Пугачевская, 9	5	1000
33А.	ул. Сурганова, 40	5	1000
	Центральный район г. Минска, т. 306-42-95		
34А.	ул. Кропоткина, 97а	5	1000
35А.	ул.М. Танка, 16, место № 5	5	1000
	Фрунзенский район г. Минска, т. 204-41-73, 204-31-06		
36А.	ул. Алеся Горуна, 8	5	1000

№ лота	Адрес специфического сооружения для размещения объекта сезонной мелкорозничной торговли квасом	Арендуемая площадь, кв. м.	Начальная цена, тыс. руб.
	Октябрьский район г. Минска, т. 224-49-95, 224-59-12		
37А.	ул. Барамзиной, 12 (микрорайон «Сокол»)	5	1000
	Московский район г. Минска, т. 200-97-69, 200-96-21		
38А.	парк по пр. газеты «Правда»	5	1000
	Советский район г. Минска, т. 292-81-80, 292-13-93		
39А.	Цнянское водохранилище, площадка № 1	5	1000
40А.	Цнянское водохранилище, площадка № 2	5	1000
41А.	Цнянское водохранилище, площадка № 3	5	1000
	Центральный район г. Минска, т. 306-42-95		
42А.	Набережная Комсомольского озера со стороны пер. Нововиленского (на аллее)	5	1000
43А.	ул. Карастояновой (троллейбусное депо)	5	1000

Организатор аукциона – УП «Минский городской центр недвижимости», г. Минск, ул. К. Маркса, 39.

Аукцион состоится 29 июня 2010 г. в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

Документы на участие принимаются с 21 по 25 июня 2010 г. в рабочее время, 28 июня 2010 г. с 9.00 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6. Документы, поданные после указанного времени, не рассматриваются.

Для осмотра объектов недвижимости, право заключения договоров аренды которых выставлено на аукцион, необходимо в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, обращаться к арендодателям по телефонам, указанным в данном извещении. Организатор аукциона рекомендует участникам аукциона при осмотре уточнить у арендодателя возможность использования помещения под планируемые виды деятельности, в том числе с учетом требований по санитарным и противопожарным нормам, а также соответствующий планируемому виду деятельности размер арендной платы.

Аукцион проводится в порядке, предусмотренном Инструкцией о порядке организации и проведения торгов по продаже права заключения договоров аренды зданий, сооружений и помещений, находящихся в коммунальной собственности г. Минска, утвержденной решением Мингорсовета от 23.09.2009 № 250.

Для участия в торгах лицо, желающее участвовать в торгах, в установленный в извещении о проведении торгов срок подает заявление на участие в торгах по установленной форме со следующими документами:

заявление об ознакомлении с объектом недвижимости, право заключения договора аренды которого выставлено на торги, по установленной форме;

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка в размере 10 процентов от начальной цены предмета аукциона на расчетный счет № 3012024570010, филиал ОАО «БПС-Банк» по Минской области, код 153001331, УНП 190398583 УП «Минский городской центр недвижимости»;

гражданином Республики Беларусь – копия документа, удостоверяющего личность, без нотариального засвидетельствования (страницы 31, 33 и страница с регистрацией места жительства (прописки));

индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

юридическим лицом Республики Беларусь – доверенность, выданная представителю юридического лица (за исключением случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), или документ, подтверждающий полномочия руководителя юридического лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

иностранным гражданином – копия документа, удостоверяющего личность, с переводом на белорусский или русский язык (подпись переводчика нотариально удостоверяется), документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной небанковской кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

представителем гражданина Республики Беларусь или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность;

представителем иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной небанковской кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в торгах граждане, индивидуальные предприниматели, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, руководители юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность.

При отсутствии у граждан, индивидуальных предпринимателей текущего (расчетного) счета, он должен быть открыт в учреждении банка до подачи заявления на участие в торгах и указан в соответствующем заявлении.

Ответственность за достоверность сведений, указанных в документах, представляемых для участия в торгах, несут лица, желающие участвовать в торгах.

К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, соответствующее заявление с приложением необходимых документов, внесшие в установленном порядке задаток и заключившие соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе организации и проведения торгов по установленной форме.

Оплата за право заключения договора аренды осуществляется победителем аукциона разовым платежом в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона. Договор аренды с победителем аукциона заключается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Победитель аукциона в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона обязан возместить УП «Минский городской центр недвижимости» затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. Информация о затратах, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников перед началом торгов под роспись.

В соответствии с Инструкцией о порядке сдачи в аренду капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, их частей, находящихся в коммунальной собственности г.Минска, утвержденной решением Мингорсовета от 16.12.2009 № 271, договор аренды недвижимого имущества с победителем аукциона заключается на основании решения Мингорисполкома о сдаче в аренду этого имущества в срок в соответствии с законодательством.

По объектам недвижимого имущества, право заключения договора аренды которых продано на аукционе, арендодатель оформляет в комиссию Мингорисполкома по упорядочению использования зданий, сооружений и помещений, находящихся в государственной собственности, заявление с просьбой согласовать сдачу недвижимого имущества в аренду и условия договора аренды. Заявление должно быть подписано арендодателем и победителем аукциона, а по объектам, находящимся в хозяйственном ведении ЖРЭО администраций районов г. Минска, согласовано с администрацией района г. Минска, на территории которого расположено недвижимое имущество.

По объектам недвижимого имущества, право аренды которых продано на аукционе, арендодатель вправе до получения соответствующего решения Мингорисполкома заключить договор аренды в соответствии с законодательством на срок до 2 месяцев с тем субъектом хозяйствования, в отношении которого им направлено заявление о согласовании сдачи в аренду недвижимого имущества.

Телефон для справок (017) 227 40 22. Интернет: www.mgcn.by.

ЖЖ Броніка Шпакоўскага

Я чытала дзённік Броніся (так называлі яго аднакласнікі) не адрываючыся, забыўшыся на іспыты. У 1941 г. яму было 19, як мне цяпер. Я чытала яго як мастацкі твор, пагружалася ў час, у яго стасункі з людзьмі. Ён уцякаў ад кандуктара, гуляў, як я, з асалодай па ранішнім Мінску.

Вельмі блізкім мне было тое, што Бронісь у сакавіку 42 г. раптам вырашыў перайсці на беларускую мову — «каб не забывацца».

Вельмі міла мне было і ў яго рускамоўным тэксце знаходзіць характэрныя для беларускай мовы словы і канчаткі: «идем по городЕ», «с МишАМ», «покрЫвился», «и бывает РАПТОМ бух в снег!», «надыход», «испыт» і іншыя. А свае Самахвалавічы ён называў «местечко» («мястэчка»).

Здзівілі Бронікавы стасункі з дзяўчынкамі: няўжо хлопцы такія ж плеткары, як мы?! Падаецца, мы з дзеўкамі столькі не гаворым «о любві», колькі яны з аднакашнікамі. А якія «салёныя» (слова з дзённіка) пісалі адно аднаму запіскі ў класе! Стараліся «звастрыць», паказаць сваю дасціпнасць. У адказ на гуллівыя запіскі Зіны Л. Бронік напісаў: «Ты сидишь там сзади и шаришь по класе своими глазищами, как старенький прожектор, заброшенный в угол и никому не нужен...» На гэта Броніна прыхільніца Зіна абазвала яго «рыжым артистом», «хотя я, слава богу, — зазначае Бронік, — никогда не был и теперь не есть рыжым!» (Якая гэта каштоўная гістарычная крыніца — унутрыкласная перапіска ў часе заняткаў!)

Вельмі закранула жыццёвасцю фраза з дзённіка пра 8 сакавіка 1940 г.: «Хотя мы и мужчины, но также решили маленько подкутить. С ребятами сложились и немножко ДРИЗНУЛИ. Некоторые едва шли». (Што за слова-та такое рэдкае?!)

Стыль напісання ўскладняецца. Напачатку 1940-га гэта нясмелыя кароткія запісы, кшталту «нічога значнага не адбываецца, не ведаю, пра што пісаць». Але ўжо ў 1941-м хлопец выспявае, дараслее, вобраз мыслення яго ўскладняецца — ускладняецца і стыль.

Гэта звязана і з падзеямі ў жыцці. Жыццё дзевяцікласніка ў 1940 г. амаль бесклапотнае. Ён увесь час заняты роздумамі — трошкі аб вучобе, а збольшага пра каханне, драмгурток, рэдагаванне сценгазеты, шматлікія прачытаныя кніжкі, паходы ў кіно. Ён шмат малюе. Бацька нават адправіў сына паступаць у віцебскі мастацкі тэхнікум пасля 7 класа, але «очень много было поступающих и меня отчислили. После этого пало настроение к рисованию... Но всё же когда-нибудь появится бывает охота что-либо нарисовать и я рисую. Что раз получается всё лучше». Такі актыўны, артыстычны гэта быў хлопец. А менавіта ў 1941-м яго насцігаюць першыя праблемы і беды. Брат Зіновій, што жыве ў горадзе, за бацькоўскія грошы збудаваў сабе домды ўзяў да сябе бацькоў і малодшую сястру Разалію. (Бронік у гэты час жыў са старэйшым братам Косцем у Самахвалавічах.) А потым Зіновій стаў хаміць бацькам, паказваць сваю значнасць для іх, папракаць іх за рашэнне адправіць Розу і Броніся вучыцца, а не на працу. Усё гэта расказаў Броніку бацька. Глыбінная крыўда на брата ясна праступае праз старонкі дзённіка, хлопец з горыччу піша, што ніколі яму не даруе здзекаў з бацькоў, і, калі падараслее, абавязкова забярэ маму з татам да сябе.

Хутка здарыліся іншыя няшчасці. Спачатку меркаваная здрада любай Валі (быццам гуляла з нейкім вайскоўцам) не давала Броніку ні пра што думаць.

Потым была смерць — мажліва першая такая трагічная ў яго жыцці (а што будзе праз год...) Ад сухотаў памерла дзевяцікласніца Тамара — «у 17 годоў ... калі трэба толькі весяліцца». Усе школьнікі па чарзе неслі варту каля яе труны. З захапленнем апісвае Бронік, як, ужо цяжка хворая, дзяўчынка цешылася кожнаму дню, якая была вясёлая і жыццерадасная.

Запісы — пра радасці, бядоты, каханні, пра старанне «ліквідаваць» двойкі, пра выбар між «самапомаччу» ды партызанкай, і стыль, і граматыч

Краіна здароўя

Выпуск № 26 (195)

СЯСТРЫНСКАЯ ЦЕПЛЫНЯ

Старшая медсястра аддзялення функцыянальнай дыягностыкі Наталля ЛАДУЦЬКА трымае ў руках узнагароды пераможцаў прэміі «Медыцынскі Алімп-2010».

Як расказаў Юрый Ладуцька, зусім хутка бальніца папоўніцца яшчэ адным корпусам, праектаванне якога якраз заканчваецца.

— Новы комплекс будзе разлічаны на кансультацыйную паліклініку на 800 прыёмаў у змену. Кансультацыі будуць ажыццяўляцца па 38 спецыяльнасцях. Там будуць працаваць лабараторны аддзел клініка-дыягнастычнай лабараторыі, кардыяхірургічнае аддзяленне і два кардыялагічныя аддзяленні. Кардыялагічны цэнтр будзе забяспечаны аддзяленнямі хірургічнага і тэрапеўтычнага профілю. У гэтым жа праекце — цэнтральнае рэгістрацыйнае аддзяленне, канферэнц-зала на 450 месцаў і кіслародная падстанцыя. Будаўніцтва распачнецца з новага года, тэрмін — два-тры гады.

* * *

Пра свае мары Святлана, Ала і Людміла сціпла прызнаюцца: у нас ужо такі ўзрост, што мы ўсяго дасягнулі. «Вырасцілі дзяцей, вывучылі іх, цяпер застаецца толькі радавацца і жадаць людзям, каб яны паменш хварэлі. Пабольш усмешак, пабольш дабрыні і радасці — тады людзі хварэць не будуць. Калі ты нясеш дабро людзям, то абавязкова атрымліваеш аддачу дабром».

І гледзячы на жанчын, разумееш, што ў іх словах — праўда. Шчырасць, дабрыня і любоў. Кіруючыся гэтымі прынцыпамі, кабеты працуюць з дня ў дзень. І ў гэтым іх моц.

— Здароўя і толькі здароўя, — віншуюць з прафесійным святам усіх медыцынскіх работнікаў Беларусі жанчыны. — І няхай прыязджаюць лепш аздараўляцца, чым лячыцца!

Ілья ЛАПАТО. Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.



Загадчык рэнтгеналагічнага аддзялення Анатоль ЛОЙ — таленавіты спявак і вядучы.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

У кожнай з сясцёр быў свой шлях у медыцыну. Але жанчыны ўпэўненыя, што з выбарам жыццёвай дарогі не памыліліся. Пра гэта не ў меншай ступені сведчыць стаж работы сясцёр. Святлана Лішык у Мінскай абласной клінічнай бальніцы адпрацавала 10 гадоў, Ала Баярэвіч — 35, а Людміла Мельнікава ў медыцыне амаль 40 гадоў.

— Вынік нашага жыцця — гэта нашы дзеці, — кажа Ала Баярэвіч. — І калі мы задаволеныя, кім сталі нашы дзеці, значыць мы жыццё пражылі недарма. І ў бальніцы прапрацавалі недарма. Цудоўны калектыў, пачынаючы з галоўных кіраўнікоў і заканчваючы простымі санітаркамі, з якімі працуем. Гэта, відаць, і ёсць шчасце — няхай так будзе і надалей.

Уручэнне прэміі «Медыцынскі Алімп» прайшло пры поўнай зале: урачы, медсёстры, сёстры-гаспадыні... Лепшых супрацоўнікаў вызначылі ў 12 намінацыях. Усе намінанты атрымалі ганаровыя граматы і кветкі. З новага боку паказалі сябе і медыкі, даказаўшы, што могуць не толькі лячыць людзей, але і нядрэнна спяваць і танцаваць.

— У нашай бальніцы каля 1500 супрацоўнікаў, — кажа **галоўны ўрач Мінскай ордэна Чырвонага сцяга абласной клінічнай бальніцы Юрый ЛАДУЦЬКА**. — Мы ганарымся гэтымі людзьмі, бо дзякуючы іх прафесіяналізму і дабрыні, мы маем сёння такую бальніцу. Выконваючы сваё прызванне, яны праводзяць на працы дзве трэці свайго жыцця. Дзякуем вам за ахвярнасць!

КРЫК ЦВЯРОЗАЙ ДУШЫ

Прысвячаю ніжэйнапісанае хлопцам, якія ледзь не збілі мяне на прыступках крамы, адкуль выляталі з бутэлькамі наперавес. І асабліва — таму маладому чалавеку, які выбег апошнім са словамі: «Пацаны, одноразовой посуды нет! Будем, по ходу, из горла!».

...Мінск. Зялёны Луг. Тралейбус № 53. На гэтым рэйсе абавязкова сустрэнеш сіне-чырвоны твар. Вучуся не асуджаць гэтыя... твары. Працэс даецца цяжка. Я пакутую... «Твары» таксама. Толькі я — ад таго, што не магу іх прывесці ў належны выгляд, уладкаваць на працу і вярнуць да цвярозасці, а яны — ад таго, што не дачакаюцца, калі здадуць бутэлькі пустыя і купяць напоўненыя, салодкае змесціва якіх прыемна разальецца па перыферыі цялеснай...

...Райцэнтр. Вяселле. Або памінкі. За сталом — людзі. Знаёмыя і незнаёмыя. Па некаторых тварах я бачу, хто ад чаго пакутуе... У Зоі Вячаславаўны — сэрца, у Фёдара Андрэевіча — цукровы дыябет, у Антона Барысавіча — аперацыя была, у Аляксея — ныркі, Сцяпан — алкаголік, Таня — цяжарная, Юрку — проста 5 гадоў... І для ўсёй «честной компании» знаходзіцца аргумент, каб яны асушылі «да дна» ці хоць бы прыгубілі. А то... гаспадар ці гаспадыня пакрыўдзіцца!..

Уладзімір ІВАНОЎ, загадчык 21-га рэабілітацыйнага наркалагічнага аддзялення Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра псіхічнага здароўя:

— Фізічная залежнасць можа апярэджваць псіхалагічную ў выпадку ўжывання, хіба, наркотыкаў. Такі моцны наркотык, як гераін, здольны выклікаць фізічную залежнасць літаральна праз 2-3 ін'екцыі. Што да алкаголю, то перш за ўсё развіваецца залежнасць псіхалагічная. У здаровага, без наркалагічнай залежнасці, чалавека словы «гарэлка», «какаін» не выклікаюць ніякай эмацыйнай рэакцыі. Аднак у залежных людзей нават сімвалічная выява наркотыку ці алкагольнага напою выклікае асаблівы стан. Падчас спецыяльных даследаванняў у галаўным мозгу пітушных людзей былі выяўлены пэўныя змены. Нармальны чалавек не можа радавацца факту выпіўкі. Алкаголік жа перажывае эмацыйны ўздым, калі рыхтуецца да адпаведнай падзеі, і наадварот, адчувае азлабленне, раздражненне, агрэсію пры недаступнасці алкаголю. Яшчэ залежныя вельмі не любяць, калі незалежныя паказваюць ім на іх «слабасць». Гэты «тэст» з'яўляецца практычна абсалютным з пункту вызначэння псіхалагічнай залежнасці ў канкрэтнага чалавека.

Наш мозг сам здольны выпрацоўваць марфінападобныя рэчывы. За пачуццё задавальнення, як вядома, адказваюць пэўныя зоны галаўнога мозга. Алкаголь стымулюе і пашырае гэтыя зоны. У рэшце рэшт узнікае дыспрапорцыя паміж тым, што можа выпрацоўваць мозг у выніку доўгага сэксу, ежы, прагулкі, гутаркі і г.д., і штучнай стымуляцыяй згаданых зон. Пры адсутнасці такой стымуляцыі чалавек будзе адчуваць вельмі яркі «голад».

Я не веру, што ёсць людзі, не здольныя атрымаць задавальненне ад звычайнага жыцця. Фізічна і псіхічна здаровы чалавек абавязкова павінен атрымліваць задавальненне ад жыцця як яно ёсць! Іншая рэч, ёсць дэфекты выхавання або знаходжанне ў групе, дзе ўжываюць рэчывы-допінгі. Як правіла, месца мае псіхалагічная няспеласць асобы, адсутнасць умення адэкватна рэагаваць на любыя цяжкасці, няўменне кантактаваць з людзьмі. У цэлым жа алкагалізм — гэта яшчэ праблема нізкай культуры, адсутнасці ведаў пра тое, як трэба паводзіць сябе з алкаголем, дый проста элементарнае глупства. З іншага боку, ёсць яшчэ і сквапнасць вытворцаў таго ж алкаголю. Наркотыкі, напрыклад, з'явіліся ў нашай краіне толькі тады, калі ў насельніцтва з'явіліся долары. Бессэнсоўна было вазіць на нашу тэрыторыю гераін і прадаваць яго тут за рублі. Алкаголь і тытунь таксама нехта прадае з мэтай атрымання прыбытку...

АКСАНА, алкаголік:

— Мне 36 гадоў. Тэрмін залежнасці — не менш як 10 гадоў. Выпіваць пачала гадоў з 17... Бармыкі-рэстаранчыкі... Потым была непрыемная гісторыя... У 2006 годзе трапіла з пераломам сцягна ў бальніцу. Я была не замужам... Не хадзіла... А тут яшчэ маці памірае... І дачку забралі ў інтэрнат. Потым з грамадзянскім «мужам» пачаліся праблемы... Ён таксама выпіваў.

Піла я з дзвюх прычын: з радасці і з гора. Пра залежнасць ніколі не думала... Пакуль аднойчы не адчула, што проста фізічна не магу ўстаць і пайсці на працу. Здароўе было падарвана так, што не перадаць... Самі мы з «мужам» — гродзенскія, а ягоная цётка жыве ў Мінску... Яна і сказала, каб ехалі лячыцца ў гэты цэнтр...

ПЁТР, алкаголік:

— Мне 50 гадоў. «Стаж» — не менш як 22 гады. Піць я пачаў як і ўсе тут — з дзяцінства, але з 28 пайшлі ўжо запоі. З 42 гадоў быў перапынак... І, як бачыце, ён скончыўся... Алкаголікі, калі кідаюць піць, надта апантана бяруцца за якую-небудзь справу. І што характэрна, многае атрымліваецца. Так было і са мной... Год за годам ты адчуваеш сябе надта ўпэўнена, і аднойчы, што называецца, губляеш нюх... Я і цяпер не заракаюся, што пасля выпіскі ўжо ніколі не вып'ю...

Абедзве дачкі мяне, вядома, асуджалі, а за што мяне хваліць? З жонкай мы перасталі жыць, калі я якраз быў цвярозым, проста мы адчулі нейкае ахалоджванне адносінаў... Але мы і цяпер разам вырашаем усе побытавыя задачы... Упэўнены: калі нешта рабіць, то толькі для сябе, не для іншых...

Разумееце, для атрымання любых іншых задавальненняў патрабуецца вялікая затратная частка — грошы, эмоцыі. А алкаголь — самы даступны сродак задавальнення. Танны, дый прайсці трэба літаральна некалькі метраў... Праблема ў тым, што я пастаянна хачу ўзмацніць маё задавальненне. Як для таго, хто ў прынцыпе хацеў бы кінуць піць, так і для таго, хто не хацеў бы рабіць гэтага, аднойчы наступае момант, калі гарэлка ўжо не лезе... І вось тут ты бяжыш па дапамогу...

МІХАІЛ, алкаголік:

— Мне 46 гадоў. П'ю 25 гадоў. Я не памятаю, калі і як здарылася, што я стаў залежным... Адно магу сказаць дакладна: мне, як алкаголіку, было абсалютна ўсё роўна, што выпіць, калі я хацеў выпіць... Ведаеце пра мару любога алкаголіка — выпіваць у меру? Гэта вялікая ілюзія абрывала лячэнне не аднаго залежнага...

Уладзімір ІВАНОЎ:

— Угаворваць залежных лячыцца, безумоўна, трэба. Хоць кожны залежны будзе працягваць злоўжываць, пакуль не сутыкнецца з вялікімі цяжкасцямі. Жаданне прымаць рэчыва, якое адурманьвае, настолькі моцнае, што перакрывае ўсе іншыя непрыемнасці, цесным чынам з гэтым звязаныя. Так што павінна здарыцца нешта зусім экстраардынарнае для залежнага чалавека, каб ён звярнуўся па дапамогу. Сваякі са свайго боку павінны спрабаваць фарсіраваць падзеі, каб залежны як мага хутчэй адчуў той боль, які дапаможа пачаць лячэнне...

Хворыя на алкагалізм — розныя людзі. Розныя людзі патрабуюць розных падыходаў. Ёсць, напрыклад, тыя, хто мае патрэбу ў прымусовым знаходжанні ў лячэбна-працоўным прафілакторыі. Ёсць тыя, хто мае патрэбу ў спецыяльных праграмах — своеасаблівым альянсе праграмы «12 крокаў» і навуковага — псіхалагічнага і медыцынскага — падыходу. Такі альянс, дарэчы, вельмі моцны па сваім уздзеянні, аднак, зноў жа, толькі ў дачыненні да некаторых алкаголікаў, хоць агульны станоўчы эфект будзе назірацца ў любым выпадку. Атрыманыя веды пазітыўна ўздзейнічаюць не толькі на саміх алкаголікаў, але і на іх сем'і, на акружэнне ў цэлым. Праграма ў пэўнай ступені мяняе характар, паводзіны алкаголіка, навучае яго правільным адносінам з іншымі людзьмі...

АКСАНА:

— Я першы раз на лячэнні... І спадзяюся, апошні. Ляжала 1,5 месяца... Дзякуючы групе ананімных алкаголікаў, якая працуе ў цэнтры, шмат пра што даведалася. Я гатова пастарацца жыць інакш... Мы тут з «мужам» для падстрахоўкі «падшыліся». Зразумела, чалавек сам павінен захацець жыць цвяроза, але дапамога спецыялістаў вельмі многа дае.

ПЁТР:

— Калі я завязаў першы раз, быў вельмі расстроены, што ніхто мяне не хваліў... Алкаголікаў лічаць у грамадстве ізгоямі, але я асабіста высока іх цаню... Па сутнасці, яны валодаюць нейкімі спецыфічнымі ведамі. Алкаголік — гэта і сіла волі, і характар... Чаго варты толькі выхад з запою, ломка... Гэта вельмі цяжка... Да сямігадовага перапынку я зрабіў у Навінкі ходак васямнаццаць. Здымаў ломку. Я і цяпер тут, каб зняць ломку... Іншая рэч, знялі табе дзён за пяць-сем гэту ломку, а далей ты... — казёл... Мяне гэта раздражняла, хоць я разумею, што па вялікім рахунку навакольным наплываць на мяне, дый мне, прызнацца, на іх — таксама...

Алкаголікі не маюць патрэбы ў шкадаванні, а вось такія цэнтры неабходныя... І калі ўжо гаварыць, што мы павінны лячыцца за свой кошт, то, напэўна, трэба гаварыць і пра тое, што курс лячэння не можа каштаваць больш за 1 мільён рублёў пры сярэднім заробку хворых у 600 тысяч...

Звяртаўся я і да царквы, і ведаю, хто такія Ананімныя Алкаголікі. Думаю, паўплываць на такіх, як я, можна, хіба, з дапамогай псіхалогіі і пэўных грамадскіх арганізацый.

МІХАІЛ:

— Я ляжу першы раз... Амаль месяц. Згодна з праграмай Ананімных Алкаголікаў, перш-наперш трэба прызнаць сваё бяссілле перад хваробай... Хваробай, дарэчы, масавай... Азірніцеся, паўкраіны п'е! Вось вы, напрыклад, ужываеце алкаголь раз на тыдні? А раз у месяц?.. Тады даруйце... Вы — сапраўды не алкаголік...

Уладзімір ІВАНОЎ:

— У 1987 годзе, у разгар супрацьалкагольнай кампаніі, якую ў народзе празвалі «сухім законам», я стаў галоўным нарколагам Беларусі. «Сухога закону» тады, безумоўна, не было, а было рэзкае абмежаванне аб'ёмаў вытворчасці і продажу спіртных напояў. У 1986—88 гадах, калі праводзілася згаданая кампанія, захваральнасць на алкагольныя псіхозы ўпала ў 4 разы, а смяротнасць ад ужывання алкаголю знізілася ўдвая. Гэтыя факты — абсалютныя, таму вельмі паказальныя. Тым не менш некаторыя спяшаюцца сцвярджаць, што ад кампаніі не было ніякай карысці, маўляў, усе рэзка пачалі піць самагон. Гэта няпраўда! Самагон — таксама моцны алкагольны напой, і калі б яго тады масава ўжывалі, то былі б і псіхозы, і гібель... Нас папракалі яшчэ і тым, што з-за абмежавання доступу да алкаголю людзі пачалі ўжываць наркотыкі. І гэта няпраўда! Наркаманія прыйшла да нас на пачатку 90-х, калі ў насельніцтва з'явіўся долар. Да таго моманту мы рэгістравалі па краіне адзінкавыя выпадкі!

Праводзіць тую «паўсухую» кампанію трэба было паступова. Умоўна кажучы, 50-працэнтнага скарачэння выпуску алкаголю можна дабівацца не за 2-3, а за 20-25 гадоў, каб прадпрыемствы павольна ажыццяўлялі пераход на выпуск іншай прадукцыі...

Ёсць усяго два фактары, якія ўплываюць на ўзровень спажывання алкаголю і на звязаныя з ім наступствы: удзельны кошык алкаголю ў прадуктовым кошыку і тэрытарыяльная даступнасць. Рэгуляваць усе наступствы алкагалізацыі насельніцтва можна з дапамогай толькі гэтых двух момантаў! Чым больш танны алкаголь у адносінах да асноўных прадуктаў харчавання, тым больш яго ўжываюць. Чым бліжэй да дома размешчана ўстанова, якая гандлюе алкаголем, тым больш яго ўжываюць.

За савецкім часам бутэлька гарэлкі каштавала 2 руб. 87 кап. Гэта было ў 20 разоў даражэй за бохан чорнага хлеба, у 15 разоў даражэй за белы хлеб і амаль ў 2 разы даражэй за 1 кг курыцы. Яшчэ ніколі алкаголь не быў такім танным, як на працягу апошніх 15 гадоў.

У Нарвегіі адзін гандлёвы пункт, дзе можна набыць алкаголь, прыпадае на 30 тыс. жыхароў, у Швецыі — на 23 тыс., Расіі — на 300-500, у Беларусі — на 120! Гэта проста татальнае набліжэнне алкаголю да насельніцтва!

Усе іншыя захады па барацьбе дзяржавы з алкагалізацыяй насельніцтва — гэта ўжо варыяцыі на тэму. Скажам, Швецыя заахвочвае алкагольныя кампаніі на адлічэнні пэўнага працэнта для ажыццяўлення антыалкагольных кампаній. Нарколагі Беларусі неаднойчы гаварылі пра тое, што беларускія вытворцы алкаголю таксама павінны заахвочвацца да такіх адлічэнняў... Дарэчы, са студзеня ў краіне фарміруецца антыалкагольная праграма, у якой галоўнай фігурай з'яўляецца... Міністэрства аховы здароўя. Але якое дачыненне ахова здароўя мае да вырабу і гандлю алкаголем?

АКСАНА:

— Алкаголік выпівае, пахмяляецца для таго, каб жыць, каб адарваць галаву ад падушкі, пайсці на тую ж працу. Пакуль не выпіў, ён не дыхае, не думае, яму ўсё баліць... Не дай Бог! Алкагалізм — вельмі цяжкая хвароба...

Пасля выпіскі, думаю, мне аддадуць дачку, ёй спаўняецца гэтымі днямі 10 гадоў... Пайду ў адпачынак, зраблю рамонт...

ПЁТР:

— Жудасна тое, што ёсць алкаголікі, якім... 20 гадоў! Раней такога не было... Радуе толькі тое, што хлопцы прызнаюць сваю залежнасць. Але адначасова яны ўсведамляюць, што іх спойваюць... Дзяржава павінна паклапаціцца пра тое, каб на тэлебачанні пастаянна круцілі жудасныя ролікі аб алкагалізме, падрабязна расказвалі, як алкаголь адбірае здароўе. Такая інфармацыя павінна быць навязлівай, гвалтоўнай, каб народ разлавайся, запсіхаваў... Трэба зрабіць гэта дзеля падлеткаў, дзяцей.

МІХАІЛ:

— Чаму дзяржава не зацікаўлена ў тым, каб яе грамадзяне былі цвярозымі?.. За мяжой таксама ёсць праблема злоўжывання алкаголем. Але ў нас курэнне і п'янства, лічу, насаджаюцца... Гэта і алкаголіку зразумела...

Святлана БАРЫСЕНКА.

Выбіраем кантактныя лінзы

Прыміце да ведама



Кантактныя лінзы сталі ўжо неад'емнай часткай жыцця тых, у каго зрок недацягвае да нормы. Лінзы выконваюць усе функцыі акуляраў і ў той жа час абсалютна непрыкметныя. Аднак час не стаіць на месцы. Калі раней выбар лінзаў быў невялікі, то сёння прылаўкі салонаў карэкцыі зроку ўсё больш нагадваюць перапоўненыя паліцы супермаркета. У такіх умовах чалавек, які прывык да сваіх старых лінзаў, бянтэжыцца: што гэта такое новае прапануюць, і ці варта яго мяняць на праверaны часам сродак? Як жа разабрацца ў свеце сучасных лінзаў?

На прыёме ва ўрача. Калі няправільна падабраць лінзу, яна можа ціснуць, рэзаць, вельмі свабодна перамяшчацца па рагавіцы пры змене становішча вачэй («плаваць»), выклікаць стомленасць. Каб такіх праблем не ўзнікала, трэба прайсці абавязковае абследаванне ў афтальмолага. Яно не зойме шмат часу: на ўсё ідзе каля 10 хвілін. Калі пацыент яго праходзіць, тып лінзы можна падабраць максімальна ідэальна. Таксама толькі афтальмолаг зможа падабраць такія параметры, як сіла лінзы і яе дыяметр: самастойна гэтага рабіць нельга. Калі няправільна падабраць дыяметр — «паўсферкі» будуць спадаць, калі сілу лінзы — вочы будуць стамляцца, і можа пагоршыцца зрок.

Жорсткія і мяккія. Такія параметры, як жорсткасць і мяккасць лінзы, можна ўжо выбіраць на свой густ. Жорсткія лінзы — нягнуткія, цвёрдыя, з іх дапамогай можна не толькі нармальна бачыць, але і атрымаць лячэбна-прафілактычны эфект пры такіх праблемах як блізарукасць, дальназоркасць, астыгматызм. Таксама жорсткія лінзы могуць не толькі перашкаджаць прагрэсаванню пагаршэння зроку, але і паляпшаць апошні. Праўда, не цалкам, а часткова — максімум на пару дыёптрый. Мяккія лінзы, у адрозненне ад жорсткіх, больш камфортна адчуваюцца на воку, але лячэбна-прафілактычны эфект у іх меншы.

Вільготныя і сухія. Вы можаце адчуваць сябе адносна камфортна, носячы адзін і той жа від лінзаў, аднак усё пазнаецца ў параўнанні. Нават сярод камфортных лінзаў адны носяцца лепш, другія — горш. Напрыклад, у адных лінзах чалавек перыядычна будзе адчуваць перасыханне вачэй, у другіх — не. У адных вочы будуць стамляцца менш, у другіх — больш. Як правіла, гэта звязана з гідрафільнасцю лінзы (здольнасцю ўтрымліваць вільгаць). Чым больш у лінзе вады, тым лепш яна прапускае кісларод. Чым менш — тым горш «дыхае» вока, тым больш яно перасыхае і стамляецца. Ступень гідрафільнасці можна вызначыць самому, уважліва прачытаўшы, што напісана на ўпакоўцы. Яна пазначаецца ў працэнтах і можа быць ад 38 % — нізкая гідрафільнасць (такая лінза «дыхае» слабей за астатнія) да 73 % — самая высокая (такая лінза «дыхае» добра). Яшчэ адзін плюс «вільготных» лінзаў — тое, што іх, у адрозненне ад астатніх лінзаў, якія трэба штодзень знімаць на ноч, можна працяглы час — да 30 дзён — насіць не знімаючы. Тым людзям, каму цяжка самастойна надзець «накладкі», гэта варта ўлічыць.

Тэрмін нашэння. Акрамя ступені гідрафільнасці, трэба вызначыць для сябе, якія па бесперапыннасці нашэння лінзы вам патрэбныя. Зноў жа, калі вы хочаце максімальнага камфорту, выбірайце аднадзённыя лінзы. Яны тонкія і практычна неадчувальныя для вока. Плюс — не патрэбен раствор для захоўвання лінзаў. Такія лінзы можна параіць тым, каму яны патрэбны не штодзень, а зрэдку, напрыклад, падчас заняткаў спортам. Калі вы хочаце эканоміць, бярыце лінзы, разлічаныя на паўгода—год. Іх патрэбна рэгулярна даглядаць: некалькі разоў у месяц іх трэба ачышчаць ад налёту пры дапамозе спецыяльных таблетак. Калі гэтага не рабіць, лінза пачне страчваць празрыстасць, форму і будзе «муляць». Можна выбраць кампрамісны варыянт — лінзы на месяц. За гэты час яны не паспяваюць моцна сапсавацца, таму чысціць іх не абавязкова.

Змяніць колер вачэй. Лінзы бываюць не толькі празрыстыя, але і каляровыя, і нават з малюнкамі (напрыклад, кацінага вока). Многія думаюць, што гэта толькі даніна модзе, але гэта не зусім так. Пры некаторых хваробах каляровыя «накладкі» аказваюць яшчэ і лекавы эфект. Напрыклад, калі вочы чалавека не пераносяць сонечныя прамяні, яркае сонца выклікае слёзацячэнне і галаўны боль, то праблему вырашаць каляровыя кантактныя лінзы, якія паглынаюць ультрафіялет (звычайным такое не пад сілу). Акрамя таго, гэта можа вырашыць касметыка-псіхалагічныя праблемы ў пацыентаў з бяльмом, дэфектамі афарбоўкі радужкі. А ва ўсім астатнім каляровыя лінзы нічым не адрозніваюцца ад звычайных.

КАРЫСНЫЯ ПАРАДЫ

- Мыйце рукі з мылам і добра выцірайце іх перад тым, як надзяваць лінзы.
- Калі вы носіце лінзы ў звычайным рэжыме, мяняйце раствор ў кантэйнеры кожны дзень; калі ж вы доўга не носіце лінзы, не забывайце мяняць раствор у кантэйнеры не радзей за раз у месяц: калі гэтага не рабіць, лінза можа страціць форму і ўласцівасці.
- Не спалосквайце лінзы водаправоднай вадой — у ёй могуць утрымлівацца хваробатворныя мікраарганізмы.
- Перад тым як закапваць якімі-небудзь кроплямі вочы, вывучыце інструкцыю, ці можна гэта рабіць пры надзетых лінзах: некаторыя лекі могуць сапсаваць «накладкі», таму на час закапвання лінзы трэба знімаць.
- Калі вы носіце лінзы з працяглым тэрмінам карыстання, раз у тры месяцы ачышчайце іх пры дапамозе спецыяльных таблетак: за гэты час на паверхні «накладак» назапашваюцца бялковыя адкладанні, якія робяць нашэнне менш камфортным.
- Знімайце лінзы ва ўсіх выпадках, калі вада можа патрапіць вам на твар (падчас душа, купання і да т.п.).
- Не насіце лінзы даўжэй за тэрмін, на які яны разлічаны, — гэта можа прывесці да неаваскулярызацыі рагавіцы — прарастанні праз яе сасудаў. Рэч у тым, што лінза, якая перажыла свой тэрмін службы, дрэнна прапускае кісларод, і рагавіца пад ёй пачынае пакутаваць ад недахопу кісларoду (гіпаксіі). Для таго, каб зменшыць гіпаксію, у ёй пачынаюць прарастаць капілярчыкі. Пры гэтым можа ўзнікнуць як касметычны дэфект (сасудзістая сетачка проста на рагавіцы), так і пагаршэнне зроку.
- Неабходна выкарыстоўваць толькі той раствор для лінзаў, які рэкамендаваны для гэтага тыпу лінзаў. Акрамя таго, некаторыя растворы ўтрымліваюць кампаненты, якія могуць выклікаць алергічныя рэакцыі ў пэўных людзей. Тое ж датычыцца і саміх лінзаў: магчыма, вы не пераносіце які-небудзь пэўны тып лінзаў або лінзы пэўнага вытворцы, але іншыя вам падыдуць.
- Асобнага абмеркавання з урачом патрабуе выкарыстанне кантактных лінзаў у неспрыяльных асяродках: напрыклад, на прадпрыемствах з высокім узроўнем пылу і розных хімічных рэчываў у паветры. Насіць лінзы ў такіх умовах можна пры наяўнасці дадатковых ахоўных сродкаў (спецыяльных акуляраў), але ў некаторых выпадках іх выключаюць зусім.

Лінзы супрацьпаказаны:

- пры грыпе і іншых інфекцыях;
- пры цукровым дыябеце;
- пры захворваннях шчытападобнай залозы;
- пры запаленнях вачэй (кан'юнктывіце, кератыце).

Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Інфарм-укол

Нам смешна — сасудам добра

Кажуць, чым больш смяешся, тым менш хварэеш. Але якія механізмы звязваюць выдатны стан арганізма і такі забаўны працэс, як смех?

Смех — адзін са старажытных працэсаў, які развіўся яшчэ да нашага ўмення размаўляць. Доказам таму служыць гогат... шымпанзэ. Смех можна лічыць натуральным наркотыкам, які выклікае эйфарыю і прыступ шчасця. Адбываецца гэта дзякуючы гармону дапаміну, які выкідваецца ў кроў, калі нас нешта рассмяшыла. Дапамін прымушае адчуць эйфарыю, і мы хочам смяяцца яшчэ больш — іншымі словамі, смех прыносіць задавальненне і выклікае залежнасць.

Паводле слоў **псіхолага Медыцынскага моладзевага цэнтра «Поспех» Веранікі СТОГАВАЙ**, смех з'яўляецца даволі складаным працэсам, у якім бяруць удзел многія часткі цела і арганізма. Калі мы смяёмся, напружваюцца 15 цягліц твару, што можна лічыць пэўнай гімнастыкай. Карысць ёсць і ад слёз, якія мы здольны пусціць ад смеху, бо любыя слёзы — ад радасці ці смутку — ратуюць нас ад стрэсу, прыносяць эмацыйную разрадку. Імунная сістэма таксама толькі выйграе. Як высветлілася, сліна чалавека, які смяецца, утрымлівае рэчывы, здольныя не дапусціць інфекцыі, вынішчыць узбуджальнікаў інфекцыйных захворванняў.

Магчымасць смяяцца ўслых нам дорыць дыяфрагма, якая пампуе паветра ў лёгкіх. Лёгкія пачынаюць працаваць больш актыўна, і наш арганізм насычаецца кіслародам. Падчас смеху, асабліва калі мы яшчэ жартоўна з некім змагаемся, пачашчаецца сэрцабіццё і павышаецца ціск. Гэта адбываецца нават калі мы хіхікаем у момант прагляду камедыйнага серыяла. Даследчыкі даказалі і ўплыў смеху на ўнутраную абалонку сасудаў — эндатэлій. Калі мы смяёмся, эндатэлій расцягваецца, а калі перажываем ці сумуем — сціскаецца. Прычым падчас расцягвання ў кроў выкідваецца вокіс азоту, здольны зменшыць каагуляцыю крыві і запаленне. З іншага боку, пры скарачэнні эндатэлію адбываецца выкід гармону стрэсу — картызолу, які прымушае кроў згусаць і здольны прывесці да захворванняў сэрца. Акрамя таго, смех робіць нас больш цярплівымі да болю і з'яўляецца выдатнай фізічнай нагрузкай для цягліц. Хоць спартзалу ён, безумоўна, не заменіць.

І дэбашырам, і ахвярам патрэбны псіхолаг

Псіхолагі кажуць, што мадэль гвалтоўных паводзінаў засвойваецца ад бацькоў. Заўважана таксама, што ахвяра ў дзяцінстве — агрэсар у дарослым жыцці. Заходняя мадэлі перамагання гвалту ў грамадстве грунтуюцца на трох кітах: аказанні разнапланавай дапамогі ахвяры, псіхалагічнай дапамогі гвалтаўніку і жорсткім пакаранні апошняга ў межах закона.

Мужчыны прымяняюць сілу ў дачыненні да жанчын у якасці пакарання апошніх за парушэнне традыцыйных жаночых роляў або за выклік іх мужчынскім якасцям. Самае важнае ў такой сітуацыі — пазбавіцца віны, не думаць, што заслужыла гэта.

— Як правіла, усё пачынаецца з гвалту псіхалагічнага, — кажа **псіхолаг Тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Першамайскага раёна г. Мінска, кіраўнік Службы дапамогі грамадзянам, якія пацярпелі ад гвалту, Раман КРУЧКОЎ**. — Паступова сітуацыя пагаршаецца... Больш за тое, гвалт цыклічны. Той, хто сёння падняў руку, заўтра можа прасіць прабачэння, каяцца, казаць, што не разумее, як такое магло атрымацца. Такі «букетна-цукерачны» перыяд аднойчы заканчваецца, і гвалт зноў мае месца. Часам нават больш жорсткі, чым быў да гэтага...

Вас імкнуцца пастаянна кантраляваць, і, калі што, разгараецца выбуховая сітуацыя высвятлення адносінаў пра вашу вернасць, праўдзівасць, сціпласць і г.д.? Некаторыя псіхолагі кажуць, што першы парыў мужчыны прадэманстраваць свае неадэкватныя паводзіны павінен стаць апошнім днём адносінаў.

- Крыўдзіцель заўсёды знойдзе нагоду для гвалту.
- Алкаголь — не прычына гвалту, а сродак апраўдання агрэсіўных паводзінаў.
- 70 працэнтаў мужчын, якія збіваюць сваіх жонак, прымянялі сілу і ў дачыненні да сваіх дзяцей.

Святлана БАРЫСЕНКА.

СЭКСУАЛЬНАЯ АКТЫЎНАСЦЬ — ІНДЫКАТАР САРДЭЧНА-САСУДЗІСТАЙ СІСТЭМЫ

Даследчыкі з Гарвардскай медыцынскай школы ўстанавілі, што сэкс можа быць прычынай сардэчных прыступаў прыкладна ў 1 % выпадкаў. Пры праглядзе тэлевізійных блокбастараў і мыльных опер рызыка развіцця сардэчнага прыступу такая ж, як і пры занятках сэксам.

Медыкі раяць тым, хто перанёс сардэчны прыступ, пачакаць ад трох да чатырох тыдняў, перш чым аддавацца любоўным уцехам. Акрамя таго трэба выключыць знаходжанне на спіне: установлена, што сэкс у такой позе спрыяе развіццю ацёку лёгкіх.

Спецыялісты ўпэўнены, што сэксуальная актыўнасць з'яўляецца дакладным індыкатарам стану сардэчна-сасудзістай сістэмы (ва ўсялякім разе ў мужчын). Даказана, што парушэнні эрэкцыі, у тым ліку і імпатэнцыя, надзвычай часта з'яўляюцца індыкатарам сардэчна-сасудзістых захворванняў, гіпертанічнай хваробы і дыябету. Ёсць меркаванне, што прычынай праблем з эрэкцыяй часцей становяцца менавіта парушэнні з боку сардэчна-сасудзістай сістэмы, а не псіхалагічныя расстройствы.

РАНІШНЯЯ КАВА: ПІЦЬ АБО НЕ ПІЦЬ?

Нельга сказаць, што мільёны людзей, якія пачынаюць свой дзень з кубачка кавы, адчуваюць сабе больш бадзёра за тых, хто не п'е каву рэгулярна. Як паведамляе The Guardian, ранішняя кава толькі ліквідуе эфект недахопу кафеіну, які ўтвараецца за ноч.

— Тыя, хто рэгулярна п'е каву на працы, але не спажывае яе ў выхадныя дні, у нядзелю рызыкуюць адчуваць сябе млява, — сцвярджае Пітэр Роджэрс, які кіраваў даследаваннем ва Універсітэце Брыстоля. — Лепш або не спыняць спажыванне кавы, або ўвогуле ад яе адмовіцца.

У ходзе эксперыменту, у якім узялі ўдзел 379 добраахвотнікаў, навукоўцы таксама даследавалі, як генетычныя асаблівасці могуць уплываць на рэакцыю людзей, якія п'юць каву. Тыя ўдзельнікі эксперыменту, якія звычайна не спажывалі каву і былі носьбітам гена ADORA2A, звязанага з панічнымі атакамі, пасля дозы кафеіну адчувалі трывогу. Пры гэтым амаль кавы ніякай трывогі не адчувалі, верагодна таму, што рэгулярнае спажыванне кавы выхавала ў іх устойлівасць да эфекту трывогі ...

ЗА ЗДАРОЎЕМ СПАРТСМЕНАЎ І ВАЕННЫХ БУДУЦЬ САЧЫЦЬ... ТРУСЫ

Як паведамляе The Daily Mail, амерыканскія навукоўцы стварылі бялізну, якая самастойна вымярае шэраг важных жыццёвых паказчыкаў. Група спецыялістаў з Універсітэта Каліфорніі ў Сан Дыега пры дапамозе трафарэтнага друку нанесла на гумку мужчынскіх трусоў вугляродныя датчыкі. З іх дапамогай у чалавека вызначаюцца паказчыкі артэрыяльнага ціску і частата сардэчных скарачэнняў. Акрамя таго сэнсары дазваляюць вымяраюць узровень утрымання на скуры пераксіду вадаро

КНІЖНАЯ СЕРЫЯ: УРОКІ ЧЫТАННЯ

ЯК не згубіць чытача кнігі? Якім чынам развіць увагу да кніжнага спажывання патрэбнай інфармацыі? Пра гэта і не толькі — размова з дырэктарам рэдакцыйна-выдавецкай установы «Літаратура і Мастацтва» і адначасова галоўным рэдактарам газеты «Літаратура і мастацтва» Алесем КАРЛЮКЕВІЧАМ.

— Алесь Мікалаевіч, некалькі апошніх гадоў засведчылі: РВУ «ЛіМ» — не толькі выдавецтва, якое аб'ядноўвае літаратурна-мастацкую перыёдыку, але і ўважлівае да кнігавыдання...

— Традыцыя закладзена, лічы, амаль з самага пачатку існавання РВУ, калі пад кіраўніцтвам тагачаснага дырэктара Таісы Бондар былі ажыццёўлены такія масавыя творчыя праекты, як «Мы — беларусы», «Наша перамога». Працуючы ў часопісах і газеце, літаратары шукалі і іншыя кропкі прыкладання сілаў. Кніга стала яшчэ адным кірункам у зносінах «палымянцаў», «маладосцеўцаў», «нёманцаў», «лімаўцаў» з чытачом. Гэта яшчэ ішло і ад таго, што наспела жаданне хутчэй рэалізаваць нешта і ў кніжным фармаце, не чакаючы, пакуль на цябе звернуць увагу іншыя выдаўцы. Аўтары ж многіх кніг, выдадзеных у РВУ «ЛіМ», — якраз тыя пісьменнікі, якія працуюць у нашым выдавецтве.

— Карацей кажучы, кнігі беларускіх паэтаў і празаікаў — тыя галоўныя абсягі, над якімі рупіцца ваша выдавецтва?

— Так. У апошнія тры-чатыры гады мы выдалі зборнікі прозы, паэзіі, дзіцячыя творы лаўрэатаў Дзяржаўнай прэміі Беларусі Раісы Баравіковай, Уладзіміра Саламахі, Алеся Марціновіча, пісьменнікаў Алега Ждана, Алеся Бадака, Юрыя Сапажкова, Алены Масла, Андрэя Федарэнкі, Анатоля Казлова. І што цікава, кнігі гэтых аўтараў маюць шырокі попыт, запатрабаваны бібліятэкамі, чытачом. Такая акалічнасць пераконвае нас, што мастацкая літаратура на беларускай мове, мастацкая літаратура беларускіх аўтараў, якія пішуць і па-беларуску, і па-руску, носіць рынкавы, як кажуць сёння, характар.

— Вы можаце прывесці найболей яркія прыклады продажу кніг? У якіх лічбах вагаюцца сённяшнія тыражы, прыклады, кніг прозы на беларускай мове?

— Ёсць проста ўражлівыя прыклады, калі ў серыі «Школьная бібліятэка» пры стапрацэнтным фінансаванні дзяржавы выдаюцца кнігі накладам у некалькі дзясяткаў тысяч асобнікаў...

— І яны бясплатна трапляюць у школьныя бібліятэкі краіны. Але ж мы гаворым пра рынкавыя падыходы...

— І такім пісьменнікам для нашага выдавецтва стаў празаік Андрэй Федарэнка. Спярша ў серыі «Пераходны ўзрост» мы выдалі на рускай мове яго «Тры талеры». Кніга разышлася імгненна. Следам — у гэтай жа серыі і «Афганскую шкатулку». Рэчы вядомыя, выдаваліся і раней, але ж і мы як выдавецтва з імі не памыліліся. Добра разыходзіліся кнігі 2008—2009 гадоў у серыі «Усім пра ўсё». Мы выдалі «Расліны» і «Жывёлы» Алеся Бадака. Здавалася б, падобнай літаратуры звышдастаткова, а вось пісьменнік знайшоў патрэбную інтанацыю для размовы з маленькім чытачом. Дадаў нешта сваё, уласна аўтарскае пра шматаблічны свет прыроды. Запланавана ўжо і наступная кніга ў серыі «Усім пра ўсё» — яна будзе прысвечана птушкам.

— Выданне кніг у разнастайных серыях — гэта частка вашай выдавецкай палітыкі?..

— Успомніце вопыт выдавецтваў 1960—1980-х гадоў... Найперш нагадаю праекты тады цэнтральных, маскоўскіх, выдавецтваў: серыі «Страла», «Палымяныя рэвалюцыянеры», «Героі Савецкай Радзімы», «Жыццё знакамітых людзей», «Бібліятэка «Подзвіг», «Мая першая кніжка», «Казка за казкай»... Штосьці аджыло, а нешта выдаецца нават і цяпер. Чытач давяраў серыям. Часам з выданнем пад серыйнымі вокладкамі выходзілі як знакамітыя аўтары, так і пісьменнікі малавядомыя, але з тых, каму выдавецтва выказала давер. Фарміраваўся пэўны густ у чытача і кнігалюба, жаданне сабраць, калі хочаце, калекцыю кніг. Так было з «Класікамі і сучаснікамі», «Бібліятэкай паэзіі» — дзвюма яе серыямі, вялікай і малой...

— Але ці было так з «Бібліятэкай беларускай прозы», «Бібліятэкай беларускай паэзіі», з «Беларускім раманам»?

— Было. І ў самога ў мяне яшчэ з тых, «серыйных», гадоў на паліцах стаяць вялікія і малыя томікі. Серыя прываблівала яшчэ і таму, што быў давер да выдаўца. Пісьменнік мог напісаць за гады творчай работы дваццаць кніг, а ў адзін «серыйны» том выбіралася, як правіла, лепшае са зробленага ім.

— Добра, а ўсё ж пра серыі РВУ «Літаратура і Мастацтва».

— Іх у нас цяпер некалькі. Пра кнігі аўтарскага, скажам так, праекта Алеся Бадака «Усім пра ўсё» мы ўжо гаварылі. У «Пераходным узросце», акрамя Андрэя Федарэнкі, выдалі зборнік аповесцяў Уладзіміра Саламахі «Там, дзе самота і радасці». Кнігі прозы Міколы Купрэева, Анатоля Казлова, Аляксандра Валновіча, Алеся Паплаўскага і Уладзіміра Ягоўдзіка выйшлі пад маркай «Лімаўскі фальварак». Гэтым самым мы прадстаўляем сучасную літаратуру.

— Дык калі ўжо напісаны аповесці Міколы Купрэева!?.

— У перыёдыцы яны друкаваліся ў 1990-я... А вось пад вокладкай кнігі з назвай «Палеская элегія» аб'яднаны былі ўпершыню ў нашым выдавецтве.

Яшчэ ёсць у нас адна адмысловая серыя «Беларусь вчера и сегодня». Яе рыхтуем па гістарычных, культурна-асветніцкіх публікацыях, што былі змешчаны на старонках самай тыражнай газеты краіны — «Беларусь сегодня». Выдалі кнігу Людмілы Рублеўскай і Віталя Скалабана «Время и бремя архивов». Здавалася б, публікацыі іх растыражаваны дзясяткамі, нават сотнямі тысяч экзэмпляраў. І тым не меней знайшлося дзве тысячы пакупнікоў, якія звярнуліся да ўжо шырока вядомых артыкулаў у кніжным выкладанні. Так і з кнігай Адама Мальдзіса «Белорусские сокровища за рубежом»... Супрацоўніцтва кнігавыдавецкага плана з мас-медыя краіны — гэта таксама варты ўвагі кірунак.

— Магчыма, і іншыя творчыя праекты газет краіны вас зацікавяць?

— Чаму б і не?!. Як прыклад — ужо выдадзеная па выніках «звяздоўскай» акцыі кніга Таццяны Падаляк «Нашчадкі вогненных вёсак». А ўвогуле выданне лепшых газетных публікацый кнігай магло б паспрыяць развіццю айчыннай публіцыстыкі. Вось хто цяпер піша нарысы пра чалавека працы?.. Хіба што Леанід Екель у газеце «Беларусь сегодня». Дык чаму яго нарысы-партрэты не аб'яднаць у асобную кнігу?..

— РВУ «ЛіМ» праяўляе ўвагу да гісторыка-краязнаўчай, пазнавальнай літаратуры...

— Гэты год адзначаны з'яўленнем серыі «Святло мінуўшчыны». У ёй выйшлі раманы Алега Ждана «Князь Мстиславский» і Анатоля Бутэвіча «Каралева не здраджвала каралю...». Мне здаецца, што ў абедзвюх гэтых кніг доўгае жыццё. Будуць новыя выданні, будуць пераклады. У «партфелі» серыі «Святло мінуўшчыны» — яшчэ і раман Леаніда Дайнекі «Назаві сына Канстанцінам». Між іншым, усе са згаданых раманаў друкаваліся ў перыёдыцы — у часопісах «Маладосць» і «Нёман».

А што ўвогуле да гісторыка-краязнаўчай тэматыкі, то адзначыў бы кнігі «Нямцэвічы: сапраўдныя гісторыі» Анатоля Гладышчука, «Тапонімы распавядаюць» Валянціны Лемцюговай, «Экскурсія да вытокаў Сянно» Васіля Бандарэвіча, «Чэрвеньшчына: гісторыя ў тапонімах» Івана Ярашэвіча. Мы запрашаем да супрацоўніцтва мясцовых краязнаўцаў, гісторыкаў, архівістаў. Спадзяёмся, што зможам выдаць кнігі літаральна ці не пра ўсе раёны нашай краіны!

— Відавочна, што на пашырэнне кніжнай прасторы будзе працаваць і прадэкларавані газетай «Літаратура і мастацтва» дадатак «Кніжны свет». Праўда, чамусьці ён выйшаў на рускай мове...

— Міністэрства інфармацыі краіны падтрымала нас у ініцыятыве выдаваць у фармаце «ЛіМа» інфармацыйна-бібліяграфічны дадатак пад назвай «Кніжны свет». У маі і чэрвені пабачылі «пілотныя» нумары, падрыхтаваныя сумесна з Нацыянальнай кніжнай палатай. І надалей гэтая самая дасведчаная ўстанова ў галіне інфармацыі пра кнігу Беларусі будзе нашым партнёрам у выданні «Кніжнага свету» штодзень, пачынаючы з ліпеня. Так, мы выдаём дадатак на рускай і беларускай мовах. Але ніколькі ж не парушана прастора «ЛіМа». Ён як выходзіў на 16 старонках, так яно і далей будзе. Чаму «Кніжны свет» яшчэ і па-руску... Па-першае, з-за поўнай бібліяграфіі. Па-другое: мы збіраемся расказваць пра работу ўсіх выдавецтваў краіны, якія ў значнай ступені выдаюць кнігі на рускай мове.

— Будзем спадзявацца, што ў гэтых клопатах і выдавецтва, і газета «ЛіМ» сумесна з дадаткам «Кніжны свет» шмат што зробяць яшчэ і для пашырэння прасторы беларускамоўнай кнігі.

— Несумненна.

Гутарыў Сяргей ШЫПКО.

Наш культурны асяродак
ЖЫРАНДОЛЯ
Выпуск № 12 (98)

Анатоль Бутэвіч высветліў, што каралева не здраджвала каралю

А «Звязда» высвятляла, ці стаяў Анатоль Бутэвіч са свечкаю

СТАРЫ кароль Ягайла меў раней тры шлюбы — але нараджаліся толькі дочкі. І вось чацвёртая жонка, Соф'я Гальшанская, прыносіць Ягайлу двух сыноў. Бах! І Соф'ю голасна абвінавачваюць у здрадзе. Ягайла ў роспачы: няўжо зноў мара пра нашчадкаў накрылася медным тазам?!..

Пра гэта кніга «Каралева не здраджвала каралю» — новы раман літаратара, дзяржаўнага і грамадскага дзеяча Анатоля Бутэвіча. Галоўныя героі твора — 70-гадовы польскі кароль Ягайла і 17-гадовая беларуская князёўна Соф'я Гальшанская. Як і ў ранейшых сваіх творах, спадар Бутэвіч звяртаецца да нашай слаўнай гісторыі, выкладае яе ў даступнай і цікавай форме. Галоўная мэта аўтара — прыцягнуць да зацікаўлення гісторыяй Беларусі як мага больш людзей. Ці не для гэтага аўтар даў кнізе такі «скандальны» загаловак?..



«Ягайла вельмі балюча перажываў абвінавачанне Соф'і ў здрадзе...»

— Спадар Анатоль, назва вашай кніжкі можа параўнацца з загалоўкам «жоўтай» прэсы!..

— А я не зразумеў, гэта станоўчае ці адмоўнае параўнанне?! *(Смяецца.)* Справа ў тым, што назва — гістарычная. Калі абвінавацілі Соф'ю Гальшанскую, што яна здраджвала мужу Ягайлу, то адразу пачалі хапаць рыцараў, якіх у гэтым падазравалі. І вось калі дапытвалі аднаго з іх — Генрыка з Рогава (гэта не наша Рогава, але я дазволіў сабе зрабіць яго нашым) — то ён увесь час цвердзіў: «Каралева не здраджвала каралю». Паколькі гэта ягоныя дакладныя словы, то можна было б назву ўзяць у двукоссе — як цытату. Але я падумаў, што без двукосся будзе цікавей, захаваецца інтрыга. Трэба, дарэчы, адзначыць, што Ягайла вельмі балюча перажываў абвінавачанні Соф'і ў здрадзе. Бо тады магло аказацца, што гэта — не яго сыны. А паколькі ад папярэдніх трох шлюбаў сыноў не было, гэта значыла, што Ягайла застаецца без нашчадкаў, і не будзе каму перадаць уладу...

— Мяркуючы па назве, гаворка ў кнізе ідзе пра амурныя справы. Ці там засталося месца і палітычным інтрыгам таго часу?

— Прысутнічае ўсё — бо так было насамрэч. Колькі я буду творцам, ніколі не буду займацца падглядваннем у шчылінку або пісаць якую чарнуху. Гэтыя пытанні — здраджвала ці не здраджвала — яны гістарычна недаказаныя. Я стараўся разабрацца з пункту погляду логікі, чалавечых падзеяў. А не проста так: «ёй было 17, яму 70, наўкол было шмат рыцараў — і таму яна павінна была»... Жыццё багацейшае за нашыя домыслы і веданне яго тагачаснае. Нельга з сённяшняй пазіцыі меркаваць пра тыя падзеі. Тым больш у мяне не было мэты паглядзець, якія там інтымныя стасункі былі ў Ягайлы з Соф'яй ці з іншымі трыма жонкамі... А што да палітыкі, то вядома, Ягайла не мог жыць па-за ёй, бо быў вялікім князем! І ў кнізе без палітыкі не абышлося. Я намагаўся паказаць стасункі Ягайлы з двума суб'ектамі — і з Княствам, і з Каронай. Стараўся правесці праз раман дзве рэчы. Першае — я не лічу, як некаторыя гісторыкі і даследчыкі, што Ягайла быў здраднікам — здрадзіў сваёй Радзіме і прадаўся палякам. Ён быў палітык. Палітык мусіў рабіць часам тое, што залежала ад палітычнай сітуацыі. Мусіў, а не хацеў. Зразумела, Ягайла як кароль мусіў і войнамі займацца, і караць падданых, хоць ён быў вельмі добры да людзей — мог абдарыць чалавека незвычайнымі багаццямі, папрасіць прабачэння ў таго, каго пакрыўдзіў. Але ён як чалавек паабяцаў палякам вярнуць палонных; як той, хто прыняў каталіцтва, павінен быў будаваць касцёлы... Гэта была палітычная мэта. Зрэшты, і Вітаўт у мэтах палітыкі мусіў і ўцякаць ад крыжакоў, і ўцякаць да крыжакоў, і будаваць крыжацкія замкі, і паліць крыжацкія замкі... Другое: Ягайла з Соф'яй Гальшанскай вянчаўся ў Новагародку — хоць усе тры іншыя ягоныя шлюбы былі ў Кракаве. Чаму? І тут маё перакананне — да канца свайго жыцця Ягайла не здрадзіў Княству. Ён ніколі не хацеў інкарпарацыі Княства ў Карону — як дабіваўся гэтага ягоны сакратар і практычны намеснік Збігнеў Алясьніцкі. А Ягайла ніколі Княства не выракаўся. І памёр ён тут, калі слухаў спевы салаўёў. Толькі тутэйшыя салаўі спявалі для яго так цудоўна...

«Адкрыю вам сакрэт — гэта толькі першая частка рамана...»

— Вы ўжылі панятак «здраджваў Радзіме», «прадаўся палякам». А кім лічыў сябе Ягайла па нацыянальнасці? Вызначэння «беларус» у той час не было. А палякі адкрыта называюць яго «сваім»...

— У той час наогул не было слова «беларус». Была прыналежнасць да пэўных земляў. У мяне ў рамане ўжываецца два тэрміны. Ліцьвінамі я называю беларусаў (тыя, якія сённяшнія беларусы), а літоўцамі — усіх астатніх жыхароў Вялікага Княства Літоўскага. Некаторыя з гэтым тэрмінам не пагаджаюцца. Маўляў, «літоўцы» — гэта мы аддаём гісторыю Літве. Ну не зусім. Гэта як за межамі Беларусі ўсіх жыхароў нашай краіны называюць «беларусамі» (незалежна ад нацыянальнасці). І для мяне было важна размежаваць гэта — вось жыхары тэрыторыі, а вось ідэнтыфікацыя. Тэрміна «беларусы» не было, але жыхары нашай зямлі тады называліся ліцьвінамі.

— У анатацыі да кнігі мы чытаем, што гэта — «займальная гісторыя пра 17-гадовую Соф'ю Гальшанскую і 70-гадовага Ягайлу». Як вы лічыце, у гэтым «няроўным шлюбе» быў выключна дзяржаўны разлік, ці там было месца каханню?

— Разлік і шлюбы... Відаць, ён тады мог быць. У Ягайлы таксама. Але ягоны разлік найперш у тым, што ён шукаў магчымасці дынастычнай перадачы ўлады. Бо тры шлюбы не далі яму сыноў — а ў яго ўсё жыццё было жаданне мець іх. Лічыў, што свая ліцьвінка выправіць становішча.

— Спадар Анатоль, гістарычная інфармацыя, якая прыведзеная ў кнізе, яўна выходзіць за кругагляд філолага, гуманітарыя. Адкуль узялося столькі дэталяў — на 300 старонак?

— Бо ёсць архівы, дакументы, гістарычныя творы — польскія, рускія, украінскія. Я ўсё гэта перачытаў, рабіў шмат выпісак, набіраўся тагачаснай лексікі. І адкрыю вам сакрэт — гэта толькі першая частка рамана. Чыста літаратурная. Існуе другая частка — чыста фактalагічная. Там храналогія падзей, Ягайлаў часапіс — ад Крэўскай да Люблінскай уніі. Там біяграфіі сучаснікаў Ягайлы — разам з легендамі, паданнямі, дэталямі, а не проста і суха. Гэта будзе не менш цікава, бо там ёсць жывыя людзі, праз якіх мы і бачым гісторыю. Як казаў вялікі Караткевіч, калі легендазаваць гісторыю — яна будзе ўспрымацца чытачом з большым імпэтам, з большай цікавасцю. А нам гэта і трэба.

Глеб ЛАБАДЗЕНКА. Фота аўтара.

ВЁСКА постмадэрн

МАЁЙ ЛЮБІМАЙ БАБУЛІ НІНЕ ПРЫСВЯЧАЕЦЦА

Сучасная беларуская вёска — гэта тыповае спараджэнне постмадэрнізму. Нягледзячы нават на тое, што модныя кірункі прыходзяць у нашу краіну заўжды са спазненнем, постмадэрнізм у беларускай вёсцы з'явіўся вельмі пунктуальна. Мажліва, нават раней, чым ва ўсіх іншых месцах свету: класічныя постмадэрнісцкія раманы яшчэ не былі напісаныя, а постмадэрнізм у беларускай вёсцы (тады — савецкай) ужо панаваў ва ўсю!

Што мы маем сёння? Постмадэрнізм па-за межамі ўрбаністычных гігантаў — гарадоў — развіваецца. Прычыны гэтаму — развіццё найноўшых тэхналогій і ўкараненне іх (хоць і маруднае) у вёсках; імкненне дзяржавы палепшыць жыццё вясковых жыхароў, тым самым парушаючы векавы ўклад іх сялянскага жыцця мабільнымі тэлефонамі, тэлевізарамі, красоўкамі, «шклопакетамі» і г. д.; імкненне «адрадзіць сяло», хоць відавочна, што яно павінна перарадзіцца ў неавёску, альбо, не вытрымаўшы канкурэнцыі з паўсюднай урбанізацыяй, павінна натуральна знікнуць (хоць і шкада). Таму атрымліваецца, што сучасная вёска — гэткі постмадэрнісцкі гібрыд з усімі характэрнымі рысамі. Вёска — гэта барацьба за выжыванне на фоне разбуранай чалавекам прыроды. Калі адштурхоўваюцца ад самых яскравых постмадэрнісцкіх прыкметаў (ведаеце, як у падручніку па тэорыі літаратуры), то стане зразумела, наколькі правамерныя мае параўнанні.

1. Эклектызм. Саха і каса + тэлебачанне. Вясковы менталітэт, сялянская псіхалогія, патрыярхальнасць + красоўкі («красАўкі» — так гэты абутак называе мая бабуля) на нагах 80-гадовага старажыла. Падраныя красоўкі, прывезеныя з горада дзецьмі старажыла, каб апошняму было камфортней мясіць вясковы агародны бруд (стваряць агародны блюз?).

2. Сумяшчэнне несумяшчальнага. Татальны аксюмаран, унутраныя супярэчнасці, яднанне нябеснага і зямнога (прычым у самым простым сэнсе) — гэтыя постмадэрнісцкія рысы сучаснай беларускай вёскі выкліканы, зразумела, эклектызмам, акрэсленым у папярэднім пункце.

3. Жыццё па законах абсурду і нерэнтабельнасці. Гэта бессэнсоўная, на думку сучаснага чалавека, прывязанасць да зямлі, духоўная залежнасць ад фізічнай працы, хоць ні праца, ні зямля часцей за ўсё ўжо не кормяць і не прыносяць ніякага прыбытку. Чаго каштуе сёння, напрыклад, вырасціць бульбу? Гэта грошы на насенне, на каня, тысячу і адзін раз паганяць, табарнаваць; грошы на ўгнаенне і сродкі ад злосных каларадскіх жукоў; нервы падчас чарговых зацяжных даждоў, дагляд. Карацей, паспрабуй пасадзі яе, гэтую бульбу, ды выкапай... А бульбы той — з гулькін нос выросце, і тое, калі ўродзіць. І ўсё адно не акупляецца, і ўсё адно трэба будзе набываць бульбу круглы год, каб не душыцца аднымі макаронамі... Але логікай вяскоўцы не кіруюцца, калі прыходзіць чарговая пара сеяць. Вось і атрымліваецца абсурд і супярэчнасці. Альбо вось сваёй бабулі я ніяк не магу патлумачыць, што ў ейным узросце есці шмат яек шкодна — жаўток насычаны халестэрынам, празмернае ўжыванне якога шкоднае для сасудаў. «Як жа так! — самотна абураецца мая бабуля. — Гэта ж сваё, хатняе, уласнымі рукамі вырашчанае, натуральнае, без хімікатаў!»...

4. Другаснасць. Сёння вёска жыве не сваім самабытным унікальным жыццём, а перайманае (а часткова ёй навязваюць) лад жыцця горада. Зноўку надакучлівыя мабільныя тэлефоны і тэлевізары, паношаная гарадская вопратка і абутак, прывезеныя дзецьмі і ўнукамі з горада...Вясковыя новабудоўлі на «аграгарадскі» капыл. Адным словам, назіраем абсалютную няздольнасць вёскі ствараць унікальнае, абсалютнае нівеліраванне вясковага гарадскім, абсалютную адсутнасць «першароднасці», «жывільнай» фантазіі... Варта ўгледзецца ў шыльды ля аўтастрадаў з назвамі вёсак, услухацца ў імёны вясковых жывёл: усіх кабыл клічуць Зоркамі, усіх катоў — Васількамі-Дымкамі, а свіней і курам традыцыйна не даюць ніякіх імёнаў.

5. Інтэртэкстуальнасць. Гэтая постмадэрнісцкая прыкмета вынікае з папярэдняй. Што такое наогул інтэртэкстуальнасць? Першапачаткова — агульная ўласцівасць тэкстаў, якая выражаецца ў наяўнасці паміж імі сувязяў, дзякуючы якім тэксты альбо іх часткі могуць усімі магчымымі спосабамі відавочна альбо прыхавана спасылацца адно на аднаго. Што ж такое вясковая інтэртэкстуальнасць? Гэта стракатасць сучаснай вясковай культуры, якая выражаецца ў вясковым маўленні, адзенні, прадметах побыту, прадуктах харчавання, якія адсылаюць нас да розных іншых «тэкстаў». Услухайцеся ў маўленне вясковай бабулі: беларуская мова разам з рускамоўным «электронным» слэнгам, пачутым ад унукаў, стварае па-свойму аргінічную сучасную вясковую гаворку. Альбо падумайце толькі, наколькі трагікамічна выглядае кубачак ёгурту ці бутэлька ліманаду з новай рэкламы на фоне беларускай печкі і засланага вышываным абрусам стала! Вось гэта ўзаемапранікненне культур і інтэртэкстуальнасць глабальнага маштабу! Альбо ўявіце пыласос у інтэр'еры вясковай хаты і дзядулю ў кепцы вядомай спартыўнай фірмы...

6. Фрагментарнасць. Ніводны тэлевізар на вёсцы не паказвае больш чым тры каналы. Прычым паказвае таксама толькі выбранае. Фрагментарна. Кожны вясковы тэлевізар — гэта такая своеасаблівая «камера-абскура» са сваімі сюрпрызамі. Разбэшчанасць і «рамкі» ў спалучэнні з адсутнасцю добрых антэн робяць сваю справу: тут твар не ўбачыў, там слова недачуў — памехі мітусяцца на экране, заглушаючы выяву і гук, ствараючы гэткі «тэлевізійны пэчварк».

7. Няпэўнасць, нявызначанасць. А па-нашаму проста тутэйшасць. Тутэйшасць — даўняя беларуская традыцыя. Праўда, сёння сэнсавае напаўненне тэрміну «тутэйшасць» крыху змянілася. Калі раней тутэйшасць падразумявала нейкую нацыянальную разгубленасць і нявызначанасць, то цяпер, у часы незалежнасці, калі вызначана дакладна, хто мы і адкуль наш род, мае месца нацыянальная абыякавасць. Пэўны інтэрнацыяналізм прысутнічае, напрыклад, і ў маёй бабулі. Яна з неахвотай прызнае, што размаўляе па-беларуску і ўпарта сцвярджае, што «па-нашаму». Яна не разумее беларускіх назваў месяцаў, хоць сама часам выдае такія філалагічныя перлы па-беларуску, што я хапаюся за галаву, а потым за аловак і спяшаюся запісаць усё пачутае.

Беларуская вёска — гэта чароўна. Ёсць у ёй нейкае неабдымнае харство, якое не пакідае абыякавай ніколі. І кожны раз, калі я наведваю сваю родную вёску (в. Данілаўка Бешанковіцкага раёна Віцебскай вобласці), вёску, дзе я правяла, бадай, усе летнія вакацыі ў дзяцінстве, мне хочацца запісаць усе бабуліны слоўцы, сфатаграфаваць кожную травінку і абавязкова адлюстраваць свае думкі на паперы, каб не знікла гэта ўсё бясследна. Усё гэтае вясковае жыццё з прыцягальным абсурдам і тужлівай занядбанасцю... Трэба сказаць, дарэчы, што на фоне прыгажосці запусцення беларускай вёскі яе жыхары змагаюцца і радуюцца жыццю з вартым зайздрасці імпэтам. Магчыма, гэта прывядзе да эвалюцыі (трансфармавання? мутацыі?) нашай вёскі ў нейкую новую гарманічную форму. Толькі вось, на жаль, не бачна новай самабытнай генерацыі вяскоўцаў. Адзін постмадэрнізм.

Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ.

ЭКАГОРАД

— Ой, якія прыгожыя калоны — столькі рознакаляровай мазаікі! Што гэта за палац?

— Ды гэта не палац, а ЦЭЦ. Звычайная цеплastанцыя. Яна перапрацоўвае смецце — адходы жыцця ўсяго горада Вены і корміць яго ж электрычнасцю...

Мая асацыяцыя гарадскога жыцця — шум, шкрабятанне, шакалад, шпацыр... Карацей, суцэльнае «ш-ш-ш...», якое шыпіць, як гусак. Але ж зусім не страшна...

ШОК (культурны) любога госця ці турыста ў старажытнай Вене будзе датычыцца ў тым ліку цепластанцыі «Шпітэлаў». Не толькі таму, што яна працуе на смецці — як зручна і экалагічна! А яшчэ і таму, што будынак, дзе з бруду вырабляюць энергію, без якой, лічыце, няма жыцця сучаснага чалавека, створаны і ўпрыгожаны як унікальны мадэрновы арт-аб'ект. Распрацаваў яго геніяльны мастак XX стагоддзя Фрыдэнсрайх Хундэртвасер, ён жа давёў да дасканаласці ідэю, як вялікі горад можа сябе забяспечваць і не псаваць пры гэтым экалогію. Гэты мастак быў сапраўдным носьбітам экалагічнай свядомасці і рабіў усё, каб людзі ў горадзе адчувалі сябе бліскімі да натуральнага прыроднага асяроддзя. Ён нават спраектаваў дом, на якім растуць дрэвы!.. Лічыў, што горад можа прыйсці да самаачышчэння, калі ў людзей з'явіцца разуменне таго, чаму іх жыццё пагражае гармоніі сусвету.

Узгадала пра мастака з экалагічнай свядомасцю, які спрыяў таму, каб смецце ператваралась у прыгажосць, калі на адных з мінулых выхадных з'ездзіла падыхаць свежым паветрам у бок Мінскага мора. Па дарозе прыцягнула ўвагу вялікая гара (ці падмурак незавершанай піраміды), над якой уздымаўся дымок ды кружылі чорныя птушкі. Гэта было наша смецце, роднае, беларускае, мінская звалка. Даўно не ездзіла ў той бок, і заўважыла, як гэтая куча вырасла за гэты час. Што зробіш: вялікая звалка — вялікі і горад...

Неяк лічыцца, што гараджанам не трэба замарочвацца лішнімі думкамі — бо і без іх дастаткова розных клопатаў, таму жыццё павінна быць арганізавана максімальна зручна. А смецце вывозіцца рэгулярна. Аднак цяпер, параўнаўшы ў нейкім сэнсе звалку венскую і беларускую, якія бачыла на свае вочы, шмат разоў падумаю, ці варта набываць поліэтыленавы пакет, пластыкавую бутэльку ці аднаразовы посуд, каб выехаць на прыроду...

ШЧАСЦЕ гарадскога чалавека ў тым, што за яго падумалі. Яму прапаноўваюць — ён спажывае. Больш выгод і прапаноў — больш спажывання. А потым смецця ля пад'езда ці на звалцы. Ды выкарыстанай электрычнасці, бо свядомасць спажыўца ніколі не згадае пра тое, што недзе ў пустым пакоі гарыць святло проста так. Свядомасць спажыўца натыкае ў кватэры шмат лямпачак і розных варыянтаў падсветкі, яна не падумае пра тое, што тэлевізар ці камп'ютар можна выключыць з рэжыму чакання, бо зручна натыкнуць на кнопку — і ўсё запрацуе. Свядомасць спажыўца прымушае запаўняць кухню ўсімі магчымымі «наваротамі» кшталту мікрахвалёўкі і машыны для мыцця посуду. І тут вясковыя людзі абсалютна слушна скажуць: «З жыру бесяцца». Бо мала таго, што ў нас водаправод з гарачай вадой, дык яшчэ каб само рабілася... Напэўна, у наш час навуку рухае свядомасць спажыўца-гараджаніна, час якога бяжыць вельмі шпарка, і які не задумваецца: а што пасля мяне?

Якім павінен быць сучасны горад, каб не перашкаджаць чалавеку жыць? Гэта тая тэма, якая прымушае шмат думаць навукоўцаў і палітыкаў, медыкаў і мастакоў. Першыя і другія імкнуцца выдумаць мадэль сучаснага горада і нават гатовыя дэманстраваць свой клопат пра чалавека на сусветных выставах. Трэція і чацвёртыя дбаюць пра тое, каб чалавек у горадзе заставаўся жывым — фізічна і духоўна. Медыкі б'юць трывогу: там, дзе горад — там і стрэсы. Жыццё чалавека становіцца больш хуткім, сам чалавек прагматычным, адарваным ад натуральнага жыцця, за што мы ўсе плацім рознымі балячкамі. У тое, што ў апошніх з гэтага пераліку атрымаецца нешта змяніць, мала хто верыць: маўляў, хто гэтых мастакоў пачуе? Аднак калі яны бяруцца за справу, атрымліваецца вельмі пераканаўча.

ШЧЫРАСЦЬ у свеце не страчана зусім — даводзіць беларускі мастак Георгій Несцераў. Даводзіць шляхам сваіх «Прамавугольнікаў». Гэтую выставу ён прымеркаваў да Сусветнага дня аховы навакольнага асяроддзя. Яна праходзіць у сталіцы Беларусі — у Нацыянальным мастацкім, галоўным музеі краіны. Значыць, гэта важна. Навакольнае асяроддзе для яго — гэта космас, які зліваецца з намі. Ён жыве ўнутры нас. І ён ёсць мы. Мы не заўважаем? Ці проста забыліся? Пра тое, што самі з'яўляемся навакольным асяроддзем у дачыненні адно да аднаго. А наша негатыўнае стаўленне да іншых людзей, да жывёл ці прыроды, вяртаюцца да нас як бумеранг. Калі не адразу, то ўсё адно рана ці позна адгукнуцца ў нас саміх. Разумеючы свабоду як свабоду ад усяго, што нас акаляе, мы апынуліся ў дэпрэсіўным адзіноцтве, папярэджвае мастак. Аднак без чыстага паветра, вады і зямлі, без дапамогі і разумення іншых нам не выжыць. Гэта сказана шляхам мастацкай гармоніі.

Гэтую гармонію чалавек можа захаваць у сваім побытовым жыцці — шчыра верыў мастак Хундэртвасер. І нават паказаў, як гэта зрабіць. Ён пабудаваў дом.

ШЧЫЛЬНАСЦЬ — галоўная рыса гарадскога жыцця. Людзі жывуць плячо да пляча, побач. Аднак гэта не перашкаджае ім быць адасобленымі адзін ад другога. Вось дзіва: у вёсцы ў кожнай сям'і свая хата, аднак вяскоўцы здаюцца больш адкрытымі і адзінымі, чым гараджане, кожны з якіх мае сваю клетку.

Аднак яны не маюць права быць сумнымі і аднастайнымі, аздабляючы асяроддзе людзей. Пра гэта сведчыць Дом Хундэртвасера ў Вене, які быў пабудаваны ў 1985 годзе. А ў 1986 годзе ў экадоме пасяліліся першыя жыхары. І аканілі аазіс стракатасці сярод шэрых, сумных гарадскіх будынкаў. Фасад гэтага дома стракаты, афармлены рознымі фарбамі. Кожная аддзелена ад суседзяў пэўным колерам. Нібыта захоўвае тую самую адасобленасць, якой не хапае ў гарадскім жыцці. Невялікі кавалак аўтар захацеў пакінуць такім, як ён выглядаў першапачаткова.

Згодна з Хундэртвасерам, дамы складаюцца з... вокнаў. Для свайго дома ён спраектаваў 13 тыпаў розных вокнаў, якія адрозніваюцца дно ад другога формай, памерамі і колерам.

Кажуць, што ў доме няма прамых вуглоў. Нават абсалютна прамых сцен і паверхняў. А ў гульнявым пакоі для дзяцей падлога нібыта ўтварае горку — дзеля зручнасці гульняў. Увесь дом упрыгожвае мазаіка.

Экалагічнасць закладзена яшчэ і ў лініях, бо дзе вы ў прыродзе бачылі абсалютна роўную паверхню? Дык навошта гэтага дабівацца ад падлогі? Калі ты ўваходзіш у пад'езд, то дробненькія плітачкі пад нагамі ствараюць уражанне, нібыта крочыш па лясной сцежцы.

Гэты дом муніцыпальны. У ім атрымлівалі кватэры людзі, не вельмі добра забяспечаныя матэрыяльна. Прадугледжвалася, што калі эканоміка сям'і палепшыцца, то яна адсюль з'едзе. Час прайшоў, людзі паляпшалі сваё становішча. Аднак кватэры пакідалі за сабой.

ШЭПТ дрэў, напэўна, іх утрымаў. Мастак лічыў, што натуральнае асяроддзе чалавека — прырода, якую трэба стварыць у горадзе. Думкі Хундэртвасера пра дрэўцы-арандатары таксама аказаліся рэальнымі. У кожнага дрэва ў гэтым доме таксама свая тэрыторыя. Дрэўцы сапраўды растуць на даху, а на шматлікіх тэрасах і балконах, віецца плюшч ці вінаград.

Хундэртвасер быў упэўнены, што кожны кавалак зямлі, які чалавек адбірае ў прыроды пад забудову, павінен быць адноўлены праз штучнае стварэнне «зялёнай» зоны. Таму дом упрыгожваюць шматлікія расліны, якія растуць тэрасамі, — бук, бэз, глог, каштан. Тры вялікія тэрасы агульнадаступныя для ўсіх жыхароў. А некаторыя пляцоўкі спецыяльна пакінулі для прыроды і расліны там нараслі самі...

Такі незвычайны дом павінен быў стаць

ЦІ ВЫЖЫВЕ ПЕРШАЯ МІНСКАЯ ЭЛЕКТРАСТАНЦЫЯ КАЛЯ ГАТЭЛЮ «КЕМПІНСКІ»?..

У Мінску збіраюцца зруйнаваць яшчэ адзін стары будынак — першую ў сталіцы электрастанцыю 1870-х гадоў. Гэта калі коратка. Падрабязней гісторыя выглядае так.

На праспекце Незалежнасці, злева ад цырка, сабраліся будаваць прэстыжны гатэль «Кемпінскі». Рэч, бясспрэчна, патрэбная — асабліва напярэдадні чэмпіянату свету-2014 па хакеі ў Мінску. Аднак вось бяда — якраз на гэтым месцы знаходзяцца будынкі першай у Мінску электрастанцыі — унікальнага помніка гарадской прамысловасці. Электрастанцыя ўнесена ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў Рэспублікі Беларусь. І ўнесена недарэмна. Па-першае, іншага такога будынка ў Мінску няма. А ў Беларусі — усяго два. Па-другое, электрастанцыя перажыла многае — Першую сусветную вайну, рэвалюцыю, Вялікую Айчынную вайну. Пасля вайны электрастанцыя непасрэдна ўдзельнічала ў гераічным аднаўленні праспекта — сілкавала ўсе будоўлі ад плошчы Незалежнасці да плошчы Перамогі.

І вось праектанты гатэлю малююць план, на якім электрастанцыі... няма. А ёсць 8-павярховы шкляны гмах. Гм... На шчасце, усе праекты будаўніцтва ў зоне гісторыка-культурных помнікаў (а тут адразу два — ансамбль праспекта і сама станцыя) узгадняе кампетэнтная Навукова-метадычная рада пры Міністэрстве культуры. І Рада адрэагавала адэкватна: гатэль будуйце, але станцыю захавайце. Маскоўская фірма «Speech», якая з'яўляецца аўтарам праекта, падышла з разуменнем, і 7 красавіка Радзе быў прадстаўлены другі праект, на якім гатэль павінен быў будавацца ўздоўж ракі, а станцыя захоўвалася (гл. малюнак).

Але вось удакладненне генплана тэрыторыі, якая мае быць забудаваная, ад 3 чэрвеня. На гэтым удакладненым генплане электрастанцыі... няма. Памятаеце, як было ў сталінскія часы: няма чалавека — няма праблемы. Тут тое самае: няма станцыі — няма за што спрачацца. Аднак станцыя пакуль стаіць. І пакуль яе не зруйнавалі, «Звязда» паспрабавала разабрацца ў жангляванні дакументамі.

Гэтыя два будынкі 1870 гадоў — першая мінская электрастанцыя. Яна перажыла дзве вайны, рэвалюцыю і адбудову Мінска. Ці перажыве яна пабудову новага гатэлю?..

КАМЕНТАР ЧЫНОЎНІКА

Ігар ЧАРНЯЎСКІ: «Генплан у такім выглядзе супярэчыць заканадаўству!»



З чатырох чалавек, якія падпісалі генплан, пры падрыхтоўцы артыкула ўдалося ўзяць каментар толькі ў аднаго — **начальніка Упраўлення па ахове гісторыка-культурнай спадчыны і рэстаўрацыі Міністэрства культуры Ігара ЧАРНЯЎСКАГА**.

— Спадар Ігар, я трымаю ў руках ўдакладненне генплана тэрыторыі, прылеглай да цырка, якая мае быць забудаваная, ад 3 чэрвеня 2010 года. Там ёсць у тым ліку і ваш подпіс з удакладненнем. Будынак гатэлю на гэтым генплане праходзіць роўна па месцы, дзе размешчана электрастанцыя. Гэта супярэчыць рашэнню Рэспубліканскай навукова-метадычнай рады пры Міністэрстве культуры ад 7 красавіка 2010 года. Да таго ж электрастанцыя ўнесена ў Дзяржаўны спіс культурных каштоўнасцяў — яе руйнаваць нельга!.. Як разумець гэтае ўдакладненне генплана, якое вы падпісалі?

— Калі вы бачылі, на гэтым генплане я пад сваім подпісам зрабіў заўвагу (гэта праўда, там напісана: «аб'ёмна-прасторавае рашэнне шматфункцыянальнага комплексу ўдакладніць цягам далейшага праектавання зыходзячы з п. 3 рашэння Навукова-метадычнай рады ад 07.04.2010 № 167» — **Г.Л.**). Гэта значыць, што генплан узгоднены, але неабходна зрабіць карэкціроўку — я спаслаўся на канкрэтнае рашэнне Рады, дзе прапісана, што і як праектаваць.

— Спадар Ігар, генплан у такім выглядзе супярэчыць заканадаўству?

— Генплан у такім выглядзе не тое што супярэчыць заканадаўству, генплан у такім выглядзе не дае падставы казаць, як будзе рэалізавана рашэнне Рады. Таму што сёння пакуль што няма праектнага рашэння адносна таго, як жа будзе прадстаўлена электрастанцыя. Яна можа быць нават усярэдзіне будынка экспанаваная. Але мяне больш за ўсё зачапіла, што на гэтым генплане элементаў электрастанцыі, пра якія мы гаварылі на радзе — іх проста няма!.. Таму яны павінны паказаць нам электрастанцыю.

— Вось гэты ўдакладнены генплан, ён ужо зацверджаны?

— Генплан не зацвярджаецца, а ўзгадняецца. Гэты генплан узгоднены з заўвагамі — ёсць такая форма. Але ў далейшым праектаванні праекціроўшчыкі павінны гэтыя заўвагі ўлічыць і паказаць, як яны іх рэалізавалі. Будзем далей разглядаць дакументы — будзем бачыць. Калі на наступным этапе будзе прадстаўлена зноў без электрастанцыі — будзем больш сур'ёзныя заўвагі рабіць.

— Хто аўтар удакладненага генплана? Хто гэта маляваў?

— Звяртайцеся да праектнай арганізацыі і замоўцы...

— Але я правільна разумею, што паводле рашэння рады Мінкульта электрастанцыя мусіць быць захаваная?

— Так, мусіць быць захаваная найбольш выразная яе частка — два будынкі.

ЗВАНОК У БУДАЎНІЧУЮ ФІРМУ

«Я не буду нічога каментаваць!»

Як удалося разабрацца, адказны за праект гатэлю — **галоўны інжынер фірмы «Эліт-Эстэйт» Юры АЖАР**. Гэтая фірма выконвала скарэктаваны генплан. Юры Іванавіч быў лаканічны:

— Я не буду нічога каментаваць.

— А чаму вы не будзеце нічога каментаваць?

— Бо я вас не бачу, не ведаю, хто вы.

— Але я вам назваўся.

Паводле ўдакладненага генплана тэрыторыі, прылеглай да цырка, ад 3 чэрвеня 2010 года электрастанцыі... няма ўвогуле!..»

— Гэта па тэлефоне. Я каментаваць нічога не буду.

— Добра. Як можна з вамі сустрэцца, каб атрымаць каментар?

— Вы можаце напісаць ліст у нашу арганізацыю за прадстаўленнем каментароў.

Вось і ўся размова.

КАМЕНТАР НАВУКОВАГА КІРАЎНІКА

Вадзім ГЛІННІК: «Аўтары праекта прызнавалі, што тэхнічна захаваць станцыю магчыма»

Навуковы кіраўнік электрастанцыі — Вадзім ГЛІННІК. Аўтарытэтны навукоўца — апроч электрастанцыі, ён з'яўляецца навуковым кіраўніком ансамбля праспекта Незалежнасці ў Мінску і гістарычнага цэнтра Полацка.

— Спадар Вадзім, распавядзіце, калі ласка, гісторыю стварэння будынка першай мінскай электрастанцыі.

— Гісторыя забудовы гэтага квартала сягае ў першую палову XIX стагоддзя — і звязаная яна са стварэннем першага гарадскога парка. Гэта быў адзін з першых публічных гарадскіх паркаў на ўсходзе Еўропы. Дагэтуль яны былі прыватныя. Дык вось, гісторыя парка Горкага пачыналася з гэтага квартала. Там была вядомая «Іардань», дзе хрысцілі праваслаўнае насельніцтва Мінска. Але ўжо ў другой палове XIX стагоддзя ў сувязі з пашырэннем гэтай часткі гораду, там была размешчана помпавая станцыя — і адсюль пачынаецца гісторыя нашай электрастанцыі, з 1870-х гадоў. Комплекс разбудоўваўся, у такім выглядзе сустрэў Першую сусветную вайну, рэвалюцыю. І пасля вайны гэтая электрастанцыя абслугоўвала энергіяй усе будаўнічыя пляцоўкі аднаўлення праспекта Незалежнасці — ад плошчы Незалежнасці да плошчы Перамогі. Пасля яна стала спартовай пабудовай, якой з'яўляецца і сёння.

— У чым сёння каштоўнасць будынкаў электрастанцыі?

— Па-першае, гэта адзін з нямногіх будынкаў старадаўняй прамысловай архітэктуры, які ацалеў у Мінску. А калі казаць пра старадаўнія электрастанцыі як тып будынкаў, то іх ацалела дзве — нашая і ў Віцебску. Мінская электрастанцыя — гэта таксама ацалелы кавалачак галоўнай вуліцы Мінска канца XIX стагоддзя, які захаваўся амаль у нязмененым выглядзе.

— Як вы лічыце, чаму яна ацалела пры пабудове нашага магутнага праспекта? Толькі таму, што выконвала функцыянальную ролю — сілкавала энергіяй?

— Найперш таму, што аўтары генплана пасляваеннай рэканструкцыі Мінска не прадугледжвалі забудову гэтай тэрыторыі. На ўсіх генеральных планах тут прадугледжвалася паркавая зона. Што і было рэалізавана — спартовыя збудаванні ў структуры парка.

— Аргументы людзей, якія ціснуць сёння на руйнаванне станцыі — што яна выглядае як «некалькі хлявоў». Аднак яна выглядала гэтак жа і тады, калі стваралася праспект. Чаму тыя архітэктары не зруйнавалі «некалькі хлявоў»?

— Бо яе разглядалі як павільён у межах парка, а не як частку праспекта. Мы і бачым — улетку гэты аб'ект амаль не бачны з праспекта, ён патанае ў дрэвах. Каб не парушыць каштоўнасць ансамбля праспекта мы не павінны парушаць тыя прынцыпы, якія былі закладзеныя пры будаўніцтве пасля вайны.

— Калі над станцыяй навісла пагроза знішчэння?

— Калі ў генеральным плане горада гэтае месца было вызначана пад забудову. Я лічу, што гэта была памылка горадабудаўнікоў — гэтая тэрыторыя мусіла заставацца як ландшафтна-рэкрэацыйная зона, якая б гарантавала захаванне культурнага краявіду і навакольных помнікаў архітэктуры ды прыроды.

— Я так разумею, што зараз ёй пагражае канкрэтны аб'ект, які мусіць паўстаць на гэтым месцы — гатэль «Кемпінскі»?

— Сапраўды, было прынятае рашэнне аб будаўніцтве на гэтым месцы шматфункцыянальнага комплексу з гатэлем «Кемпінскі», двума жылымі дамамі і бізнэс-цэнтрам.

— Наколькі я ведаю, было некалькі праектаў гатэлю: першы з іх прадугледжваў знос электрастанцыі. Другі, дапрацаваны, выяўляў гатэль уздоўж ракі, станцыя заставалася. Апошні варыянт зноў прадугледжвае руйнаванне станцыі...

— З тых матэрыялаў, якія мне вядомыя, спачатку былі зробленыя эскізныя распрацоўкі, якія прадугледжвалі знос элестрастанцыі. На памылковасць такога падыходу было ўказана на навукова-метадычнай Радзе Мінкульта. Тады маскоўскія калегі, аўтары праекта, прадставілі адкарэктаваны варыянт, які прадугледжваў частковае захаванне найбольш адметных фрагментаў будынкаў. Што датычыць цяперашняга стану, то нічога не магу сказаць, бо не ўдзельнічаю ў працэсе.

— Паводле праекта, нават пры захаванні станцыі пад ёй хочуць зрабіць паркінг. Ці гэта магчыма тэхнічна — пракапаць паркінг пад гатовым будынкам, каб не пашкодзіць яго?

— Сапраўды, гэта адна са складаных праблем, якая і ставіла пад сумнеў захаванне станцыі — неабходнасць размяшчэння паркінга. Але тэхнічна гэта магчыма — і маскоўскія калегі гэта прызналі.

КАМЕНТАР ЭКСПЕРТА

Леанід ЛЕВІН: «У нас засталася адна такая электрастанцыя. Іншай няма»

У якасці эксперта мы запрасілі аўтарытэтнага, можна сказаць, легендарнага архітэктара Леаніда ЛЕВІНА. Прасякаешся павагаю да гэтага чалавека, нават кароткапералічыўшы ягоныя праекты — мемарыяльныя комплексы «Хатынь», «Прарыў», «Кацюша», будынак ВДНГ у Мінску, будынак Міністэрства замежных спраў, станцыі метро «Плошча Незалежнасці» і «Няміга», праект дэталёвай планіроўкі праспекта Пераможцаў у Мінску, рэканструкцыя Траецкага прадмесця, помнікі Купалу і Коласу ў Мінску... Леанід Левін успрыняў вестку пра магчымае руйнаванне электрастанцыі і будаўніцтва гатэлю вельмі балюча...

— Мяне хвалюе, што на нашу гісторыю і спадчыну мы глядзім, як вар'яты, якія знішчаюць, знішчаюць і знішчаюць! І будаваць нешта новае ў сталіцы — гэта не значыць усё знішчаць. Мы павінны захоўваць нашу спадчыну — гэта маё крэда. Ніякія грошы і выдатныя ідэі не могуць жыць за кошт нашай гісторыі. Ансамбль праспекта — гэта нашая гісторыя. Тое, што надумаліся рабіць з гатэлем «Кемпінскі», робіцца без ніякай павагі да нашай гісторыі. Магу ў прыклад паставіць Піцер, дзе гараджане падняліся нават супраць мансардаў, якія вырашылі зрабіць на старых будынках. Бо гэта зменіць выгляд горада, знішчыць яго аўру і непаўторнасць. Няхай чыноўнікі памятаюць, што ўсе яны — часова. А гісторыя Мінска — вечная.

— Спадар Леанід, у сваім лісце на імя міністра культуры Паўла Латушкі вы дэталёва, «на пальцах», патлумачылі як архітэктар — што затуліць і сапсуе новы будынак гатэлю. Ці можаце нагадаць?

— Мы «расстрэльваем» Дом афіцэраў — раз. Мы «расстрэльваем» помнік Перамогі — два. Мы «расстрэльваем» ансамбль Плошчы Перамогі — тры. Мы «расстрэльваем» сквер Янкі Купалы... Патлумачу проста. Вышыня цырка — 13 метраў да карніза і 26 метраў да купала. Вышыня жылых дамоў каля цырка (у бок Кастрычніцкай плошчы) — 27 метраў. А вышыня гатэльнага бізнэс-цэнтра — 40 метраў! Гэта значыцца, што ён не проста перавысіць усе існыя будынкі, але і зробіцца цэнтрам увагі і кампазіцыі! Некаторыя кажуць: Эйфелеву вежу таксама спачатку не прымалі, а пасля ўсе палюбілі. Дарагія мае, гэта — не пра нас. Тое, што мы маем, стваралася стагоддзямі — з вялікай адказнасцю. Ніхто з нас, архітэктараў, не мог пайсці на тое, каб парушаць ансамбль. А праспект Незалежнасці — гэта цэльны, гарманічны ансамбль. Які будзе знішчаны гэтым гатэлем.

— Ці маюць будынкі электрастанцыі нейкую каштоўнасць?

— Вядома, маюць! Гэта помнік нашай прамысловай архітэктуры, якіх засталося не так шмат. Тое самае зрабілі на месцы, дзе цяпер стаіць помнік Пушкіну — немаведама навошта знішчылі гістарычны будынак бісквітнай фабрыкі. І што? На гэтым месцы раскаталі газоны і пасадзілі кветкі. Дык вось, гэта кветкі на магіле нашай спадчыны. Тое самае збіраюцца рабіць на вуліцы Кастрычніцкай — руйнаваць гістарычныя будынкі завода «Крышталь». Тое самае адбываецца і тут. Паўтараю, гэта помнік нашай прамысловай архітэктуры. І ён адзін такі! Іншага ў нас ўжо няма. Я вельмі шкадую, што наша ахова помнікаў не ахоўвае нашы помнікі.

— Аднак электрастанцыя знаходзіцца пакуль што ў Дзяржаўным спісе — пад аховай...

— У нас гэта лёгка вырашаецца: здымаецца шыльдачка з будынка, ён выводзіцца са спіса — і руйнуецца. Такіх прыкладаў было дастаткова, у тым ліку і ў Мінску

P.S. *З Бібліі нам вядомы панятак «залатога цяльца». Калі людзі дзеля золата, грошай, забываюцца на ўсё, перакрэсліваюць усе маральныя прынцыпы і паняткі. Зразумела, гатэль прынясе Мінску вялікія грошы — у выглядзе платы за зямлю, падаткаў, турыстаў... Аднак ці павінны помнік архітэктуры, які перажыў за 140 гадоў шмат бяды, стаць ахвярай шклянога гатэля? Ці ў нас так шмат гэтых помнікаў? Выглядае, што чыноўнікаў не надта хвалюе гэтае пытанне...*

Глеб ЛАБАДЗЕНКА.
Фота аўтара і з інтэрнэту.



НЕЛЬГА ЗАБЫЦЬ, АЛЬБО ДЗЕНЬ НАРОДЗІНАЎ САЛДАТА

Быць салдатам — наканаванне Васіля Быкава. Нават цяпер ён на варце Перамогі праз свае кнігі.

Гэта яго лёс. Цяпер кажуць, што лёс чалавека можна вылічыць ледзь не па даце і часе яго прыходу ў гэты свет. 19 чэрвеня 1924 года — дзень быў радасны для Ганны Рыгораўны і Уладзіміра Фёдаравіча Быкавых з вёскі Бычкі. Нармальны дзень для вяскоўцаў, якія нарадзілі сына — памочніка і апору ў старасці. Ды і для іншых сем'яў, якіх у гэты дзень чакала прыбаўленне ў сям'і. Як і ў тых, што нарадзілі напярэдадні, ці нават за год да таго. Дні маглі быць розныя, як і гадзіны, а лёс бадай кожнага чакаў адзін. Бо напярэдадні вайны гэтым хлопчыкам споўнілася 17-18. І незалежна ад таго, пра што яны марылі і якую прафесію выбіралі, іх шлях вёў у войска, на фронт.

Быкаў марыў пра мастацтва. Аднак ужо на самым пачатку вайны мабілізуецца на абарончыя працы. Потым ідзе ў пяхотную вучэльню і ваюе на Украінскіх франтах. Тады тыя, хто быў на фронце, — што радавыя, што старшы лейтэнант — усе былі салдаты.

Сям'я салдата Быкава, як шмат якіх сем'яў, атрымала «пахаванку». Але салдацкі лёс быў на яго баку. Салдат Быкаў быў некалькі разоў паранены і вяртаўся на фронт, скончыў вайну ў Заходняй Еўропе, каб потым вярнуцца дадому. Доўгая была дарога. Пра гэта можна даведацца ў Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры, дзе працуе выстава, якая раскрывае ваенны перыяд жыцця і творчасці народнага пісьменніка Беларусі.

Але і пасля вайны ён застаўся салдатам Перамогі — бо ў кнігах казаў пра пачуцці чалавека на вайне, пра тое, як было заставацца чалавекам у тых варунках. Вайна сапраўды вызначыла яго жыццёвы лёс, у якім для Быкава заўсёды самым важным быў ягоны чалавечы выбар.

Нават цяпер, калі яго ўжо няма, ён працягвае заставацца салдатам Вялікай Айчыннай. Колькі кніг пра вайну напісана, але спадчына Быкава хіба не самая моцная зброя з забыццём ва ўсім свеце. Сёлета яна асабліва актуальная — мы святкуем 65-ю гадавіну Перамогі. Але гэта тая літаратура, пра якую нельга забыць, бо яна будзе ўспрымацца сучаснай заўсёды, пакуль у свеце не сціхнуць усе, нават дробныя, канфлікты, дзе чалавек падымаецца на чалавека... Вечны салдат стварыў, бадай, вечную літаратуру.

Ларыса ЦІМОШЫК.

Уладзімір КАРАГІН:

«ДЗЕНЬ АДРАДЖЭННЯ, АЛЕ НЕ СВЯТА»

15 чэрвеня беларускія прадпрымальнікі адзначылі дзень адраджэння прадпрымальніцтва, і з гэтай нагоды ў Мінскім сталічным саюзе прадпрымальнікаў і працадаўцаў адбылася прэс-канферэнцыя, у якой паўдзельнічалі і прадстаўнікі рэгіянальных бізнэс-саюзаў па селектарнай сувязі.

— Сёння ў нас асаблівы дзень — з 1992 года 15 чэрвеня мы адзначаем як дзень адраджэння прадпрымальніцтва, але мы не называем яго святам, — сказаў **Уладзімір КАРАГІН, старшыня МССПіП, старшыня прэзідыума СЮА «Рэспубліканская канфедэрацыя прадпрымальніцтва»**. — У афіцыйным календары гэтай даты няма, і мы дамовіліся яшчэ 18 гадоў назад, што не будзем яго святкаваць, бо прадпрымальніцтва яшчэ не стала дамінантай у краіне, мы яшчэ не маем такіх дасягненняў, каб адпачываць і весяліцца. Пакуль мы толькі змагаемся за стварэнне агульных умоў развіцця прадпрымальніцтва, самых элементарных, самых прымітыўных, — лічыць Уладзімір Карагін. Аднак ён дадаў, што за апошнія 5 гадоў бізнэс-супольнасць аб'ядналася і з'явіўся дыялог паміж бізнэсам і ўладай, які рэалізуецца праз сумесныя працоўныя групы і камісіі.

Уладзімір Мікалаевіч расказаў пра тое, што шмат якія пытанні і пажаданні, узнятыя ў Нацыянальнай платформе бізнэсу Беларусі, знаходзяць сваё адлюстраванне ў праектах новых нарматыўных актаў, аднак адзначыў, што гэтага недастаткова:

— Мы нядаўна абмяркоўвалі, навошта рыхтуецца Дырэктыва № 4? Ды хаця б для таго, каб для кожнага звяна выканаўчай вертыкалі развіваць прадпрымальніцтва і крочыць за ветрам лібералізацыі стала не пажаданнем, а абавязкам, афармленым палітычнай воляй дзяржавы і яе кіраўніка. Ніхто не павінен адступаць ад такой лініі, вось у гэтым і ёсць сэнс з'яўлення Дырэктывы № 4, — перакананы Уладзімір Карагін.

Ён жа паведаміў, што вядучыя бізнэс-саюзы падрыхтавалі ліст да Прэзідэнта, дзе абгрунтавалі неабходнасць дазволіць індывідуальным прадпрымальнікам наймаць працаўнікоў незалежна ад сваяцкіх сувязяў і ўнесці адпаведныя змены ў 285-ты Указ «Аб некаторых мерах рэгулявання прадпрымальніцкай дзейнасці», прыняты ў 2005 годзе:

— Актуальнасць зменаў дыктуецца неабходнасцю прадухілення негатыўных наступстваў сусветнага эканамічнага крызісу, стварэння новых працоўных месцаў, забеспячэння канкурэнтаздольнасці і ўстойлівасці аднаго з відаў малога бізнэсу — індывідуальных прадпрымальнікаў, — перакананы Уладзімір Карагін. — Да таго ж, як высветлілася, прывязка да сямейнага бізнэсу вельмі негатыўна адбілася на сем'ях ІП: рызыкі прадпрымальніцкай дзейнасці ва ўмовах не вельмі дасканалага дзелавога клімату не лепшым чынам адбіліся на сямейным стане прадпрымальнікаў, стала шмат канфліктаў, разводаў. Прадпрымальнікі перасталі вучыцца, бо сем'і малыя, а працоўны дзень у шмат якіх прадпрымальнікаў у гандлёвых цэнтрах з 8 да 21, няма нават водпускаў. Шмат прадпрымальнікаў адмовіліся ад нараджэння дзяцей, а тыя, хто вырашыў нарадзіць — згубілі бізнэс. Згубілі бізнэс і тыя, хто пайшоў у войска, згубілі бізнэс прадпрымальнікі-інваліды, якія мелі наёмных працаўнікоў і кіравалі бізнэсам, — сказаў Уладзімір Карагін і нагадаў, што ў Нацыянальнай платформе бізнэсу Беларусі прапаноўваецца дазволіць ІП, якія працуюць па агульнай схеме падаткаабкладання, наймаць любую колькасць працаўнікоў, а для ІП, якія плацяць адзіны падатак, — да 3 працаўнікоў.

— Наконт электроннага дэкларавання: у Нацыянальнай платформе бізнэсу змешчаны прапановы для таго, каб спрасціць і палепшыць, але некаторыя з іх перакручваюцца, — скардзіцца **Таццяна КАЗЛОВА, старшыня грамадскага аб'яднання прадпрымальнікаў Магілёўскай вобласці**. — Для таго, каб падключыцца да электроннага дэкларавання, трэба набыць праграму за 300 тысяч. А калі не хочаш падключацца, то...

Прэтэнзіі магілёўскіх прадпрымальнікаў падзяляе і Уладзімір Карагін:

— Мы змагаліся за электроннае дэкларыванне, каб усё было проста — перадаў па электроннай пошце і не хадзіў нікуды, бо чым меней прадпрымальнік мае стасункі з чыноўнікамі, тым менш праблем. Вось увялі электроннае дэкларыванне ФСАН — і ніхто не скардзіцца, бо прадпрымальнік бясплатна перадае ў электронным выглядзе інфармацыю. Міністэрства працы і Фонд сацыяльнай абароны насельніцтва зрабілі нармальны інструмент, з якім людзі нармальна працуюць. А тут што нарабілі? Кожны павінен плаціць штогод каля 300 тысяч рублёў, а дзе-нідзе яшчэ і просяць пачак паперы прынесці, каб раздрукаваць тую справаздачу.

На прэс-канферэнцыі прысутнічаў **Аляксандр КАЗЛОЎ, намеснік начальніка аддзела па наглядзе за аператыўна-вышуковай дзейнасцю і расследаваннем спраў аб карупцыі Упраўлення Генеральнай пракуратуры па барацьбе з карупцыяй і арганізаваній злачыннасцю**, які заклікаў прадпрымальнікаў дапамагаць праваахоўным органам змагацца з карупцыйнымі праявамі ў краіне:

— Генеральная пракуратура вядзе актыўную барацьбу з карупцыйнымі праявамі ў розных формах. Усе вашыя ініцыятывы маюць права на існаванне, пытанні, якія вы ўздымаеце, абсалютна законныя, і хацелася б сказаць прадстаўнікам бізнэсу, што карупцыйныя метады вырашэння пытанняў з чыноўнікамі эфектыўныя толькі ў кароткатэрміновай перспектыве, а ў доўгатэрміновай — негатыўна адбіваюцца на развіцці эканомікі, — сказаў Аляксандр Казлоў. — Формы ўзаемадзеяння пры барацьбе з карупцыяй розныя, у тым ліку і своечасовае інфармаванне праваахоўных органаў і Генеральнай пракуратуры пра карупцыйныя праявы, і хацелася б, каб мы змагаліся не з наступствамі карупцыі, а прадухілялі страты. Напрыклад, у выніку карупцыйных злачынстваў па закончаных крымінальных справах за 2009 год страты склалі 53 мільярды беларускіх рублёў — гэта вялізная сума для беларускай эканомікі, прычым гэта сума толькі выяўленая, а памер рэальных стратаў ад карупцыі на парадак вышэйшы.

Пры гэтым ён прызнаў, што, на жаль, факты, калі прадпрымальнікі заяўляюць пра карупцыйныя праявы, не носяць масавага характару:

— Прадстаўнікі бізнэсу, як правіла, звяртаюцца ў праваахоўныя органы тады, калі яны не змаглі дамовіцца з канкрэтным чыноўнікам. А трэба, каб была больш актыўная форма: як толькі ўзнікаюць прыкметы вымагальніцтва, прыкметы карупцыйнай здзелкі — трэба нас інфармаваць, — перакананы Аляксандр Казлоў.

Разам з тым **Вадзім БАРАДУЛЯ, начальнік юрыдычнага аддзела МССПіП**, адзначыў, што прадпрымальнікі баяцца ўголас казаць пра карупцыю:

— Мне як юрысту прыходзіцца сутыкацца з тым, што людзі не хочуць або баяцца звяртацца ў праваахоўныя органы. Баяцца, што раптам нічога не дакажацца, баяцца, што справа будзе спушчана на тармазах, а пасля крайнім апынецца сам прадпрымальнік.

— Калі бізнэс будаваўся на доўгатэрміновых прынцыпах і з самага пачатку ўсё рабілася правільна, то падстаў баяцца праваахоўных органаў няма, — перакананы Аляксандр Казлоў. — Ну а калі прадпрымальнік адчувае за сабой агрэхі, калі не хоча, каб усплылі і іншыя пытанні, то ён і баіцца звяртацца ў органы. Таму я заклікаю будаваць бізнэс на доўгатэрміновай аснове...

Павел БЕРАСНЕЎ.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

по продаже земельных участков в частную собственность граждан и права аренды земельного участка в г. Докшицы и Докшицком районе

Организатор: РУП «Витебский институт недвижимости и оценки»

лот	Местоположение земельного участка, площадь, кадастровый №	Условия и ограничения, срок аренды. Инженерно-геологические условия*	Расходы на док-цию, руб.	Начальная цена, руб.
●	**в частную собственность для строительства и обслуживания жилого дома**			
1	д. Шанторовщина, д. 5 Порплищенского сельсовета Докшицкого района Витебской обл., пл. 0,2490 га, кадастровый № 222183807101000027	- водоохранная зона водного объекта вне прибрежных полос – 0,2490 га (озеро Сервечь); - охранная зона линии электропередачи, напряжение до 1000 В – 0,0018 га	769 075	2 000 000
2	д. Вешнее, ул. Сервеч, 28а Порплищенского сельсовета Докшицкого района Витебской обл., пл. 0,2439 га, кадастровый № 222183802101000022	- водоохранная зона водного объекта вне прибрежных полос – 0,2439 га (озеро Сервечь); - охранная зона линии электропередачи, напряжение до 1000 В – 0,0011 га	769 075	2 000 000
3	д. Вешнее, ул. Сервеч, 34 Порплищенского сельсовета Докшицкого района Витебской обл., пл. 0,2498 га, кадастровый № 222183802101000023	- водоохранная зона водного объекта вне прибрежных полос 0,2498 га (озеро Сервечь)	753 836	2 000 000
●	**на право заключения договора аренды земельного участка**			
4	для строительства торгового объекта в г. Докшицы, ул. Сельская Витебской области, пл. 0,0200 га, кадастровый № 222150100001001743	- срок аренды 15 лет	591 768	197 630
5	для строительства торгового объекта г.п. Бегомль, ул. Юхновца, 30, пл. 0,0127 га, кадастровый № 222155200001000912	- срок аренды 15 лет; - охранная зона линии электропередачи, напряжение до 1000 В – 0,0021 га	1 320 203	334 060
6	для строительства торгового объекта г.п. Бегомль, ул. Юхновца, 32, пл. 0,0128 га, кадастровый № 222155200001000907	- срок аренды 15 лет; - охранная зона линии электропередачи, напряжение до 1000 В – 0,0023 га	1 146 211	336 690
7	для строительства торгового объекта г.п. Бегомль, ул. Юхновца, 34, пл. 0,0129 га, кадастровый № 222155200001000908	- срок аренды 15 лет; - охранная зона линии электропередачи, напряжение до 1000 В – 0,0023 га	1 139 363	339 320
8	для строительства торгового объекта г.п. Бегомль, ул. Юхновца, 36, пл. 0,0125 га, кадастровый № 222155200001000909	- срок аренды 15 лет; - охранная зона линии электропередачи, напряжение до 1000 В – 0,0023 га	1 139 363	328 800
9	для строительства торгового объекта г.п. Бегомль, ул. Юхновца, 38, пл. 0,0122 га, кадастровый № 222155200001000910	- срок аренды 15 лет; - охранная зона линии электропередачи, напряжение до 1000 В – 0,0023 га	1 139 363	320 910
10	для строительства торгового объекта г.п. Бегомль, ул. Юхновца, 40, пл. 0,0118 га, кадастровый № 222155200001000911	- срок аренды 15 лет; - охранная зона линии электропередачи, напряжение до 1000 В – 0,0023 га	1 145 090	310 390

* инженерно-геологические условия будут определены на стадии производства проектно-изыскательских работ, здания на участках отсутствуют. Условия развития инфраструктуры: возможность подключения к инженерным сетям.

1. Аукцион состоится **23 июля 2010 г. в 11.00 по адресу: Витебская область, г. Докшицы, ул. Ленинская, 31.**

2. Аукцион проводится в соответствии с Положениями, утв. Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 года № 462. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Условия – наличие не менее двух участников. Заявления и пакет документов на участие принимаются по рабочим дням с 8.00 до 17.00 по адресу: Витебск, ул. Свидинского, 4. Последний день приёма заявлений и документов **19.07.2010 г. до 17.00.** Заключительная регистрация участников 23.07.2010 г. с 10.30 до 11.00 по месту проведения аукциона.

3. К участию допускаются по Лотам 1–3 – физ. лица (граждане Республики Беларусь), по Лоту 4–10 – физ. и юр. лица, подавшие документы в соответствии с п.4 настоящего извещения. Задаток за участие в аукционе составляет 10 % от начальной цены лота. Сумма задатка перечисляется на расчётный счёт № 3012215570013 в ГФ по Витебской области ОАО «Белинвестбанк», ул. Ленина, 22/16, код 701. Получатель – РУП « Витебский институт недвижимости и оценки», УНП 390343677. Порядок участия и проведения аукциона опубликован на сайте www.Ocenka.by.

4. Участнику необходимо в срок, указанный в извещении, подать заявление и подписать Соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона и предоставить следующие документы: гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования; индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность; представителем или уполномоченным должностным лицом юр. лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юр. лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию, документ с указанием банковских реквизитов юр. лица; представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юр. лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык; представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов предъявляется документ, удостоверяющий личность.

5. Условие: **по лотам 1–3:** внесение платы за зем. участок, возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, расходов по формированию землеустр. док-ции, осуществление в 2-мес. срок после принятия решения о передаче зем. уч-ка гос. регистрации права на зем. уч-к, получение технической док-ции и разрешения на строительство жилого дома, освоение зем. уч-ка не позднее 1 года после получения вс-ва о гос. регистрации; **по лотам 4–10:** внесение платы за право заключения договора аренды, возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, расходов по формированию землеустр. док-ции, заключение договора аренды в течение 2-х дней после внесения всех платежей, осуществление в 2-мес. срок после принятия решения гос. регистрации права на зем. уч-к, получение разрешения на проведение проектно-изыскательских работ, разработка проекта на строительство в срок, не превышающий 1 г., строительство объекта в сроки, определенные ПСД.

6. Ориентировочные затраты на организацию и проведение аукциона составляют 429 053 рубля по каждому лоту. Фактические затраты будут объявлены дополнительно перед проведением торгов.

Контактные телефоны: 8 (0212) 435 435; 435 495; 8 (029) 591 00 02; 8 (029) 384 24 05; эл. почта: vit.in@tut.by; тел. в г. Докшицы (8 2157) 2 16 73.

**ШАРКОВЩИНСКОЕ РАЙОННОЕ ПОТРЕБИТЕЛЬСК

МІЛЬЁНЫ Замор'е НЕ НА КАРЫСЦЬ

Падрыхтаваў Іван КУПАРВАС.

Амерыканскія латарэйныя трагедыі

Мабыць, кожны з нас хоць бы раз фантазіраваў пра выйгрыш у латарэю. Вялікі куш — мара любога. Уявіце сабе, як бы вы выдаткавалі мільён долараў, не кажучы ўжо пра 500 мільёнаў. Вы маглі б мець велізарную хату, прэстыжны аўтамабіль, клапаціцца пра людзей, якіх любіце, і бавіць час у лепшых установах. Але гісторыі дзесяці людзей з гэтага спісу пацвярджаюць той факт, што спадарыня ўдача не заўсёды такая добрая. Яны разбагацелі, але гэта не прынесла ім шчасця.

Уілі Херт, Мічыган, 3,1 млн долараў.

Да 1989 года Уілі Херт быў шчаслівым сем'янінам, добра вядомым у сваім коле. Але ўсё змянілася, калі ён выйграў 3,1 млн долараў у латарэю Мічыгана. За два гады ён развёўся з жонкай, страціў правы на дзяцей, выдаткаваў выйгрыш і быў абвінавачаны ў забойстве. Яго адвакат заявіў, што ўсе грошы пайшлі на развод і какаінавую залежнасць.

С'юзан Мулінс, Вірджынія, 4,2 млн долараў.

У 1993 годзе, падабраўшы ўсе шэсць лічбаў у латарэі Вірджыніі, С'юзан Мулінс выйграла 4,2 млн долараў. Лагодная жанчына, якая жыве з мужам і дачкой, планавала пагасіць 20 штогадовых плацяжоў па $47 800. Аднак праз пяць гадоў Мулінс назбірала груду рахункаў. Не маючы грошай, ёй прыйшлося звярнуцца ў банк. Праз адзінаццаць гадоў пасля выйгрышу яна ўжо была павінна каля 154 мільёнаў долараў. Прычынай доўгу яна бачыць працяглую хваробу незастрахаванага зяця, якому патрэбен быў 1 мільён на аплату медыцынскіх выдаткаў.

Эвялін Адамс, Нью-Джэрсі, 5,4 млн долараў.

Кожны ведае, што выйгрыш у латарэю практычна немагчымы. Але Эвялін Адамс выйграла двойчы. За 1985 і 1986 гады яна выйграла ў агульнай суме 5,4 млн долараў. Праз 20 гадоў Адамс спустошана і жыве ў трэйлеры — вынік росту выдаткаў і рызыкоўных гульняў. «Усе хацелі мае грошы. Усе стаялі з працягнутай рукой. Я так і не вывучыла простае слова — не. Калі б у мяне быў другі шанц, я была б разумнейшай», — распавяла неяк Адамс.

Алекс і Рода Тот, Фларыда, 13 млн долараў.

У 1990 годзе муж і жонка Алекс і Рода Тот з Фларыды выйгралі ў латарэю 13 млн долараў. Але да 2006 года яны ўжо жылі ў жудасных умовах. Алекс не дажыў да судовага працэсу пра ўхіленне ад падаткаў. Рода паспрабавала ашукаць федэралаў, заявіўшы, што занадта хворая, каб вытрымаць суд. На жаль, агенты заснялі, як яна рухаецца без мыліц ці інваліднай каляскі. Яе прысудзілі да 2 гадоў пазбаўлення волі і выплаце банку 1,1 млн долараў.

Уільям «Бад» Пост, Пенсільванія, 16,2 млн долараў.

Гісторыя Уільяма «Бад» Поста як сюжэт з галівудскага фільма. Яго маці памерла, калі яму было 8 гадоў, а бацька адправіў яго ў дзіцячы дом адразу пасля пахавання. Вялікую частку жыцця Пост быў рыбаком датуль, пакуль не купіў квіток пенсільванскай латарэі ў той лёсавызначальны дзень у 1988 годзе і выйграў 16,2 млн долараў. Аднак ужо праз некалькі месяцаў Пост быў спустошаны, выдаткаваўшы вялікую колькасць грошай на дом, машыны, яхты, сумнеўныя здзелкі і двухматорны самалёт (хоць у яго не было пасведчання пілота). Пост памёр ад спынення дыхання ў 2006 годзе, ужо не маючы нічога за душой. «Я быў значна шчаслівейшы без грошай», — прызнаўся ён аднойчы.

Жаніт Лі, Місуры, 18 млн долараў.

Часам нават самыя добрыя намеры могуць прывесці да жудасных наступстваў — як у выпадку з Жаніт Лі, якая выйграла 18 млн долараў у латарэю Місуры ў 1993 годзе. Эмігрантка з Паўднёвай Карэі пачала актыўна ўкладваць грошы ў розныя адукацыйныя праграмы, грамадскія і палітычныя арганізацыі. Яна нават абедала з Білам Клінтанам, Элам Горэ і прэзідэнтам Паўднёвай Карэі Кімам Дэ Чжунам. Але праз восем гадоў пасля выйгрышу грошы скончыліся і Лі, застаўшыся з 700 доларамі на рахунку, была вымушана прызнаць сябе банкрутам.

Джэфры Дампір, Ілінойс, 20 млн долараў.

Уявіце, вас дастаюць навяспечаныя сваякі. Вось выпадак Джэфры Дампіра, які выйграў 20 млн долараў у латарэі Ілінойса ў 1986 годзе. Атрымаўшы прыз, пераможца адразу стаў абсыпаць сваякоў і сяброў дарагімі падарункамі, уключаючы машыны, дамы і пуцёўкі ў экзатычныя месцы. На жаль, гэтага было недастаткова для сястры жонкі, Вікторыі Джэксан. У ноч на 26 ліпеня 2005 года Джэксан і яе сябар Натаніэль Джэксан (не сваяк) выкралі мільянера і застрэлілі яго. Яны былі прысуджаныя да пажыццёвага турэмнага зняволення.

Білі Боб Харэл, Тэхас, 31 млн долараў.

Быўшы рэлігійным чалавекам, Білі Боб Харэл ніколі не губляў веры ў бога. Перакананне было ўзнагароджана, калі ён выйграў у латарэю Тэхаса ў чэрвені 1997 года. Сямейны чалавек, выйграўшы 31 млн долараў, пачаў дапамагаць іншым. Ён раздаваў грошы сваякам, сябрам, частку ахвяраваў сваёй царкве — але грошы хутка скончыліся. Праз дванаццаць месяцаў пасля выйгрышу Харэл застрэліўся. Незадоўга да смерці ён прызнаўся свайму фінансаваму кансультанту, што «выйгрыш у латарэю быў самай жудаснай падзеяй у яго жыцці».

Ральф Стэбінс, Мічыган, 208 млн долараў.

Калі Ральф Стэбінс і яго жонка Мэры выйгралі 208 млн долараў у латарэю Мега Мільённы Джэкпот у 2005 годзе, як і любая разважлівая пара, яны планавалі: аплаціць рахункі, купіць ферму, укласці грошы ў кароў і жыць у камфорце да канца сваіх дзён. Аднак праз 20 месяцаў пасля выйгрышу Стэбінс быў абвінавачаны ў спробе забойства сябра дачкі і захоўванні зброі злачынства. Менш чым праз два месяцы Ральф памёр ад сардэчнага прыступу ва ўзросце 43 гадоў.

Джэк Уітэкер, Заходняя Вірджынія, 315 млн долараў.

Калі 25 снежня 2002 года Джэк Уітэкер выйграў у латарэю «Паўэрбол», ён быў перакананы, што тут не абышлося без чароўнага — гэта здарылася на Каляды. Але неўзабаве пасля атрымання 114 млн долараў Уітэкер быў арыштаваны за кіраванне ў нецвярозым выглядзе. Праз некалькі месяцаў зладзеі выкралі 545 тысяч долараў, якія 55-гадовы мужчына вазіў з сабой у партфелі. Праз год пасля выйгрышу Уітэкер быў арыштаваны за пагрозу менеджару бара. І ўрэшце яго 17-гадовая ўнучка Брэндзі Брэг была знойдзена мёртвай у доме Уітэкера, смерць наступіла ў выніку перадазіроўкі наркотыкаў. Дачка Уітэкера, Джынджар Уітэкер Брэг, таксама была знойдзена мёртвай у яе ўласным доме.

МАЛПА ПАЛІЦЭЙСКІМ — СЯБАР І ПАМОЧНІК

Апранутыя ў паліцэйскую форму макакі сталі ўсё часцей з'яўляцца сярод паліцэйскіх на блок-пастах у правінцыях на крайнім поўдні Тайланда, дзе яшчэ з 2004 года дзейнічае ваеннае становішча і блок-пасты працуюць на асноўных трасах увесь час. Пра гэта паведамляе часопіс South-East Asia Globe, які выдаецца ў сталіцы Камбоджы Пномпене.

Малпы, з якімі кіроўцы і пасажыры аўтамабіляў могуць пагуляць і сфатаграфавацца, пакуль ідзе праверка іх машыны, «надаюць блок-пастам больш людскае аблічча і здымаюць у грамадзян нервовую напругу пры працэсе праверкі», паведамляе выданне са спасылкай на паліцэйскае кіраўніцтва раёна Сайбуры ў правінцыі Патані.

Менавіта ў Сайбуры на блок-посце ўпершыню з'явілася малпа. Пяцігадовы самец макакі па мянушцы Санцісук (Мірнае Шчасце), якога некалькі месяцаў таму паліцэйскія знайшлі на ўзбочыне дарогі са зламанай рукой і вылечылі, «заступіў на пост» у красавіку гэтага года. Як высветлілася, прысутнасць малпы, якая забаўляе падарожных падчас праверкі і нават прыносіць ім какосы з бліжэйшай пальмы, сапраўды разраджае становішча. Санцісук стаў першым з некалькіх малпаў, «якія нясуць службу» цяпер на блок-пастах крайняга поўдня. Дакладная іх колькасць невядомая, бо выкарыстанне прыматаў на блок-пастах — гэта не дзяржаўная праграма і, адпаведна, дакладнай статыстыкі няма. Малпаў «бяруць на службу» па ініцыятыве мясцовых паліцэйскіх уладаў.

ГРУДЗЯМІ ЗА ЭКАЛОГІЮ!

У мінулыя выхадныя ў Мехіка сотні веласіпедыстаў наладзілі акцыю пратэсту — голы заезд па цэнтральнай частцы мексіканскай сталіцы. Гэта адзін з мноства «голых заездаў», якія штогод праходзяць па ўсім свеце.

Заезд прайшоў у знак пратэсту супраць забруджвання нафтапрадуктамі кампаніі BP Мексіканскага заліва. Удзельнікі акцыі таксама заклікалі аўтамабілістаў выратаваць планету, і для гэтага перасесці на больш экалагічны тып транспарту. Улады не перашкаджалі. Больш за тое — удзельнікаў голага заезду суправаджаў паліцэйскі эскорт. Задачай удзельнікаў было паказаць, што ў свеце існуюць значна больш пачварныя рэчы, чым аголеныя азадкі. Першы Міжнародны голы веламарафон (WNBR) адбыўся ў 2004 годзе, аднак практыка правядзення заездаў у аголеным выглядзе існавала і раней — у Канадзе і Іспаніі. NBR не патрабуе, каб удзельнікі распраналіся цалкам, многія едуць аголенымі па пояс. Акрамя таго, для руху падчас заезду можна выкарыстоўваць не толькі веласіпеды, але і скейты, а таксама ролікавыя канькі. Сёлета марафон адбыўся ў Таронта, Ванкуверы, Атаве, Мехіка, Мадрыдзе, Парыжы і Лондане.

Калейдаскоп

Падрыхтаваў Іван КУПАРВАС

ТЭРМІНАТАР У ДЗЯЦІНСТВЕ?

15 чэрвеня навукоўцы з Такійскага ўніверсітэта прадэманстравалі сваю апошнюю распрацоўку — робата Нобі.

Імя робата, распрацаванага спецыялістамі з універсітэтаў Токіа і Асакі, — скарачэнне ад фразы на японскай мове, якая азначае «дзевяцімесячнае дзіця». Рост Нобі 71 см, вага — 7,9 кг, фізічна развіты ён прыблізна як сяроднестатыстычнае 9-месячнае дзіця. Мяккая скура робата, зробленая з поліўрэтану, утрымоўвае 600 сэнсараў, якія даюць яму магчымасць мець тактыльныя адчуванні ў прыдачу да зроку і слыху. На прэзентацыі робат паводзіў сябе як звычайнае немаўля — працягваў рукі да лялькі, спрабуючы дакрануцца да яе, пачынаў рухаць рукамі і нагамі, калі яму надакучала спакойна сядзець. Робат-немаўля дае магчымасць назіраць за тым, як у 9-месячнага немаўляці імкліва развіваюцца ўменне рухацца і пазнаваць навакольны свет, а таксама да чаго ён праяўляе цікавасць. Кіраўнік даследчай групы, прафесар Мінору Асада з Осакскага ўніверсітэта спадзяецца, што робат «дапаможа лепш вывучыць механізмы развіцця чалавека і засваенне ім новых ведаў».

СЁННЯ

Месяц

Першая квадра ў 7.30. Месяц у сузор'і Шаляў.

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	4.37	21.45	17.08
Віцебск —	4.18	21.43	17.25
Магілёў —	4.27	21.35	17.08
Гомель —	4.34	21.22	16.48
Гродна —	4.54	21.58	17.04
Брэст —	5.04	21.49	16.45

Імяніны

Пр. *Іларыёна, Іоны.*

К. *Сільвіі, Юльяны, Гервазія, Марцэля, Паратасія, Рамуальда.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

НАДВОР'Е на заўтра

Тэлесеткі

ПЕРШЫ КАНАЛ ЗАПРАШАЕ... ЗДАЦЬ НА ПРАВЫ

21 чэрвеня Белтэлерадыёкампанія сумесна з ДАІ Мінска запускае новы праект — «Аўташкола». Цягам месяца ў эфіры Першага канала 6 чалавек будуць спаборнічаць за права бясплатнага навучання ў адной са сталічных аўташкол.

Паспрабаваць свае сілы ў праекце можа кожны ахвотны — пры ўмове поўнагадовага ўзросту і адсутнасці вадзіцельскага пасведчання. Кастынг прэтэндэнтаў на вучобу ў «Аўташколе», расказалі ў тэлекампаніі, адбудзецца 21 чэрвеня а 15-й гадзіне на пляцоўцы ля Нацыянальнай бібліятэкі.

Тыя, каму пашанцуе трапіць у лік удзельнікаў тэлепраекта, цягам месяца пройдуць экспрэскурс кіравання аўтамабілем, у тым ліку ў экстрэмальных умовах. Дапамагаць у гэтым будуць лепшыя інструктары DAI, а каментаваць падзеі стане аўтар праекта, вядучы праграмы «У свеце матораў» Юрый Таболін.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

ЭВАЛЮЦЫЯ КУПАЛЬНІКАЎ: ад максі да «фігавых лісткоў»

Архівы моды

Гісторыя замоўчвае, якія купальныя касцюмы насілі нашы дагістарычныя продкі і ці насілі наогул, але тое, што «прататыпам» першага бікіні стаў фігавы ліст — сумненняў не выклікае

Купальнік як самастойны элемент гардэроба з'явіўся толькі ў пачатку XX стагоддзя. А стваральніцай першага купальнага касцюма можна лічыць аўстралійку Анэт Келерман, якая ў 1907 годзе пашыла сцэнічны касцюм на аснове мужчынскага трыко. Ён прызначаўся для воднага

вадэвіля «Венера, якая нырае», які, дарэчы, стаў правобразам сучаснага сінхроннага плавання. Касцюм Келерман усхваляваў грамадскасць, а яго ўладальніца была прызнаная... парушальніцай грамадскай маралі. І нядзіўна, што захаванне правілаў паводзін на пляжы было адзіным для ўсіх, а правілы загадвалі дамам закрываць не толькі тулава, але і ўсе астатнія часткі цела, уключаючы рукі, ногі і шыю. Прагрэсіўная плыўчыха усё ж знайшла выйсце са становішча, прышыўшы да купальніка рукавы, панчохі і каўнер.

1934 год. Публіка ўпершыню ўбачыла раздзельныя купальнікі, якія агалялі жывот дзяўчыны і пупок. Галівудскія актрысы першымі пачалі здымацца ў такіх купальніках.

1951 год. Мадэль Мішэлін Бернардыні здымаецца ў першым бікіні-купальніку. Гэтыя фотаздымкі выклікаюць шок у грамадскасці.

На першым конкурсе «Міс Свету» мадэль з Швецыі Кікі Хакансан выходзіць у бікіні. Такія краіны як Іспанія і Ірландыя заяўляюць свой пратэст і пагражаюць адмовіцца ад удзелу ў конкурсе. А праз нейкія 20 гадоў выхад у бікіні становіцца абавязковым на гэтым конкурсе.



Гэтыя купальнікі выклікалі ў свой час буру эмоцый

У пачатку 60-х гадоў мінулага стагоддзя жанчыны ўжо на ўсю моц фарсілі ў элегантных купальных шорціках і станіках, але дэманстраваць пляжную моду ім даводзілася ля ўласных басейнаў. Еўропа яшчэ не была гатовая да сапраўды рэвалюцыйнай вынаходкі амерыканца французскага паходжання Луі Рэара пад назвай «бікіні».

Пытанне на карысць максімальнай «агалёнкі» на пляжы было вырашана толькі тады, калі ў 1964 годзе часопіс Sports Illustrated размясціў на сваёй вокладцы мадэль Бабет Марч у беласнежным бікіні.

Потым была Ракель Уэлч у «Мільёне гадоў да нашай эры».

І Урсула Андэрс у «Доктары Але».

Тады ж ў 1964 годзе дызайнер Рудзі Гейнрых стварае монакіні. Так называецца купальнік, які складаецца толькі з адной ніжняй часткі. Першае монакіні Гейнрыха нагадвала суцэльны купальнік, абрэзаны пад грудзьмі, пакідаючы іх аголенымі, і меў дзве тонкія шлеі.

Ідэя, у адрозненне ад назвы, не прыжылася: жанчыны, якія хацелі загарацъ топлес, рабілі гэта, надзеўшы ніжнюю частку бікіні, а вытворцы сталі прадаваць часткі купальнікаў па-асобку. Але монакіні стаў знакам сэксуальнай рэвалюцыі, падкрэсліўшы права жанчыны апранацца правакацыйна і агаляць больш скуры.

Рудзі Гейнрых, якога часам завуць самым правакацыйным дызайнерам 1950—1970 гадоў у ЗША, на гэтым не спыніўся, ён прапанаваў ідэю пубікіні (pubikini), які таксама складаецца толькі з ніжняй часткі, але як: тканіна ахоплівае сцёгны і ягадзіцы, а геніталіі пакідае адкрытымі.

Можна лічыць, што пляжная мода знайшла сваю залатую сярэдзіну — шырокае распаўсюджанне класічнага бікіні стала меншай са шкодаў.

Наступнае развіццё пляжнай моды стала не такім захапляльным. Змяняліся толькі формы трусікаў і станікаў. Прычым змяняліся не толькі ў бок паляпшэння формы купальнікаў, але і ў бок памяншэння іх памераў.

Ужо ў 1970-х на арэну «выйшлі» трусікі-стрынгі і так званыя dental-floss, што ў перакладзе з англійскай азначае «зубная нітка», з малюсенькім трыкутнікам спераду і тоненькім матузом ззаду.

Часам верх купальніка замянялі проста на накладкі.

Здавалася б, усе былі абсалютна задаволеныя. Але... у 2009 годзе адбыўся новы скандал. З'явіліся першыя фатаграфіі дзяўчат у купальніках з мусульманскіх краін...І сітуацыя зноў напалілася да мяжы... Ці тое яшчэ будзе...



19 чэрвеня

Дзве даты

1918 год — апублікаваны артыкул англійскага лорда Грэя «Ліга нацый» з заклікам стварыць міжнародную арганізацыю для абмеркавання найбольш вострых пытанняў міжнароднга жыцця і недапушчэння ўзброеных канфліктаў паміж дзяржавамі.

1862 год — на ўсёй тэрыторыі Злучаных Штатаў забаронена рабаўладальніцтва. Гэта прывядзе да расколу краіны на два лагеры, і ў хуткім часе пачнецца грамадзянская вайна.

Цытата дня:

«Будзьце строгімі да сябе і мяккімі да іншых. Так вы абароніце сябе ад людской непрыязні».

Канфуцый (551 да н.э.—479 да н.э.), старажытнакітайскі мысліцель.

МАГІЯ ПАЧАТКУ

У духоўнай спадчыне беларусаў, як і ў культуры ўсіх славянскіх народаў, прыкметнае месца належыць яшчэ адной незвычайнай пары «апазіцыянераў». На адным полюсе супрацьстаяння знаходзіцца фігурант, прамаркіраваны знакам «першы» (тое, што распачынае адкрывае, дазваляе, забараняе, рэгламентуе, раіць, прадказвае), на другім, супрацьлеглым — замацавалася міфалагема, імя якой «апошні» (пры гэтым полюс не аднародны: ён можа быць прадстаўлены як цотным, так і няцотным лікам).

● Міфалагема «першы» ўвасабляла сабой прынцыповае размежаванне паміж прыроднай гармоніяй і гармоніяй Свету існавання чалавека, паміж адпаведнымі гарызонтамі часу (мінулае — цяперашняе — будучае), фіксавала рубеж паміж прасторай Дабрыні і Зла, размяжоўвала Свет жывых і Свет памерлых. Гэта адзін з самых моцных сімвалаў у традыцыйнай духоўнай культуры беларускага народа. Чырвонай ніткай ён праходзіць як праз сістэму каляндарных абрадаў, так і праз рытуальна-абрадавыя комплексы ўласна сацыяльнай накіраванасці.

● Надзвычай высокі сімвалічны статус міфалагемы «першы» прадвызначаўся класічным прынцыпам народнай светапоглядная канцэпцыі: «як пачнеш, так яно і будзе». Як пачнеш год, такім ён і будзе; як пашанцуе раніцай, дык пашчасціць і вечарам»; нарадзіцца ў добрую часіну; ведай, калі сяўбу распачаць, ведай, у які дзень бульбу або цыбулю выбіраць, каб добра захоўвалася на працягу ўсёй зімы.

● У сістэме народных прыкмет і павер'яў, забаронаў і прадпісанняў існуе цесная ўзаемасувязь паміж цыклам земляробчых, сельскагаспадарчых святаў і святаў жыццёвага кола чалавека. Тлумачыцца гэта аднолькавым стаўленнем нашых далёкіх продкаў да *жанчыны-маці*, якой Богам наканавана працягваць жыццё, і да *маці сырой-зямлі*, якая падтрымлівае, сілкуе жыццё чалавечага роду. У выніку атрымалася так, што пэўныя рытуальныя дзеянні чалавека маглі паўплываць на ўрадлівасць зямлі і, наадварот, лічылася, што свяшчэннае стаўленне да зямлі здольна было ўплываць на шчасліві зямны шлях чалавека. Напрыклад, гушканні моладзі перадшлюбнага ўзросту на арэлях, лічылася, уплывалі на хуткі рост ільну-даўгунца. І наадварот, калі першы раз заворваеш зямлю і ў першай баразне знойдзеш каменьчык, то яго трэба падкінуць у фартух дзяўчыне — будзе мець на гэты год дзіця.

● Асабліва шырока магія пачатку, або сімволіка «першы», была прадстаўлена ў каляндарнай абраднасці, перш за ўсё ў святах, якія *распачыналі* той ці іншы перыяд года або цыкл земляробчых прац. Безумоўна, важнай вяхой у структуры календара былі Каляды. Яны распачыналі новы год, таму паводзіны членаў кожнай сям'і паасобку і ўсёй вёскі ў цэлым мадэлявалі іх жыццё на ўвесь надыходны год.

● З Калядамі звязаны рытуал, які меў на мэце ўплыў на стан здароўя чалавека. У «першы» дзень Калядаў, калі ў хату прыносілі свежую ваду, гаспадар браў дробную сярэбраную манету і кідаў у вядро. Затым пачынаў маліцца сам, а за ім астатнія члены сям'і. Людзі меркавалі, што твар пасля гэтага не будзе псавацца на працягу года ні ад вялікай спякоты, ні ад траскучых маразоў.

● Лічылася, калі на Каляды «першы» чыхне мужчына, то будуць радзіцца бычкі і баранчыкі, а як жанчына, то цёлачкі і авечкі. Каб куры не несліся на чужых дварах, асцерагаліся выкідваць смецце з хаты на Новы год, у «першы» *дзень* Вялікадня і ў другі дзень Калядаў. Каб на працягу года сям'я жыла заможна, нічога і нікому не пазычалі на «першы» дзень Вялікадня і Раства Хрыстова.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Усходні гараскоп на наступны тыдзень

Цяльцам трэба пастарацца захоўваць душэўную раўнавагу, а Блізнятам не варта баяцца прымаць важныя рашэнні

ВАЕВЕН. Вашы ідэі і распачынанні, хутчэй за ўсё, будуць ацэненыя па вартасці. Магчымыя парушэнні звыклага ўкладу жыцця, ды і любыя змены пойдуць вам толькі на карысць. Пачынаючы з аўторка чакаецца напружаная разумовая праца. Паспрабуйце ўсё ж не забывацца пра тое, якое ўражанне вы выклікаеце ў навакольных. Будзьце гатовыя да таго, што ў суботу давядзецца ў апошні момант змяніць планы. Паспрабуйце не губляць сувязі з сябрамі, бо хуткім часам менавіта яны змогуць дапамагчы ў рашэнні бягучых праблем.

ЦЯЛЕЦ. Упэўненасць ва ўласных сілах і аптымізм дапамогуць заваяваць прыхільнасць навакольных і ўмацаваць добрыя адносіны з начальствам. Самымі спрыяльнымі днямі тыдня абяцаюць быць серада і пятніца. На працы наступіла добрая творчая паласа, можна смела разлічваць на добразычлівасць і разуменне. Калі паўстане неабходнасць, можна спадзявацца на падтрымку з боку паплечнікаў па працы або сяброў. Вы можаце істотна абнавіць свае веды, тым самым падняўшыся на новую інтэлектуальную вышыню. У чацвер, па магчымасці, адкладзіце паездкі і вандраванні. Не варта да іх легкадумна ставіцца, верагодныя неспадзяваныя сітуацыі. Захоўвайце душэўную раўнавагу. Напрыканцы тыдня, пасля бесперапыннай мітусні, вас будуць чакаць вельмі прыемныя падзеі, пра якія вы так доўга марылі. У пятніцу скандэнтруйцеся на новых творчых планах, а пачынаючы з суботы, прымайцеся за іх ажыццяўленне. Новыя ўражанні ў выхадныя дні абавязкова дадуць натхненне для новых задум.

БЛІЗНЯТЫ. Могуць абвастрыцца пытанні кар'еры і ўлады, але калектыў вас падтрымае, і становішча на працы відавочна палепшыцца. Не бойцеся прымаць важныя рашэнні не толькі за сябе, але і за іншых. Вы адчуеце, што неабходныя начальству і супрацоўнікам па працы. Аднак ёсць небяспека ілюзій і зорнай хваробы. Так што не паддавайцеся на ліслівасць, не дазваляйце сабе паддацца на дыфірамбы навакольных. Вашы дасягненні патрабуюць пацвярджэння практыкай, і гэтая магчымасць давесці і абараніць свае пазіцыі ў вас з'явіцца. Час задумацца над адпачынкам. Сваякі будуць здольныя не толькі насаліць, але і напэрчыць.

РАК. Паспрабуйце хоць бы на гэтым тыдні не нагружаць сябе лішнімі і чужымі справамі. У панядзелак нечаканыя праблемы могуць збянтэжыць, змарыць і практычна давесці да стрэсу. Не апускайце рукі — усё атрымаецца, але запатрабуецца на парадак больш намаганняў. Асабліва актуальна будзе перспектыўнае планаванне. У серады варта кінуць сілы на рашэнне старых праблем. Каб не губляць упэўненасці ў сваіх сілах, больш размаўляйце з блізкімі людзьмі. У выхадныя дні імкніцеся ва ўсім захоўваць меру, інакш жаданне як след адпачыць пасля цяжкага тыдня можа нашкодзіць.

ЛЕЎ. У тыдзень увойдзеце з выдатным настроем і самаадчуваннем. Таму асноўная задача будзе складацца ў захаванні гэтага стану. Каб адчуваць задавальненне ад стасункаў з людзьмі, трэба заўважыць і ацаніць тое, што яны робяць для вас ад чыстага сэрца. У пятніцу захоўвайце спакой у любой сітуацыі — гэта дазволіць пазбегнуць вельмі непрыемных канфліктаў. У другой палове дня ў суботу могуць актывізавацца творчыя працэсы. У вольны ад працы час займіцеся рашэннем сямейных праблем. Вельмі важна, нарэшце, высветліць адносіны з блізкімі і, па магчымасці, усталяваць мір.

ДЗЕВА. Пажадана заняцца рашэннем бягучых праблем. Не дазваляйце безгрунтоўным сумневам турбаваць вас. Зараз цалкам па сілах стварыць вакол сябе гарманічнае становішча і падарыць навакольным людзям цеплыню і радасць. У панядзелак можа спатрэбіцца парада кампетэнтнага чалавека. У чацвер паспрабуйце не зацягваць з афармленнем дакументаў. Пятніца — удалы дзень для дзелавых сустрэч і вядзення няпростых перамоў.

ШАЛІ. Праца бегае за вамі з вялікім падхватнікам, і калі вы своечасова не ўверціцеся, то давядзецца працаваць не толькі за сябе, але і за таго хлопца. У панядзелак верагодныя замешкі, затрымкі ў справах, з-за якіх можаце стаміцца і разнервавацца, таму заклічце на дапамогу навакольных. У аўторак і сераду лепш нічога не адкладаць на наступны дзень — зрабіце ўсё тут і цяпер. У другой палове тыдня можаце разгарнуць дзелавую актыўнасць дома і справіцеся з назапашанымі праблемамі адным махам. Чым з большым захапленнем вы будзеце хваліць блізкіх людзей, тым шчаслівейшыя будзеце.

СКАРПІЁН. Будуць шанцы дамагчыся поспеху, калі ў ліку першых даведаецеся важныя навіны. Шматлікія справы і праекты запатрабуюць дадатковых выдаткаў і намаганняў. Не бойцеся развітвацца з непатрэбнымі рэчамі і старымі прынцыпамі, калі, вядома, у вас будзе ўдалая магчымасць абзавесціся новымі. Жартаваць на гэтым тыдні не варта, бо жарты ў вашым выкананні ацэненыя не будуць. У панядзелак удалыя дзелавыя перамовы. У сераду варта прыслухацца да гутарак калегаў. У чацвер дапамога сяброў будзе вельмі дарэчы. Адпачываць лепш у нешматлюдных месцах.

СТРАЛЕЦ. Тыдзень падзеліцца на дзве практычна супрацьлеглыя часткі: яго пачатак добра падыдзе для завяршэння спраў, канец жа прынясе поспех у новых пачынаннях. Панядзелак можа апынуцца адным з самых удалых дзён тыдня. У сераду дзелавыя сустрэчы не дадуць жаданых вынікаў, так што лепш перанесці іх на іншы дзень. У другой палове тыдня ўзрасце творчы патэнцыял, які пажадана накіраваць у любое рэчышча, толькі не на дзелавыя адносіны. Чацвер лепш прысвяціць пабудове планаў на найбліжэйшую будучыню.

КАЗЯРОГ. Прыродная кемлівасць дазволіць вам справіцца са шматлікімі важнымі задачамі. Цяпер пажадана не перанапружвацца, а даць магчымасць падзеям ісці сваім парадкам. У панядзелак не варта пачынаць новых спраў і плануваць сур'ёзныя сустрэчы. На гэтым тыдні рэальна ўвасобіць у жыццё самыя смелыя планы — не выпусціце гэты залаты час. Другая палова тыдня будзе больш прадуктыўнай, чым першая. У пятніцу зможаце расправіцца з набалелай праблемай, якая перашкаджала вашаму прасоўванню наперад. У суботу, магчыма, вашы ідэі не вельмі спадабаюцца блізкім людзям.

ВАДАЛЕЙ. Чым спакайней будзеце глядзець на бягучую сітуацыю, тым большага поспеху зможаце дасягнуць. У панядзелак паспрабуйце на поўную моц выкарыстаць наяўныя ў вас дзелавыя кантакты, а таксама дапамогу сяброў. У сярэдзіне тыдня магчыма вельмі канструктыўная гутарка з начальствам, якая можа стаць асновай для вашага кар'ернага росту. У чацвер будзьце асцярожнымі, у гэты дзень пажадана не пачынаць новых спраў, ды і наогул рашэнне любых сур'ёзных пытанняў лепш будзе перанесці. Увесь тыдзень імкніцеся казаць выключна праўду, пазбягаючы нават выпадковага скажэння інфармацыі.

РЫБЫ. Вы павінны расставіць акцэнты. Лепш знізіць тэмп працы, каб пазбегнуць ператамлення. У сераду не злоўжывайце сваім уплывам — і перад вамі адкрыюцца новыя магчымасці. Паспрабуйце зразумець апанентаў, прыслухайцеся да іх меркавання, магчыма, гэта зменіць успрыманне сітуацыі, якая склалася. Не забудзьцеся зазірнуць у выхадныя ў крамы для таго, каб набыць не толькі неабходнае, але і пацешыць сябе. У суботу звярніцеся па дапамогу да сяброў — яны зразумеюць вас і падтрымаюць.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «